ЛіМ

ГАЗЕТА
ТВОРЧАЙ ІНТЭЛІГЕНЦЫІ
БЕЛАРУСІ

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

7 ЛІПЕНЯ 1995 г. № 27 (3799) Кошт 2 000 руб.

"ЗАМЯНІЦЕ МНЕ НАСТАЎНІКА", АБО ГІСТОРЫЯ АДНОЙ КАР'ЕРЫ

Міхась ЗАМСКІ: "Ну, а што Алег Мустафавіч Паўтаржыцкі? Ён дамогся, што пракуратура апратэставала пастанову суда аб яго арышце. Так што ходзіць на працу. Але ў школе ці то з ім ніхто з настаўнікаў вітацца не хоча (так кажа Паўтаржыцкі), ці то ён ні з кім не вітаецца (так кажа Ракевіч)".

5, 12

ВЯНОК ЗАДЫЯКУ

Новыя вершы Людмілы ПАЎЛІКАВАЙ.

8

ДЗВЕ НАВЕЛЫ

Уладзіміра СЦЯПАНА.

9—10—11

ПАГОНЯ — БОГ, РАДЗІМА, НАРОД!

Вітаўт ЧАРОПКА: "Каб зразумець шмат якія таямніцы нашай гісторыі, варта ведаць семантычна-сакральнае значэнне слова і сімвала. У старажытных людзей слова перш за ўсё выконвала функцыю медытацыйнай сувязі паміж чалавекам і багамі..."

13—14—15

"НАРОДНЫ ХАРАКТАР ЗАСТАЎСЯ НЯСКРАТНЫМ..."

Гутарка карэспандэнта "ЛіМа" з рэдактарам егіпецкай газеты "Ахбар аль Эдэб" ("Літаратурныя навіны") Гамалем Аль Гітані.

16

АХ, КАРМЭН!..

З беларускай опернай сцэны гэты твор, здаецца, не сыходзіў ніколі. Мяняліся рэжысёры, мяняліся сцэнічныя версіі славутай "Кармэн" — любоў выканаўцаў і публікі да неўміручага сюжэта, да хрэстаматыйна вядомых мелодый заставалася нязменнай. "Кармэн" Ж. Бізэ, першы спектакль, якім 62 гады таму адкрыўся ў Мінску тэатр оперы і балета, з Ларысай Александроўскай у галоўнай ролі, — гэта ўжо легенда. "Кармэн", апошняя прэм'ера бягучага опернага сезона, — мабыць, таксама некалі станецца легендай. Таму што ўпершыню загучала яна ў нашым тэатры на мове арыгінала, таму што самы першы паказ абноўленай "Кармэн" адбыўся пад кіраўніцтвам нямецкага дырыжора В. Кайтэля і з удзелам іншаземных салістаў: аргенцінцаў Н. Паласіяс (Кармэн), Э. Гуэдаса (Эскамільё), амерыканца С. Флаэрці (Хазэ) ды бразільянкі Л. дэ Соўза (Мікаэла). Таму што зала ці не стагнала ад націску публікі і многім давялося глядзець спектакль, стоячы на галёрцы...

Такім чынам, новая "Кармэн": музычны кіраўнік і дырыжор — Мікалай Калядка, рэжысёр-пастаноўшчык — Вячаслаў Цюпа, мастак — Людміла Ганчарова. У галоўных партыях — Наталля Руднева, Эдуард Пелагейчанка, Аркадзь Саўчанка, Наталля Кастэнка ды іншыя вядучыя салісты тэатра. Дзякуючы "аскетычнай" сцэнаграфіі спектакль набыў кампактнае аблічча, і гэта невыпадкова: пасля прэм'ерных паказаў у Мінску "Кармэн" выправілася ў дарогу — беларуская трупа падрыхтавала сваю новую работу да трохдзённых гастроляў у Германіі.

І вось — апошняя навіна: наша "Кармэн" мела гарачы прыём у нямецкіх гледачоў. Акрыленыя поспехам удзельнікі вярнуліся ў Мінск, сезон тэатра оперы і балета прадаўжаецца.

Н. К.

На здымках: сцэны са спектакля.
Фота Віт.АМІНАВА

ЛІТ КОЛА ДЗЁН

Сёння — Купалле, самае прыгожае народнае свята. Свята летняга сонцастаяння і росквіту ўсіх прыродных сіл. Свята, якое хоць і "прыручана" царквою, як і іншыя народныя святы, але ўсё ж збераглося ва ўсёй сваёй язычніцкай красе, чысціні і моцы, яно і сёння жывое і дзейнае. І ў нашы дні людзі, найперш моладзь, праводзяць на берагах рэк і азёр усю кароткую купальскую ноч, да самага ўзыходу сонца паляць купальскія кастры, водзяць карагоды, ладзяць гульбішчы і — шукаюць шчасце, чароўную Папараць-кветку, што надзяляе чалавека разуменнем мовы дрэў, звяроў і птушак, адкрывае яму зямныя скарбы.

Не адну сотню гадоў беларускі народ шукаў сваю Папараць-кветку і не знаходзіў яе. Надараліся часіны, калі яна быццам адкрывалася людзям, але — не надоўга. Не даецца яна ў рукі нам і сёння. Ды мы, здаецца, ужо і не шукаем яе, знябыўшыся. А між тым, на наступным тыдні спаўняецца год прэзідэнцтва спадара Лукашэнкі...

СВЯТА ТЫДНЯ

3 ліпеня мы адзначылі 51-ую гадавіну вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У Мінску, на плошчы Перамогі, былі ўрачыста ўскладзены вянкі да помніка-абеліска воінам, партызанам і падпольшчыкам ад прэзідэнта Беларусі, урада рэспублікі, Міністэрства абароны, прадстаўнікоў дзяржаўных і грамадскіх арганізацый, духавенства. Да прысутных на плошчы звярнуўся прэзідэнт А.Лукашэнка. Ён сказаў добрае слова пра тых, хто вызваляў нашы вёскі і гарады, а пасля ўздымаў іх з руін, падкрэсліў неабходнасць пастаянных клопатаў аб ветэранах. І па звычцы паабяцаў, што і пасля адмены ільгот тыя людзі, "которые в боях и труде заслужили право на достойную старость, будут получать после реализации указа больше средств, чем получают сейчас". Толькі, здаецца, ужо і старыя людзі не надта вераць у гэта...

ПАДТРЫМКА ТЫДНЯ

Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі падтрымае акцыі пратэсту працоўных з прычыны нявыплаты заробку. Пра гэта заявіў кіраўнік ФПБ У.Ганчарык. Паколькі факты нявыплаты заробку прынялі масавы характар, прэзідыум федэрацыі прыняў рашэнне аказваць падтрымку рабочым ва ўсіх лакальных канфліктах з адміністрацыяй прадпрыемстваў. Урад згадзіўся з прапановай прафсаюзаў правесці перамовы аб ліквідацыі запазычанасці па зарплаце і павелічэнні аплаты працы. Згода — рэч, вядома, добрая. Толькі — дзе ўзяць сродкі для падмацавання гэтай згоды?

ЭКСПЕДЫЦЫЯ ТЫДНЯ

Па рэках Беларусі праходзіць у гэтыя дні адзін з этапаў міжнароднай экспедыцыі "Трансеўропа — Нява — Вікінг", наладжаная пад эгідай ЮНЕСКА. На судне, пабудаваным па ўзоры старажытнарускай ладдзі X—XI стст., удзельнікі экспедыцыі (а сярод іх — і прадстаўнік нашай краіны) пройдуць шляхам "з вараг у грэкі" больш чым 3 тысячы кіламетраў. Удалага плавання "вікінгам"!

ЦЫТАТА ТЫДНЯ

"Стабільнасць курса ёсць, а стабільнасці ў эканоміцы няма. Вось што не падабаецца. Міжволі пачынаеш думаць, што і стабільнасць таго ж курса — уяўная. Звернем увагу: гаворым "крызіс", але дзе грунтоўны аналіз гэтага крызісу, аналіз яго сапраўдных вытокаў? "Сувязі парушаны" — і ўсё на гэтым?

А значыць, калі браць і той жа курс, — цяжка аб'ектыўна ацаніць сапраўды рэальныя адносіны паміж попытам і прапанаваннем, у нас эканамічная сітуацыя ўвогуле не паддаецца прагназаванню... Тым не менш, відавочна адно, гэтага проста нельга не заўважаць: вынайдзеная стабільнасць вельмі моцна б'е па нашых прадпрыемствах. У нас яны завязаны пераважна на Расію, у нас долар стаіць, нават крыху страціў у сваім значэнні, там — паступова рос амаль пяць месяцаў. У выніку нашы прадпрыемствы, аддаючы туды сваю прадукцыю, атрымліваюць тую ж колькасць расійскіх рублёў, але менш, чым раней, долараў і ўжо значна менш — беларускіх рублёў..."

(З інтэрв'ю віцэ-прэзідэнта Мінскага транзітнага банка В.Малахоўскага, "Звязда", 6 ліпеня г.г.)

РАЦЫЁН ТЫДНЯ

Сёння сярэднедушавое спажыванне хлеба па краіне складае 265 грамаў на чалавека ў суткі. Многа гэта ці мала? Блізка да нормы, так бы мовіць. Пры пагаршэнні якасці харчавання норма гэтая павялічваецца, пры паляпшэнні — памяншаецца. Справа ў іншым. Наша хлебапякарная галіна ледзь спраўляецца з выпускам і гэтай колькасці хлебабулачных вырабаў: не хапае пшанічнай мукі, няма сродкаў для абнаўлення тэхналагічнага абсталявання. Адным словам, і з хлебам могуць быць праблемы...

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ ТЫДНЯ

У Акадэміі навук прайшла прэзентацыя першай нацыянальнай справаздачы аб чалавечым развіцці Рэспублікі Беларусь. Кніга-справаздача і назву мае такую: "Беларусь: тварам да чалавека". Падрыхтавана яна Аддзяленнем гуманітарных навук АН пры тэхнічнай і фінансавай падтрымцы прадстаўніцтва ААН у Беларусі. Дапамог фінансава і ўрад Японіі. У напісанні справаздачы прынялі ўдзел супрацоўнікі АН, МЗС, Белстандарта, Мінюста, Цэнтра гендэрных даследаванняў. У кнізе прааналізаваны ўзровень і ўмовы сённяшняга жыцця насельніцтва Беларусі, яе дзяржаўная палітыка, эканамічная і экалагічная сітуацыі, стан навукі і культуры, становішча жанчыны ў грамадстве, узровень злачыннасці і г.д. Якімі ж нас пабачыць сусветная супольнасць паводле гэтай кнігі?

РЭГІСТРАЦЫЯ ТЫДНЯ

Час сёння такі, што мы ўжо нічому не здзіўляемся, у тым ліку і розным рэгістрацыям. Тым не менш... Міністэрства юстыцыі Беларусі пры перарэгістрацыі руху "Беларускі інтэлектуальны рэсурс" зарэгістравала і знак інтэлекту, распрацаваны дызайнерам Ю.Кокінай. Аўтарка графічна спалучыла знак планеты Юпітэр з узыходзячай спіраллю, што сімвалізуе ідэю развіцця, і надпісам па латыні "Signum intellectus". Можам павіншаваць адзін аднаго, спадарове?

СУД ТЫДНЯ

У адзін дзень пачаўся і быў адкладзены да 5 верасня (шукаюцца новыя сведкі, як сказаў тэлевізійны каментатар) суд "Пазняк — супраць Азаронка". Прыйшоўшых на суд сустракала ці не сотня актывістаў СС "Белая Русь", так званых Беларускага патрыятычнага руху і Руху за дэмакратыю, сацыяльны прагрэс і справядлівасць. Азаронка, паводле паведамлення газеты "Знамя юности", зала сустрэла апладысментамі. Што ж, гэтых людзей наўрад ці што ацвярэзіць...

З нагоды

"НАРОД ПРАГАЛАСАВАЎ НЕ ЗА ЛЕПШАЕ, А ЗА ЗВЫКЛАЕ..."

За колькі дзён да "рэферэндуму" мне давялося мець гутарку са спецыялістам-сацыёлагам, які меў немалы вопыт у даследаванні так званай грамадскай думкі. Зразумела, што гаворка ішла пра маючую адбыцца акцыю і пра яе магчымыя вынікі. Я выказваў асцярожны аптымізм, мой суразмоўнік лічыў аптымізм абсалютна беспадстаўным. Прыцярпеласць, звычка — вось што, на ягоную думку, вызначае сёння стаўленне народа (альбо насельніцтва, як каму болей падабаецца) да ўлады. Таму і спадзявацца ў бліжэйшы час няма на што. Каб растлумачыць, чаму людзі церпяць амаральную і некампетэнтную ўладу, усведамляючы яе заганы, ён прывёў у якасці паралелі побытавую сітуацыю. Чаму, напрыклад, жонка церпіць мужа, які рэгулярна напіваецца, чыніць у хаце "крутыя" разборкі і ўвогуле ставіцца да яе далёка не па-джэнтльменску? Чаму ёй у галаву не прыйдзе думка хаця б здаць яго ў міліцыю альбо нават пачаць новае жыццё ўжо без яго? Таму што ён — звыклы і зразумелы. Такім альбо падобным яна памятае свайго бацьку, такі ў яе брат, такі ці блізкі да такога стыль жыцця ў яе знаёмых і суседзяў. І вось толькі калі муж па п'янцы праломіць ёй галаву альбо спаліць хату, альбо замахнецца на дзяцей, толькі тады яна прыменіць адносна яго нешта рашучае.

Часам такія стасункі бываюць і ў народа з уладай. Што, дарэчы, і пацвердзіў "рэферэндум". Народ прагаласаваў не за лепшае, а за звыклае. Звыклае і зразумелае. У гэтым сэнсе беларусы нічым не адрозніваюцца ад суседзяў.

Паспрабуем уявіць, што "рэферэндум", накшталт нашага, праводзіўся б у Расіі. Мы ўсе памятаем, як "зацвярджаўся" ў якасці дзяржаўнага расійскі трыкалор. Было прыблізна так. Б.Ельцын у жніўні 1991 года, стоячы на вежы танка, паказаў рукою на сцяг, што лунаў над Белым домам, і назваў яго "нашым сцягам". Пасля паразы путчу трыкалор пачаў скарыстоўвацца ў якасці афіцыйнай эмблемы Расіі, і толькі праз некалькі месяцаў спахапіліся, што пра яго няма закона, і закон той "задним числом", спехам прынялі.

А калі б Ельцын ладзіў з гэтай нагоды рэферэндум? Стаў бы пытацца ў насельніцтва, ці падабаецца яму трыкалор і двухгаловы арол? Так бы дагэтуль і мела Расія сярпаста-малаткастыя сімвалы. Бо — звыкла і зразумела.

Другое пытанне "рэферэндуму" — мова. Калі б расійцаў запытаць, захаваць моўную сітуацыю ў іхняй краіне такой, якая ёсць, альбо для прэстыжу краіны і павышэння культурнага ўзроўню насельніцтва гэтую сітуацыю змяніць? Адказ вядомы загадзя...

Трэцяе: адрадзіць СССР альбо нешта накшталт СССР ці жыць пановаму? І тут нашы ўсходнія суседзі прагаласавалі б за звыклае. І дадатковыя паўнамоцтвы прэзідэнту таксама б далі, каб хутчэй вярнуў краіну ў звыклы лад.

Тым не менш, пасля "рэферэндуму" суседзі паглядаюць на нас з пагардай. Мяркую, ім проста пашчасціла, што над імі гісторыя не ладзіла такога эксперыменту, бо людзі паўсюль людзі і звычка — вялікая сіла. Дарэчы, тая акалічнасць, што пасля паразы камунізму ў шэрагу краін (не толькі СНД) па выніках дэмакратычных выбараў пры ўладзе былая наменклатура, — красамоўнае таму сведчанне.

Калі думаеш пра будучыню Беларусі, дык можна ўявіць два варыянты развіцця падзей. Зважаючы на згаданы вышэй побытавы прыклад, скажам так: альбо "муж нарэшце спаліць хату" і гэтым справакуе рашучы выступ (тых, хто пакуль маўчыць), альбо ў народа паступова пад уплывам вонкавых і ўнутраных абставін з'явяцца новыя, больш цывілізаваныя звычкі і стануць зразумелымі дагэтуль яшчэ нязвыклыя словы — Адраджэнне, Дэмакратыя, Незалежнасць.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

АБАРОНІМ БАЦЬКАЎШЧЫНУ!

ГРАМАДЗЯНЕ БЕЛАРУСІ!

Не Вы вырашалі лёс сваёй дзяржавы, гістарычнай спадчыны, роднай мовы на нядаўнім прэзідэнцкім рэферэндуме. За кожнае з чатырох пытанняў станоўчы адказ далі крыху больш за 50 працэнтаў выбаршчыкаў, унесеных у спісы (а за змену гісторыка-дзяржаўных сімвалаў — менш 48 працэнтаў).

І гэта з улікам шматлікіх парушэнняў заканадаўства, бруднай паклёпніцкай хвалі ў адрас носьбітаў беларускай культуры, якая ў апошнія месяцы захліснула афіцыйныя сродкі масавай інфармацыі. Пра гэта шмат гавораць замежныя назіральнікі, міжнародная супольнасць і дэмакратычная грамадскасць Беларусі.

А калі ўлічыць патэнцыяльныя, але нявыказаныя пакуль галасы людзей новага пакалення — нашых дзяцей, падлеткаў, якія ў беларускіх нацыянальных садках і школах адчулі смак роднага слова? Іх — мільёны! А хто пытаўся галасоў многіх пакаленняў нашых продкаў, якія аднымі з першых у Еўропе выдавалі кнігі на беларускай мове, стварылі унікальную духоўную і матэрыяльную культуру, заможную і вялікую дзяржаву, шырокавядомую ў свеце?

Хто запрашаў на ганебны рэферэндум мільёны ахвяр сталінізму і фашызму, іх ненароджаных дзяцей і ўнукаў? А яны маглі і быць нашымі з вамі сучаснікамі, і падалі б свой голас у абарону Бацькаўшчыны, яе святыняў, сваёй дзяржавы.

І вынік рэферэндуму быў бы іншы... Нас знявечылі дзесяцігоддзямі праклятай паняверкі, падвялі да рысы нацыянальна-дзяржаўнага самазабойства. А цяпер растапталі. Не без нашага, многіх з нас, удзелу.

Трэба цвёрда разважыць і зразумець, што не Расія, не рускі шматпакутны народ стварае перашкоды на шляху будаўніцтва беларускага дзяржаўнага дому. Грымучая сумесь, якая стваралася ў Расіі з дзікунскага капіталізму, фашыстоўска-імперскіх палітычных структур, побытавай абывацельшчыны і вялікадзяржаўніцкіх настрояў, — вось што пагражае "ўзарваць" і расійскае і беларускае маладое грамадзянскае супольніцтва.

Што ж датычыць беларускай мовы — па выніках псеўдарэферэндуму яе статус не ўроўнены з рускай, якая панавала і пануе ва ўсіх галінах жыцця краіны. Вынікі антыканстытуцыйнага рэферэндуму паслужаць бруднай справе тых, хто хоча навек пахаваць мову нашага народа, якая мае тысячагадовую гісторыю.

Усе мы — беларусы, рускія, украінцы, палякі, татары, яўрэі, літоўцы і многія іншыя грамадзяне краіны — браты і сёстры, суайчыннікі. І наша беларуская мова — Ваша мова. Яна адна. І мы адны ў свеце. І няма нам іншай дарогі, як дарогі да Беларусі.

Навалач, якая бруднай пенай валіцца на Бацькаўшчыну, схлыне. Тое, што робіцца ў дачыненні да беларускага народа, да яго гісторыка-культурнай спадчыны, да Сцяга і Герба Дзяржавы, да агульнанародных багаццяў, да самой краіны і яе народа — гэта дзікунства, цемрашальства.

І яны думаюць, што прыйшоў іх час?! Марныя надзеі! А мы — цярпелі, і яшчэ нацерпімся. Гэта ненадоўга. Шмат каго бачыла наша шматпакутная Бацькаўшчына. І дзе яны цяпер? Усе — у паняверцы, у нябыце! А на сцягу краіны — такія, як Скарына, Каліноўскі, Купала, Колас, Багдановіч, Гарэцкі...

Давайце набяром у грудзі паветра і ўздыхнём глыбей. Давайце з годнасцю і з гонарам вымавім родныя словы — Маці, Беларусь, Бацькаўшчына. Каб гэтыя словы жылі вечна. Давайце вышэй падымем нацыянальна-дзяржаўны, родны і адзіны Сцяг і наш гістарычны, сцверджаны ў стагоддзях Герб. Гэтым мы паслужым Радзіме. Давайце задумаемся над лёсам будучых выбараў і вынікамі новых магчымых "прэзідэнцкіх" рэферэндумаў па ліквідацыі беларускай дзяржавы. Трэба сказаць сваё важкае слова пратэсту. Трэба схамянуцца — і абараніць Бацькаўшчыну. Гэта святы абавязак кожнага, каму Беларусь — маці.

Сакратарыят ТБМ імя Францішка Скарыны

ШТО ВЫБІРАЦЬ БУДЗЕМ?

ЗВАРОТ ТАВАРЫСТВА БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ ІМЯ ФРАНЦІШКА СКАРЫНЫ

Паважаныя бацькі і настаўнікі!

У сувязі з рэферэндумам сёлетні набор школьнікаў у першыя класы, відаць, будзе праводзіцца спецыфічным спосабам. Пры вызначэнні моўнага статуса школ органы адукацыі маюць намер абапірацца на выбар мовы навучання бацькамі. Звяртаем вашу ўвагу на наступныя акалічнасці.

1. Ва ўмовах эканамічнага хаосу і масавай пагарды да законаў права выбраць мову навучання цяжка забяспечыць на практыцы. Можна прадказаць, што інтарэсы беларускай моўнай супольнасці будуць парушацца, і мы будзем выбіраць школьную мову гэтаксама, як мы яе "выбіралі" дзесяць, дваццаць ці трыццаць гадоў назад. Многія замежныя навукоўцы лічаць, што свабодны выбар мовы навучання ў школе з'яўляецца "сродкам замацавання моўнага нераўнапраўя і выцяснення мінарытарнай мовы", г.зн. мовы, якая валодае меншай колькасцю функцый ("Вопросы языкознания", 1989, N 5, с.107). Але хіба за выцясненне беларускай мовы мы галасавалі на рэферэндуме?

2. Яшчэ некалькі гадоў таму назад у беларускіх гарадах не было ніводнага беларускага класа. Цяпер у рэспубліцы існуюць школы, малодшыя класы якіх вучацца на беларускай мове. Ліквідацыя беларускамоўнага статуса гэтых часткова беларускіх школ прывядзе да поўнага заняпаду сістэмы нацыянальнай адукацыі і адкіне нас у сітуацыю сярэдзіны 80-х гадоў. Але няўжо наша мэта — знішчэнне беларускамоўнай школы?

3. Інтэлектуальнае развіццё дзіцяці і ўзровень цывілізаванасці грамадства не звязаны непасрэдна з мовай навучання. Дзеці могуць нармальна развівацца, атрымліваючы адукацыю не на "сямейнай" мове; з другога боку, эканамічны дабрабыт большасці краін грунтуецца на рацыянальнай будове грамадства, а не на татальнай "далучанасці" да якой-небудзь сусветнай мовы. Не верце, што беларуская мова — перашкода на шляху выхаду з эканамічнага крызісу!

4. Цяперашняя пачатковая школа ў Беларусі пераважна арыентавана на выкладанне на беларускай мове, таму рэзкія змены ў моўным статусе школ могуць выклікаць крызісную сітуацыю, напрыклад, у забеспячэнні школьнымі падручнікамі. Няўжо мы хочам, каб нашы дзеці вучыліся "на пальцах", або па падручніках дзесяцігадовай даўнасці?

НАША КУПАЛЬЛЕ

У цяні хараства беларускіх лясоў блукае мінулае.
Таямнічаю мрояй занурылася ў лета папараць-кветка.
Дзе яе зацьвітае любоў,
як здабыць сакрамант вечнай прыгажосьці?..

Нязьведаныя шляхі вядуць да Творцы ўсяго,
што ёсьць на зямлі і на небе.
Любоў — ад Яго найвялікшы нам дар.
Паспрабуй адшукаць у сабе гэты дар,
і ты зразумееш: шчасьце побач з табой.

Dainova

ПЕРШЫ ВЫПУСК ГУМАНІТАРНАГА...

Але, мы не агаварыліся: у Беларускім гуманітарным ліцэі адбыўся першы выпуск. Безумоўна, і дагэтуль са сцен яго выходзілі ў вялікае жыццё тыя, хто атрымліваў адукацыю ў сценах гэтай прэстыжнай нацыянальнай установы. Але адметнасць сёлетняга выпуску ў тым, што з ліцэем развітваюцца тыя, хто правучыўся ў ім, як таго і патрабуе праграма, усе чатыры гады. Значыць, выпуск — ці не гістарычны. Гэта і падкрэсліў на ўрачыстасцях з выпадку выпуску ганаровы госць ліцэістаў (цяпер ужо былых) і іх выкладчыкаў народны пісьменнік Беларусі Васіль Быкаў. Сярод тых, хто пажадаў добрага шляху свядомым (і высокаадукаваным) беларусам, быў і другі шаноўны госць — народны паэт Рыгор Барадулін. А наперадзе ў выпускнікоў — самастойнае жыццё. Наперадзе — праца на ніве беларушчыны, на карысць Адраджэння. У імя Бацькаўшчыны!

ФРАНТАВІК — ГЛЕДАЧУ

Значнай падзеяй у культурным жыцці гамяльчан стала персанальная выстава работ земляка, старэйшага беларускага жывапісца, члена Саюза мастакоў Рэспублікі Беларусь Палянкова Мікалая Сцяпанавіча. Ён, навучэнец Віцебскага мастацкага вучылішча, юнаком пайшоў на фронт, быў танкістам, гарэў у баявой машыне, мужна змагаўся з гітлераўцамі.

Аснову творчасці Мікалая Сцяпанавіча і склалі карціны пра той суровы час, якія ўвайшлі ў гомельскую экспазіцыю: "Памяці выкладчыкаў і навучэнцаў Віцебскага мастацкага вучылішча", "Франтавы сон", "Бярозавік". Дарэчы, рэпрадукцыю твора "Бярозавік" уключыў у сваю аўтабіяграфічную кнігу "Жыццё і творчасць" народны пісьменнік Беларусі Іван Шамякін.

На выставу Мікалай Сцяпанавіч прадставіў таксама партрэты, пейзажы, нацюрморты.

А. ШНЫПАРКОЎ
"Бярозавік".

ГОСЦІ З ЛЯЙМЭНА

Нядаўна ў Мінску пабывала дэлегацыя з нямецкага горада Ляймэна на чале з бургамістрам Хэрбертам Эрбарам.

Тым, хто цікавіцца беларускай культурай на эміграцыі, добра вядомае гэтае імя: менавіта Х. Эрбар падтрымаў высілкі нашага земляка Ю. Попкі па стварэнні беларускага музея ў Ляймэне, а цяпер апякуецца гэтым музеем і гасцінна прымае беларусаў.

Дэлегацыя г. Ляймэна пабывала ў Наваградку, наведала музей, дзе ёсць куточак другога нашага земляка, былога дырэктара Наваградскай беларускай гімназіі Барыса Кіта, які жыве ў Германіі і таксама дапамагаў стварэнню беларускага музея ў Ляймэне. Дарагіх гасцей прымала Беларускае таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі і "Бацькаўшчына".

Я. ФЯДЗЮШЫН

На здымку: бургамістр г. Ляймэна Х. Эрбар і аўтар кнігі "Вяртанне. Жыццяпіс Барыса Кіта" пісьменніца Лідзія Савік.

Фота Г. ЖЫНКОВА

Пошта

"МЕЎ АПТЫМІСТЫЧНЫ НАСТРОЙ І Я..."

ДВА ЛІСТЫ БЕЛАРУСАЎ З РАСІІ

Шаноўны "ЛіМ"! У першых радках ліста хачу прызнацца ў сваіх шчырых пачуццях павагі і любові да цябе, да тых смелых і сумленных людзей, якія працуюць у калектыве "ЛіМа". Як жа мне бракуе чытання вашай газеты! Што ж рабіць, калі нельга тут выпісаць "ЛіМ", як раней. Шчыра кажучы, я зусім не ўпэўнены, што "ЛіМ" існуе сёння, калі ўсё беларускае падвяргаецца астракізму. Не ведаю, ці ёсць каму чытаць гэтыя мае радкі, мо ўжо няма "ЛіМа", а ёсць якая-небудзь "Литература и искусство"?

З сумам прагледзеў усе падшыўкі "ЛіМа", які я выпісваў з 1988 года. Як усе лімаўцы і чытачы верылі ў светлую будучыню Беларусі, у тое, як добра будзе жыць у незалежнай, суверэннай дзяржаве нашай, прызнанай усім светам пад бел-чырвона-белым сцягам і гербам "Пагоня"! Як верылі, што да 2000 года беларуская мова будзе гаспадыняй на зямлі беларускай! Меў аптымістычны настрой і я. Разам з усімі я цешыўся першымі здабыткамі беларусізацыі. Мне прыемна было бачыць на кіраўскіх прылаўках беларускую прадукцыю з этыкеткамі, выробленымі на беларускай мове. І вось усё ў адзін момант рухнула. Зноў над Беларуссю бэсэсэраўскі сцяг, зноў на Беларусі дзяржаўнай мовай славутая трасянка, зноў паўсюль і штодня гаворка аб зліцці Беларусі з Расіяй. Што ж, пэўна, Беларусь адпавядае палітычнай тэзе: "Кожны народ варты таго кіраўніцтва, якое мае".

Мы, беларусы, мелі два гістарычныя шанцы для таго, каб Беларусь была Беларуссю. І двойчы беларусы не скарысталі яго. Асабліва прыкра і балюча ўспрымаецца апошні рэферэндум, праведзены на Беларусі. Абсалютная большасць людзей прагаласавала супраць саміх сябе, за новую супольнасць пад старой назвай "савецкі народ". Гэта фенаменальны факт! Беларусы аказаліся адзінай нацыяй у свеце, якая не хоча самастойнасці,не хоча суверэнітэту. Беларусы не хочуць быць беларусамі. Яны хочуць быць расійцамі. Навошта ім гістарычныя беларускія сімвалы, беларуская мова, калі пад савецкімі сімваламі і з расійскай мовай можна было, няхай сабе і па картках, набыць танныя харчы, можна было не вывучаць родную мову ў школах і інстытутах (і добра, хоць на адзін прадмет меней і на адзін іспыт таксама)... Нацыя захварэла на страшэнную і ці вылечную хваробу СНБ — сіндром набытага быдланізму. Беларусам быццм усё роўна, што робіцца ў іхнім доме, хто ў ім кіруе і распараджаецца. Яны спакойна аддаюць на з'ядзенне сваіх лепшых людзей. Успомнім лёс Станіслава Шушкевіча. Адзіны годны кіраўнік за апошні час, з якасцямі сапраўды першай асобы краіны, які зрабіў усё магчымае і немагчымае, каб Беларусь займала "свой пачэсны пасад між народамі". Ніхто не зрабіў ані кроку, каб дапамагчы яму. Газеты выходзяць з белымі плямамі — беспрэцэдэнтны выпадак у свеце сённяшнім, і зноў — спакой і ціцшыня, ніхто, як той казаў, анічога. Была б толькі ў газетах тых праграма тэлебачання, прагноз надвор'я, абяцанкі знакаў задыяка, рэклама ды абывацельскае "чтиво".

Каб паважалі чалавека, краіну, дзяржаву — трэба перш за ўсё паважаць сябе. А калі й сябе не паважаеш, дык ці варта чакаць павагі ад іншых.

Вельмі балюча, сумна назіраць, як у Беларусі вытручваецца ўсё беларускае з беларусаў. А сама балюча тое, што маўчыць наша інтэлігенцыя, творчая і навуковая, ціха назірае за ўсім, што робіцца вакол...

Шаноўная рэдакцыя, напісаў пра ўсё гэта вам, каб падзяліцца тымі роспачнымі думкамі, якія апанавалі мяне, калі па расійскіх "Вестях" даведаўся пра вынікі рэферэндуму. Больш падзяліцца няма з кім, бо ў Кіраве і вобласці няма беларускіх суполак, хоць беларусаў тут і нямала, але — беларусаў пашпартных, а не свядомых.

З заўсёднай павагай да "ЛіМа"

Аляксандр КАЙСІН

с. Адышава Арычаўскага раёна Кіраўскай вобласці

•

Паважаная рэдакцыя! Дазвольце на старонках вашага штотыднёвіка выказаць свае меркаванні наконт нядаўна пройдзенага рэферэндуму. Можа, я памыляюся, але гэта падзея, на мой погляд, выклікала сваімі вынікамі здзіўленне не толькі ў межах былога Савецкага Саюза, але і ва ўсім свеце. Зразумела, гэта тычыцца толькі тых, хто цікавіцца Беларуссю.

Вынікі рэферэндуму выразна паказалі, што беларусы не жадаюць мець сваёй дзяржавы. А тады само сабою ўзнікае пытанне: а ці ёсць увогуле такая нацыя — беларусы. Бо для любой нацыі характэрным з'яўляецца павага і любоў да сваёй мовы, бо без мовы — няма нацыі. Нацыянальная мова, як вядома, выконвае наступную функцыю: яна згуртоўвае ўсе сацыяльныя групы і пласты ў адзінае цэлае — народ. І калі "подавляющее большинство" выказалася за наданне рускай мове статуса дзяржаўнай, добра ведаючы моўную сітуацыю на Беларусі, можна сказаць "однозначно": беларусы не жадаюць мець сваёй мовы. Як гаварыў таварыш Сталін: "Факты — упрямая вещь".

Мае апаненты з ліку рускіх сяброў маюць поўнае права разглядаць Беларусь як "Северо-Западный край". І аспрэчыць іх цяжка.

Беларусам гісторыя давала некалькі шанцаў стаць нарэшце нацыяй, але яны адмаўлялі сабе ў гэтым. Калісьці Дабралюбаў выказваў надзею, што беларусы яшчэ скажуць сваё слова. У гэтым русле, як ні дзіўна, гаварыў і адзін з правадыроў бальшавіцкай партыі Іосіф Сталін. Абгрунтоўваючы свае меркаванні наконт утварэння Беларускай савецкай рэспублікі, ён правёў паралель паміж беларусамі, латышамі і венграмі: "Гадоў сорак назад Рыга ўяўляла сабою нямецкі горад, але паколькі гарады растуць за кошт вёскі, а вёска з'яўляецца захавальніцай нацыянальнасці, дык цяпер Рыга — чыста латышскі горад. Гадоў пяцьдзесят назад Венгрыя мела нямецкі характар, цяпер яны мадзярызаваныя. Тое ж самае будзе з Беларуссю, у гарадах якой усё яшчэ пераважаюць небеларусы".

Гэта быў найбольш крайні прыклад звароту да прынцыпу самавызначэння нацыі з мэтаю не столькі задаволіць, колькі выклікаць нацыянальнае самавызначэнне.

Можна Сталіну "поставить в вину" тое, што пры ім пачалася ўзмоцненая русіфікацыя, дарэчы, як і іншых народаў, але тыя ж украінцы не адмовіліся ад сваёй нацыі.

Ды што гаварыць пра ўкраінцаў, калі ў канстытуцыях Чувашыі, Мардовіі, Татарстана запісана, што прэзідэнтам можа быць той грамадзянін, які добра ведае і размаўляе на нацыянальнай мове. У Беларусі ж прэзідэнт не толькі не ведае беларускай мовы, але адносіцца да яе з пагардай. Бадай, ва ўсім свеце няма прэзідэнта, які б не ведаў мовы народа, якога ён прадстаўляе. А ў Беларусі — "пажалуста".

Калі падсумаваць усё сказанае, дык можна з упэўненасцю сказаць: беларусаў як нацыі няма.

Калі браць Беларусь, а больш дакладна "Северо-Западный край" і народ, што там жыве, дык можна здзівіцца яшчэ з аднаго. З ягонай дзіцячай "наивности" і даверлівасці. Ён глыбока перакананы, што варта інтэгравацца ў Расію, як раптоўна жыццё стане такім, якое было раней. Скажам так: ніколі беларусы не жылі добра. Праўда, пры савецкім часе беларусы жылі трошкі лепш, чым іншыя народы. Але ж будзем шчырымі і пагодзімся, што народы Закаўказзя жылі куды лепей за нас, не кажучы пра народы Прыбалтыкі. Ды і ў Расіі былі раёны, дзе жыццё было куды больш заможнае, чым у нас. Далёка, як кажуць, хадзіць не трэба — назаву Мурманскую вобласць. Беларусам нават і не снілася такое жыццё.

Звяртаючыся да ранейшага жыцця, мы дакладна павінны ведаць, што танны хлеб і іншыя прадукты харчавання былі толькі таму, што краіна прадавала штогод па 300-400 тон золата. За золата купляўся хлеб, а таксама мяса і ўсё іншае. Вядома і тое, што Леанід Ільіч Брэжнеў хацеў падпісаць указ аб значным павышэнні цаны на хлеб, але смерць не дала гэта ажыццявіць. А Андропаў не захацеў сваё кіраванне пачынаць з павышэння цаны на хлеб. Так ці інакш, а цана на хлеб (а ён з'яўляецца падмуркам усяго харчавання) абавязкова павышалася б. А адсюль і ўсе прадукты харчавання павінны каштаваць дорага. Дарэчы, у той час і нафты было шмат.

Мае землякі спадзяюцца, што калі будзе цесная інтэграцыя з расійскай эканомікай, дык энерганосьбіты будуць таксама танныя. Слухаючы "Радио России", дзе даваўся агляд падзей на маёй Бацькаўшчыне, я звярнуў увагу на словы аднаго з палітычных аглядальнікаў, што, маўляў, беларусы спадзяюцца на "танны сыр", але, як вядома, ён бывае толькі ў мышалоўцы. У Расіі дзейнічаюць амаль цалкам рынкавыя адносіны. І гэта яскрава відаць па Мурманскай вобласці. Нягледзячы на паўночныя зімы, у некаторых месцах адключаюць ацяпленне, бо нафтапрадукты такія дарагія, што ўстановы не могуць аплаціць рахункаў... Ды і нафты, газу ў Расіі не так і шмат. Лічыцца, што іх хопіць на 35-40 гадоў, а там...

Пішу гэты ліст 27 мая. Сёння, як пачуў па радыё, Ельцын і Лукашэнка павінны будуць выкапаць сімвалічны пагранічны слуп паміж Расіяй і Беларуссю. І што будзе? Я глыбока перакананы ў адным: жыццё не будзе лепшым. Патрабуюцца новыя падыходы да гаспадарання, якія павінны выхаваць у грамадзян у першую чаргу ашчаднасць. Бо няма адказу на тое, калі добра ведаеш, як на радзіме цяжка з электрычнасцю, а паўсюдна днём гараць электралямпачкі. А газ, што гарыць ля помнікаў загінуўшым круглыя суткі, месяцы і гады? На захадзе так званы "вечны агонь" запальваецца толькі на час урачыстасцей і не болей, а яны шануюць загінуўшых лепш, чым мы. Дастаткова параўнаць іхнія могілкі і нашы...

Калі народ спадзяецца на цуд, дык ён абавязкова сыходзіць з гістарычнай арэны. Ёсць усе падставы меркаваць, што так званы беларускі народ "входит в небытие". І гэта не плён фантазіі, а суровая, як гавораць, праўда. Вядома, што нацыя можа развівацца і жыць, калі ў сям'і ёсць мінімум трое дзяцей, а ў нас? А экалогія? А наша ўсеагульнае п'янства? Усё гэта на корані падрывае здароўе нацыі.

Як вядома, унутраны патэнцыял Расіі сёння ўсё ж не настолькі вялікі, каб яго можна было выкарыстаць на карысць краіны насуперак знешнім абставінам. А што ж гаварыць пра маю Бацькаўшчыну, дзе, як мне здаецца, заклапочаны адным: барацьбою за ўладу? А калі гэта так, дык дзе будуць стаяць пытанні аб эканоміцы, аб простым чалавеку...

Зразумейце мяне. Гэта не эмоцыі, а факты. А яны сведчаць толькі аб тым становішчы, у якім апынулася "Белоруссия". Выйсця з гэтага глыбокага крызісу, наколькі мне вядома, пакуль што няма. А калі яго няма, дык што ёсць?

Аляксандр ПЯТРУННІКАЎ

г. Манчагорск, Мурманская вобласць

У ЭФІРЫ — БЕЛАРУСКАЯ РЭДАКЦЫЯ ПОЛЬСКАГА РАДЫЁ

На польскім радыё ў рамках праграмы для замежжа дзейнічае беларуская рэдакцыя, якая была заснавана ў пачатку 1992 года. Асноўная мэта рэдакцыі — паведамляць беларускім грамадзянам пра падзеі ў Польшчы на беларускай мове. Рэдакцыя сочыць за падзеямі ў Беларусі, значную ўвагу звяртае на двухбаковае польска-беларускае супрацоўніцтва і жыццё нацыянальных меншасцяў: беларускай у Польшчы і польскай у Беларусі.

Перадачы беларускай рэдакцыі польскага радыё выходзяць у эфір тры разы ў дзень:

а 14.30 на кароткіх хвалях 41,18 м і 50,04 (адпаведныя частоты 7285 і 5995 кГц)

а 16.30 на кароткіх хвалях 41,27 м і 49,22 м (а. ч. 7279, 6095 кГц)

а 19.00 на кароткіх хвалях 41,27 м і 49,22 м (а. ч. 7270, 6095 кГц)

Перадачы беларускай рэдакцыі польскага радыё можна слухаць па спадарожнікавай сувязі:

спадарожнік ЭУТЛЬСАТ II ф-3, 16 градусаў усходняй даўжыні, частотнасць 11,080 ГГз, гарызантальная палярызацыя, аўдыё 8,28 МГз.

Перадачы можна прымаць са спадарожніка а 17.00, ды ў суботу і нядзелю дадаткова а 12.30.

Адрас рэдакцыі: Беларуская рэдакцыя польскага радыё, ОО-977 Варшава, паштовая скрынка 46, Польшча.

Тэл. (+48+2) 6459366, 6459367, 6459282, факс (+48+22)444-123

"ЗАМЯНІЦЕ МНЕ НАСТАЎНІКА",

або ГІСТОРЫЯ АДНОЙ КАР'ЕРЫ

"САЙКОВСКИЙ Сергей. Ученик 9 "в" класса. Директору. Заявление. Меня, Сайковского Сергея, не устраивает учитель истории Полторжицкий, так как он неправильно оценивает учеников, плохо объясняет тему уроков и спрашивает не по домашним параграфам, а задает вопросы совсем на другую тему".

"Директору школы. Заявление. Я. Костенков Андрей, ученик 9 "а" класса, прошу вас заменить мне учителя истории Полторжицкого, так как он вообще не объясняет тему уроков, ставит незаслуженные оценки, обзывает нецензурными словами, рассказывает всякую чушь, при всем классе оскорбляет учителей и директора школы".

Гэтым дзвюм заявам, як і падобным іншым, у тым ліку калектыўнай, старанна сабраных у папцы дырэктара 110-й Мінскай сярэдняй школы Наталляй Уладзіміраўнай Ракевіч, папярэднічала здарэнне, якое і ў наш складаны час, калі, здаецца, ужо нікога нічым на здзівіш, успрымаецца як экстранеардынарнае.

11 лютага гэтага года нагаданы ў заявах вучняў настаўнік гісторыі Алег Мустафавіч Паўтаржыцкі быў жорстка збіты ў сценах роднай школы. Паводле сведчання судова-медыцынскай экспертызы, у пацярпеўшага былі выяўлены (цытую): "Ушиб грудной клетки слева, кровоподтеки и ссадины в области правой кисти, шеи, грудной клетки, левой голени и в совокупности относятся к категории легких телесных повреждений, повлекших кратковременное расстройство здоровья, для полного исхода (так у тэксце. — **М. З.**) которых потребовалось более 6, но менее 21 дня".

Для недасведчаных растлумачу, што вызначэнне судмедэкспертызай тэрміну, неабходнага для папраўкі здароўя ў выніку нанесеных траўм "более 6, но менее 21 дня" выходзіць за чыста медыцынскія рамкі, яно ўжо з галіны юрыспрудэнцыі і азначае, што па дзеяннях, у выніку якіх пацярпеламу нанесена такая шкода здароўю, можа быць узбуджана крымінальная справа па арт. 110 Крымінальнага кодэкса рэспублікі.

І яшчэ адзін дакумент, які, прызнаюся, і прымусіў мяне ўзяцца за пяро. Гэта пастанова народнага суда Кастрычніцкага раёна сталіцы за подпісам суддзі В. Бялыніна аб адміністрацыйным арышце А. Паўтаржыцкага тэрмінам на 5 сутак з даручэннем ажыццявіць гэты акт раённай міліцыі.

Каб адразу паставіць кропкі над "і", растлумачу, што судовая пастанова, пазначаная 11 мая г. г., як вынікае з яе прэамбулы, напрамую звязана са здарэннем, апісаным вышэй.

Чытач заінтрыгаваны? Хто ўсе-такі ў той гісторыі аказаўся пацярпелым? Адназначна адкажу: Алег Мустафавіч Паўтаржыцкі. Чым жа тады выклікана з'яўленне судовай пастановы аб яго арышце, даведаўшыся пра якую настаўнік, па яго словах, вырашыў перайсці на паўлегальнае становішча — не начаваць дома, хавацца па знаёмых і г. д., бо разумеў, што сам факт арышту, колькі б ён ні працягваўся, паставіць крыж на яго педагагічнай кар'еры.

Падобныя справы патрабуюць скрупулёзнага журналісцкага даследавання, і перш, чым прыйсці да нейкіх высноў, я доўга гутарыў з суддзёй В. Бялыніным, дырэктарам 110-й школы Н. Ракевіч і іншымі настаўнікамі, намеснікам начальніка аддзела бяспекі Кастрычніцкага РАУС г. Мінска А. Рылікам і ўчастковым інспектарам А. Цішко, пракурорам раёна М. Сяміжонам, адказнымі работнікамі гарана і Кастрычніцкага РАНА А. Фраловай, А. Моравай і З. Папковіч, іншымі службовымі асобамі, што мелі тое ці іншае дачыненне да гэтай гісторыі.

Упершыню ж я пачуў пра яе з вуснаў самога Алега Мустафавіча Паўтаржыцкага, які прыйшоў да мяне ў рэдакцыю. Пачуў і не паверыў. Але спачатку — пра самога майго наведвальніка.

На выгляд яму — пад сорак. Прыкметна кранутыя сівізной валасы, чарнавокі засяроджаны твар, стамляючая суразмоўніка манера гаварыць доўга, увесь час спыняючыся на відавочных дробязях, якія яму, відаць, здаюцца вельмі значнымі. Першае, што ён спытаў, адкрыўшы дзверы кабінета, якім часам я валодаю, каб выслухаць яго. Я адказаў, што хай гэта яго не турбуе. Калі ж сеўшы на крэсла ён выняў кіпу папер і паклаў перад сабой, я зразумеў, што гэта ўсё надоўга. Ён падрабязна расказаў мне пра ўсе дзевяць гадоў свайго цярністага шляху на ніве педагогікі, і перада мной паўставаў чалавек з відавочна цяжкім характарам і, дарэчы, няпростай біяграфіяй. Пачаць з таго, што шлях яго да прафесіі школьнага настаўніка быў не зусім ардынарны. Да гэтага ён папрацаваў і вадзіцелем аўтобуса, і на будаўніцтве метро, у кінафікацыі, займаў нейкія іншыя далёкія ад школьнай педагогікі пасады. Але была яшчэ, гаворачы высокім стылем, неадольная любоў да кнігі, асабліва кнігі гістарычнай. Заўважым, рыса не вельмі характэрная для шафёрскай брацыі. Любоў гэта нарэшце матэрыялізавалася паступленнем на завочнае аддзяленне гістарычнага факультэта Белдзяржуніверсітэта, якое Алег Мустафавіч скончыў у 1986 годзе, атрымаўшы дыплом і права выкладаць гісторыю ў сярэдняй школе. Да гэтага ён ужо дзесяць гадоў быў у шэрагах КПСС і, атрымаўшы дыплом, накіраваўся прамой дарогай у райком партыі, каб, па існуючым тады правіле, атрымаць накіраванне ў школу. Так ён дзевяць год назад і апынуўся ў 110-й сярэдняй школе г. Мінска. І, заўважым, амаль адразу, па яго словах, стаў "притчей во языцех" не толькі ў родным педкалектыве, але і ў іншых установах, так або інакш звязаных з нашай слаўнай савецкай сістэмай народнай адукацыі — ад райкома партыі да гарана і РАНА.

Ці было гэта спецыфічнай рэакцыяй на з'яўленне ў сценах школы гэткага бунтараадзіночкі, што не прызнае ніякіх аўтарытэтаў, дэкляруе барацьбу з усталяванай у савецкай школе коснасцю, нізкай педагагічнай культурай, паказухай і іншымі падобнымі "прелестями"? І так, і не. Не будзем забываць, што гэта быў час, калі ў краіне дзьмуў свежы вецер перамен, звязаных з гарбачоўскай перабудовай, змен, якія набылі як мноства прыхільнікаў, так і непрыхаваных непрыяцеляў. З гэтымі непрыяцелямі ў блізкай цяпер яму школьнай сферы і пачаў змагацца малады настаўнік. Ён доўга расказваў мне пра гэтае сваё змаганне, прыводзіў у пацвярджэнне розныя факты і дэталі. Дзеля справядлівасці аднзачым, што некаторыя з іх потым знайшлі ўскоснае пацвярджэнне, хоць і тлумачыліся па-іншаму. Так, у час маёй гутаркі з дырэктарам школы Н. Ракевіч яна, нанізваючы адзін на адзін кампрамат на Паўтаржыцкага, успомніць і пра тое, як ён аднойчы хацеў сарваць раённую традыцыйную жнівеньскую настаўніцкую канферэнцыю, хоць я схільны верыць інтэрпрэтацыі гэтага здарэння, пачутую з вуснаў Алега Мустафавіча. Ён сапраўды нарабіў, як цяпер кажуць, "шораху" на канферэнцыі, што ішла па пракладзенай дзесяцігоддзямі наезджанай каляіне. Не будучы ў спісах выступоўцаў, Паўтаржыцкі самачынна захапіўшы трыбуну, каменя на камені не пакінуў ад раённага партыйнага і "наробразовского" начальства, што пасела ў прэзідыуме, абвінаваціўшы яго ў кансерватызме, нежаданні ісці ў нагу з часам, старых падыходах да арганізацыі школьнай справы і да т. п.

Пасля той злашчаснай канферэнцыі з ім вельмі груба, па словах А. Паўтаржыцкага, пагутарыла нядаўна прызначаная дырэктарам школы Наталля Уладзіміраўна Ракевіч, паведаміла яму, што ім вельмі незадаволены ў райкоме партыі. Ён адказаў, што гэта яго вельмі мала цікавіць, што ён прывык гаварыць тое, што думае.

Потым былі яшчэ сутычкі з дырэктарам, якія перараслі ў непрыхаваную варожасць. Ну, і як гэта звычайна бывае, падзяліўся па сваіх сімпатыях і антыпатыях і педкалектыў. Прычым, пераважная большасць прыняла бок дырэктара, што зусім зразумела, калі мець на ўвазе залежнасць кожнага настаўніка ад школьнага начальства. Але і не толькі з-за гэтага. Калег Алега Мустафавіча раздражнялі некаторыя ўласцівасці яго характару: самаўпэўненасць, тое, што ён высокай думкі аб сабе (дарэчы, гэты "кампрамат" прыведзены ў адпраўленай у суд характарыстыцы, аўтары якой, відаць, лічаць, што ўзорам для пераймання з'яўляецца настаўнік, які трымаецца нізкай аб сабе думкі), што яму "больш, чым усім трэба", што вечна высоўваецца з нейкімі сваімі ініцыятывамі, адным словам, не такі, як усе. Адзін час, напрыклад, Алег Мустафавіч насіўся з ідэяй рэфармавання школы. Ён нават распрацаваў новую сістэму кіравання школьным працэсам, якая ўяўляла сабой нешта накшталт школьнага парламента на чале з саветам, у які б уваходзілі прадстаўнікі педкалектыву, мясцовых грамадскіх арганізацый, вучнёўства. Праўда, "парламент" гэты, як і належыць парламенту, рэзка абмяжоўваў правы кіраўніка, у дадзеным выпадку, кіраўніка школы, што было расцэнена Наталляй Уладзіміраўнай як падкоп пад яе ўласнае існаванне, і быў сустрэты ёю ў штыкі, як, дарэчы, і большасцю настаўнікаў. Як арыгінальнічанне, імкненне заваяваць танны аўтарытэт у вучняў была расцэнена калегамі Паўтаржыцкага і яго манера звяртацца да школьнікаў, нават да пяцікласнікаў, на "вы". І яшчэ, і яшчэ, і яшчэ з такога раду, што рабіла Алега Мустафавіча ў педкалектыве гэткай белай варонай.

Шчыра кажучы, на пачатку майго з ім знаёмства мне нават падалося, што лёс звёў мяне з гэткім, мясцовага разліву, настаўнікам гісторыі Мельнікавым, героем аднаго з лепшых кінафільмаў аб школе "Дажывём да панядзелка". Помніце яго ў таленавітым выкананні Вячаслава Ціханава — тонкага, цнатлівага і ў той жа час нязломнага змагара з коснасцю, казёншчынай, дагматызмам, з яго ўменнем бачыць у вучнях не бязлікую масу, а амаль ужо дарослых людзей з іх непаўторным успрыманнем дабра і зла, праўды і крывадушша?

Ды чым больш углядаўся ў Алега Мустафавіча, тым больш разумеў, што такое параўнанне не больш, як журналісцкая фантазія. І не таму, што ў жыцці бывае ўсё больш складана, шматмерна, чым у самым таленавітым "кіне", а таму, што не мог уявіць сабе таго ж Мельнікава, каб ён трымаў кіпу копій з розных заяў, скарг, пісьмаў, адасланых у розныя інстанцыі, што дэманстраваў перада мной Алег Мустафавіч.

Змаганне змаганнем, але ж і пра ўласны гонар нельга забывацца. Вось ужо каторы год А. Паўтаржыцкі і дырэктар школы Н. Ракевіч збіраюць адзін на аднаго кампраматы. Наталлі Уладзіміраўне рабіць гэта лягчэй, бо ёй дапамагаюць у гэтай справе многія настаўнікі і... вучні. Так, вучні, якія, фактычна, уцягнуты ў канфлікт, што з'яўляецца ва ўсёй гэтай гісторыі ці не самым агідным. Тыя ж вучнёўскія заявы, якія з гонарам дэманстравала мне Н. Ракевіч, не што іншае, як сабраны на А. Паўтаржыцкага кампрамат. Я не стаў высвятляць прыроду з'яўлення гэтых заяў-даносаў, палічыў неэтычным, калі хочаце, — непедагагічным гутарыць з падлеткамі на гэтую тэму, распытваць, хто іх навучыў гэта рабіць і да т. п., хоць, прызнаюся, Алег Мустафавіч называў мне настаўнікаў, якія нацэльвалі вучняў на напісанне згаданых "сачыненняў". Не стаў я высвятляць, па той жа прычыне, і методыку правядзення "ананімных" апытанняў вучняў на тэму, які настаўнік ім падабаецца і за што, а які — не вельмі. Чытаў я гэтыя лісткі, спісаныя вучнёўскімі почыркамі, і не мог не заўважыць, самай любімай настаўніцай амаль ва ўсіх адказах названа настаўніца хіміі, г. зн. сама Наталля Уладзіміраўна. І калі я звярнуў на гэта яе ўвагу, без цені сарамлівасці адказала: "А я сапраўды вельмі добрая настаўніца". Так што высокай аб сабе думкі не толькі Алег Мустафавіч.

Але вярнуся да тых апытальных лісткоў. Як, відаць, ужо здагадаўся чытач, самым нялюбым настаўнікам названы ў іх... ну, вядома ж, А. Паўтаржыцкі.

Я спытаў у дырэктара школы, ці не сорамна ёй збіраць і захоўваць падобныя вучнёўскі "сачыненні"? Яна адказала, што робіць гэта на ўсякі выпадак, бо ад Паўтаржыцкага ўсяго можна чакаць — пры неабходнасці пойдуць у ход і гэтыя сведчанні. "Каб вы ведалі, якія агіднасці гаворыць ён у класе пра мяне, — сказала Наталля Уладзіміраўна і, убачыўшы, што я не гару жаданнем развіваць гэтую тэму, дадала, — можна наогул звар'яцець, даведаўшыся, пра што ён гаворыць з вучнямі". "Пра што?" — усё-такі пацікавіўся я. "Пра што? — перапытала Ракевіч. — Пра секс! І гэта з дзевяцікласнікамі! Фактычна яшчэ з дзецьмі!"

Бедная Наталля Уладзіміраўна, яна і не ведае, што, паводле сацыялагічных апытанняў, якія рэгулярна праводзяцца ў краіне, пераважная большасць падлеткаў ведае пра секс амаль усё, што можна пра яго ведаць, і не толькі ў тэарэтычным плане...

І яшчэ колькі слоў пра тыя вучнёўскія заявы, якія не на жарт засмуцілі і ўстрывожылі мяне. Аказалася, што дарэмна я ўсё-такі ўспрымаю, аказалася, што я раблю з мухі слана. Ва ўсякім разе начальнік аддзела агульнай сярэдняй адукацыі Мінскага гарана А. Фралова, намеснік загадчыка Кастрычніцкага РАНА А. Морава і арганізатара гэтага РАНА З. Папковіч, з якімі я абмяняўся тэлефоннымі размовамі на гэтую тэму, запэўнілі мяне, што падобныя заявы вучняў з патрабаваннем уздзейнічаць на настаўнікаў, якія, на іх думку, дрэнна прафесійна падрыхтаваныя, не супярэчаць сучаснай педагогіцы. "У вас састарэлыя ўяўленні, — сказала адна з іх. — Мы праводзім дэмакратызацыю школы, а гэта прадугледжвае забеспячэнне шырокіх правоў вучняў, у тым ліку і права аспрэчваць справядлівасць выстаўленых ім ацэнак".

Вось такая, з дазволу сказаць, дэмакратыя, ператвораная ў абсурд. Ды каб жа толькі ў галіне школьнай адукацыі! Ці не таму сёння аказаліся скампраметаванымі самі паняцці-словы **дэмакрат, дэмакратыя,** якія з вуснаў многіх простых людзей гучаць як абраза.

Але не буду паглыбляцца ў невядомыя мне таямніцы сучаснай педагогікі. Мо сапраўды гэта добра, калі гультай і абібок можа аспрэчваць правамернасць выстаўленага яму ў дзённіку "кала", патрабаваць, каб яму замянілі настаўніка. Гэта, па думцы сучасных Песталоцці, відаць, выхоўвае ў яго пачуццё адказнасці. Адным словам, новая школа, новыя вучні. Так і хочацца ўсклікнуць пушкінскае: "Здравствуй, племя младое, незнакомое!"

Акурат, калі пісаліся гэтыя радкі, на вочы трапіў адзін з апошніх нумароў "Народнай газеты", а ў ім — невялікая нататка пра тое, як у Брэсце адзначаўся дзень апошняга званка. Гарадскі парк, па словах карэспандэнта, "нагадваў антычныя вакханаліі, ледзь трымаючыся на нагах, юнакі-выпускнікі волакам цягнулі сваіх апранутых у белыя фартухі сяброўак, якія ўжо не маглі перасоўвацца сваім ходам... У выніку ў райаддзел міліцыі было дастаўлена дваццаць п'яных выпускнікоў, у іх ліку пяць дзяўчат..."

На маіх тэлефонных суразмоўніц я натрапіў невыпадкова, — іх прозвішчы падказала мне Н. Ракевіч, падкрэсліўшы, што яны правяралі скаргі Алега Мустафавіча і ведаюць яму цану. Пры размове з педагагічнымі дамамі сапраўды высветлілася, што іх ацэнкі спадара Паўтаржыцкага не адрозніваюцца ад прапанаваных дырэктарам школы. Я пацікавіўся іх думкай наконт збіцця А. Паўтаржыцкага ў сценах школы, фактычна, у час выканання ім службовых абавязкаў. Так, яны пра гэта ведаюць, але як можна было зразумець з іх адказаў, гэтай справай павінны займацца праваахоўныя органы, а не яны.

(Працяг на стар. 12)

ТРАВЕНЬСКІ "ПЕРШАЦВЕТ"

Паэтычны сшытак прадстаўляюць творы А. Садко, Л. Сіманёнак, А. Ліпеня, Ю. Верамейкі, В. Жыбуля, Т. Талерчык, В. Слінко, А. Шэіна, М. Касцялецкай, А. Брусевіча, Н. Шкурдзь, А. Ганчука, Т. Барысюк, С. Гавенкі. З імпрэсіямі, навеламі, апавяданнямі, выступаюць С. Фрадова, І. Сударава, Н. Кулакова, М. Казун, казкай "Прыгоды ката Ваські" З. Сімагасціцкая.

Хутка год, як заўчасна пайшоў з жыцця У. Рубанаў. Чым жыў ён апошнія месяцы, бачна з яго дзённікавых запісаў "Аўра памяці".

У "Гасцёўні" вершамі прадстаўлены А. Лойка, А. Коршак, М. Машара, П. Панчанка, А. Астрэйка, публіцыстычным роздумам "Слова пра Вялікую Айчынную" — У. Паўлаў.

А. Марціновіч ("Вяртанне праз сцвярджэнне") дзеліцца ўражаннямі ад кнігі А. Карлюкевіча "Вяртанне да... Беларусі". С. Патаранскі рэцэнзуе кнігу А. Шушко "Выток і прычасце" ("Паэт — ён нечаканасць...). П. Прудзікаў ("Паэт-гаротнік") згадвае З. Біралу, тут жа прапануюцца некалькі яго твораў. Вобразы і сюжэты валачобных песень у цэнтры ўвагі А. Багамолавай ("Вясна красна на ўвесь свет!"). З вершаванымі гумарэскамі выступае А. Кліменка.

ПРЭМ'ЕРА... У ХРАМЕ

Дзве сотні гадоў стаіць у Слуцку драўляны Свята-Міхайлаўскі праваслаўны сабор. Але падзея такога кшталту адбывалася тут упершыню: ранішняе нядзельнае набажэнства праходзіла з удзелам прафесійнага хору, які спяваў музыку сучаснага прафесійнага беларускага кампазітара...

А калі канкрэтна — у Слуцк завітаў малады і ўжо знаны Мінскі абласны камерны хор "Sonorus", якім кіруе Аляксей Шут. Як і было дамоўлена з настаяцелем сабора протаіерэем айцом Міхаілам, хор спяваў падчас ранішняй літургіі, а гучаў ужо вядомы мінскім слухачам новы твор Алега Залётнева на кананічныя тэксты — "Літургія св. Іяана Златавуста". Твор прагучаў цалкам, за выключэннем двух нумароў, выкананне якіх строга абмежавана праваслаўным календаром (прынамсі, хор, які ўслаўляе Уваскрэсенне Хрыстова). Некаторыя нумары, як было дамоўлена загадзя, "Sonorus" праспяваў разам з хорам слуцкага Свята-Міхайлаўскага сабора. Набажэнства атрымалася сапраўды святочным, і ў гонар хору і аўтара "Літургіі" айцец Міхаіл даў нядзельны абед.

Можна сказаць, за адным разам у гарадскім Палацы культуры адбыўся канцэрт хору "Sonorus", у праграме якога, апроч "Літургіі" Залётнева, былі й фрагменты з "Усяночнай" Сяргея Бельцюкова. І яшчэ: нованароджаны слуцкі тэатр пластычнай драмы паказаў прэм'еру спектакля Антаніны Бялькевіч з музыкай Алега Залётнева — "І перапрошаны, і распнуты, і — ускрос".

С. ВЕТКА

АДНЫ ГАЗЕТЫ ЗАТРЫМЛІВАЮЦЦА, ДРУГІЯ — ВЫХОДЗЯЦЬ...

Днямі ў кіёсках з'явіўся першы нумар новай газеты. Называецца яна "Кніга і мы", а заснавальнікам штотыднёвіка з'яўляецца Мінскае гарадское прадпрыемства "Белсаюздрук". У газеце змешчаны розныя матэрыялы, якія тычацца выдання і распаўсюджвання кнігі. А гэтыя праблемы на сённяшні дзень як ніколі ўзаемазвязаны. Прынамсі, падобнымі клопатамі прасякнуты выступленні галоўнага рэдактара выдавецтва "Юнацтва" М. Пазнякова "Дзеці без кніг — дзяржава без будучыні" і галоўнага рэдактара выдавецтва "Полымя" Л. Кругловай "Нашы клопаты пра кнігу". Газету віншуе з выхадам першага нумара дырэктар выдавецтва "Юнацтва", віцэ-прэзідэнт Беларускай асацыяцыі кнігавыдаўцоў і кнігараспаўсюджвальнікаў В. Лукша, слова на дарогу прамаўляе начальнік "Белсаюздруку" Л. Шаблоўская.

Сярод матэрыялаў нумара нямала і займальных, што тычацца самых розных фактаў, звязаных з кнігамі, у тым ліку і вядомымі.

Часопіс у маі

"ПРАЎДЫ ВЕЛЬМІ ХАЧУ"

У жыцці, як вядома, даўно прыйшоў час прозы. Суровай, драматычнай і, хочаш таго ці працівішся гэтаму, а ў нечым, здаецца, і беспрасветнай. Канечне, можна па-ранейшаму спадзявацца на нешта лепшае, верыць, як мы любім гаварыць, у здаровыя сілы народа, ды адкуль гэтым сілам узяцца, калі народу з кожным — не годам, а днём — усё цяжэй дыхаць у прамым і пераносным сэнсе. Аднак, здаецца, час прозы наступае і ў літаратуры. Менавіта яна паступова пачынае разумець, што ёй, як і публіцыстыцы (не спаборнічаючы з апошняй, а суседнічаючы), застаецца несці галоўную службу. Паэзія, канечне, сваё слова працягвае гаварыць — разважліва і ўпэўнена, але, тым не менш, яна ў чымсьці пачынае і паўтарацца. Гэта адбываецца тады, калі завельмі ж мусіруюцца адны і тыя ж матывы. Назіраецца нешта адваротнае таму, што бачылася пры панаванні афіцыйнай ідэалогіі, пры самай кіруючай... Але ж нацыянальная падсветка тады, калі яна не падмацавана адпаведным майстэрствам аўтара, яшчэ нічога не значыць. Як у бубен ні бі, а з чароўнай скрыпкай яго ніколі не параўнаеш...

Але — пра прозу. З майскіх публікацый я вылучыў бы творы трох аўтараў — двух у "Полымі" і аднаго — у "Маладосці". А паколькі "Полымя" ўсё ж старэйшына сярод літаратурнай перыёдыкі, то з "Полымя" і пачну. А з-за павагі да Васіля Уладзіміравіча пачну гаворку з яго апавяданняў, хоць яны, за выключэннем аднаго — "Сцяна", узнаўляюць падзеі Вялікай Айчыннай вайны і з тэмай сучаснасці як быццам не звязаны.

Так, як быццам... Бо, калі зірнуць больш пільна, капнуць, як кажуць, глыбей, дык высветліцца, што і апавяданні В.Быкава — таксама пра сучаснасць. Пра сучаснасць у тым сэнсе, што яны дапамагаюць стаць нам куды больш відушчымі (і празорлівымі) у разуменні самай страшнай вайны ў гісторыі чалавецтва.

Наўрад ці магло б трапіць у друк некалькі гадоў назад апавяданне "Зенітчыца", героямі якога з'яўляюцца камандзір батарэі Калашнік і, як бачна з назвы, дзяўчына, адна з нямногіх, хто разам з мужчынамі ўзяў на свае кволыя плечы цяжар вайны. Ніна, так завуць дзяўчыну, паспела спазнаць радасць першага кахання да яго ж, Калашніка. А сам ён ва ўсю адчуў, што такое суровыя ваенныя абставіны. Вось і цяпер батарэя разгромлена: "Ад усіх зенітчыкаў учора засталося пяцёра, а пасля, як яны перабраліся пад агнём цераз шашу, апынуліся ўдваіх. Яна і камбат. Дзе астатнія, мабыць, ужо не дазнаюцца".

Ніна па-свойму ставіцца да таго, што адбылося. Безумоўна, перажывае, але — "ды і што было гараваць па батарэі, калі за тыдзень увачавідкі ляснула армія — немцы зашчамілі танкавымі абцугамі, ды і перабілі па частках".

Сам жа Калашнік да таго непапраўнага, што адбылося, адносіцца інакш. Таксама перажывае, таксама бядуе, аднак і разумее, што выхад да сваіх, калі гэта ўдасца ажыццявіць, наўрад ці прынясе яму асаблівую радасць, бо будзе дорага каштаваць. Справа ў тым, што "камбат Калашнік выходзіў ужо з трэцяга акружэння і што-колечы разумеў у тым". Пасля першага "месяц праседзеў на фільтрацыі — пісаў тлумачэнні, адказваў на пытанні ў асобым аддзеле, запаўняў анкеты. Неяк, праўда, абышлося, хоць падазравалі нямала, асабліва наконт батарэі. Быццам ён яе кінуў. Добра, знайшоўся сведка, маёр са штаба арміі, які пацвердзіў усё, што камбат напісаў у сваім самым першым паказанні. Паверылі, зноў паслалі на батарэю, праваяваў у якой роўна месяц, і зноў — акружэнне, разгром". Гэтым разам справа была аформлена на трыбунал, але да самага страшнага, на шчасце, не дайшло: "штосьці там у іх перамянілася, ці, можа, справа павярнула ў іншы бок, і яго тэрмінова накіравалі прымаць батарэю на пераправе, што засталася без камандзіра".

І вось — трэці разгром. Наперадзе, усё ж, здаецца, свае. Калашнік здагадваецца, не можа не здагадвацца, як яны сустрэнуць яго паведамленне аб трэцім разгроме батарэі:

"— Непараненым туды выходзіць нельга, — сказаў ён.

— Як?

— А так?

— Не ведаеш, што? Хаця ты першы раз... Слухай! Во табе аўтамат! — перш чым перадаць ёй ППШ, ён шчоўкнуў пераводчыкам, ставячы аўтамат на адзіночныя выстралы. — Трымай. Пацэліш мне ў руку і стрэль".

Зіна пры гэтым ніяк не можа зразумець, што і да чаго, а Калашнік "патрабавальна чакаў ля земляной сцяны капаніра", "выраз яго цвярдога чарнявага твару быў, як заўжды: рашучы і строгі". Калашнік чакаў, а Зіна... Не, не адразу ўсё дайшло да яе, ды не магло не дайсці: "у ёй паднімалася ўнутры штось чорнае і благое, а ў думках стукала адно толькі слова з д р а д а, з д р а д а". Калашнік і здагадацца не мог, што Зіна "саўганула пальцам металічны шпянёк на аўтаматычны агонь". Прагучала чарга...

Сюжэт, як кажуць, не для слабанервовых. Ды і ў іншых апавяданнях ("Палкаводзец", "Палітрук Каламіец", "Кацюша") у аснову пакладзены сюжэты, ад знаёмства з якімі халодзіць нутро. Такая яна — быкаўская праўда вайны! Суровая, бескампрамісная і патрэбная нам, каб мы ведалі ўсё пра тое, што адбывалася паўстагоддзя назад. А ведаючы гэта, успрымаючы належным чынам, яшчэ больш задумваліся, наколькі жудаснае само паняцце — цана Перамогі. Бо цана гэтая — мільёны ахвяр...

Ёсць у В.Быкава і апавяданні ("Пагорак", "Падоранае жыццё"), сюжэты якіх, я б сказаў, больш "спакойныя", ды гэтаксама аўтарам высвечаны тыя бакі вайны, якія доўгі час абыходзіліся ўвагай. Што да апавядання "Сцяна", дык у ім В.Быкаў памайстэрску раскрыў прагу да волі таго, хто апынуўся за кратамі. Дзень за днём, тыдзень за тыднем, месяц за месяцам чалавек робіць падкоп, каб выбрацца на волю. І вось, здавалася б, наперадзе воля. Ды спадзяванні аказаліся марнымі. Апынуўся ён у тым жа турэмным двары: "Над ім у змрочнай шэрані неба высіўся знаёмы сілуэт шыбеніцы, амаль над самай галавой невысока звісала вяроўка-пятля. Над ёй быў збудаваны драўляны падмостак, на які ён і наткнуўся ў змроку. Выйсця адсюль не было".

Лаканічна, набліжаючыся да дакумента, пачынае сваю новую аповесць "Вёска" А.Федарэнка: "Антона Васкевіча выганялі з інстытута ў канцы 1990 года, перад самай зімовай сесіяй". Пратакольна дакладна зафіксавана тое, што адбылося: "Запрошаны, Васкевіч пасядзеў у прыёмнай рэктара хвілінак 10—15, потым з прыёмнай, не гледзячы на яго, выйшлі адзін за адным куратар групы, прафорг, парторг (? — не быў ніколі Васкевіч у партыі і быць не збіраўся), камсорг, камендант інтэрната, прарэктар па гаспадарчай частцы і апошняя, дзканша, таксама чамусьці адводзячы вочы, спынілася перад ім і строгім голасам аб'явіла, што з гэтага дня ён адлічаны з другога курса сталічнай ВНУ. Потым дзканша падрабязна і даходліва растлумачыла, як і што цяпер Васкевічу трэба рабіць, дзе браць абходны ліст, куды потым здаваць, як і калі выпісацца з інтэрната".

Аднак гэта толькі пачатак твора, традыцыйная экспазіцыя да таго галоўнага, што адбудзецца затым. У сэнсе сюжэтнай адметнасці, як быццам, нічога асаблівага. Вернецца Васкевіч у родную вёску, сцерпіць папрокі маці, уладкуецца на працу ў бібліятэку... Тым не менш месяцы, праведзеныя ў правінцыі, зробяць у ім сапраўдны пераварот. І пераварот гэты А.Федарэнка паказвае так падрабязна, што адчуваеш кожны зрух душы Васкевіча. Прыехаўшы ў вёску звычайным рамантычным юнаком, ён вяртаецца назад у інстытут мужчынам, які разумее, наколькі гэты рамантызм далёка ад паўсядзённага вясковага жыцця і разам з тым перакананы — ні ў якім разе нельга адступаць ад ранейшых поглядаў.

Да такой высновы прыходзіць той, хто спачатку сябе інакш, як "пакутнікам за ідэю", не ўспрымаў. І была падстава меркаваць так. Хоць афіцыйна і тлумачылася выключэнне Васкевіча з інстытута як за п'янства, ні для каго сакрэтам не з'яўлялася, што яго пакаралі за беларускасць. Пасяліўся быў страх, што і тут, у вёсцы, адпаведныя людзі не адстануць, не даруюць вальналюбства. Але пераадолеў яго. Куды цяжэй (і патрэбней!), аднак, было прайсці праз іншае расчараванне. Пра гэта Васкевіч згадвае і ў сваіх дзённікавых запісах: "Некалі зімою гаварыў матцы: "Я пастрадаў за тое, што люблю вас, вашу мову, звычкі...", казаў і сам верыў, бо яшчэ Менск з галавы не выветрыўся. Добра любіць на адлегласці, едучы ў метро, п'ючы ў інтэрнаце віно ці седзячы на лекцыі ў будыніне ў цэнтры Менска... А тут?"

Ды ці любяць яны самі сябе, гэтую мову сваю, звычкі?! Самыя тыповыя іхнія пра сябе выказванні: "Язык ні польскі, ні конскі", "Гаруем, гаруем, невядома на якога чорта, так прапала жызнь — цьфу!" А яшчэ Васкевіч перажыў расчараванне, што колішнія сябры, якія засталіся ў Мінску, па сутнасці пра яго забыліся. Хіба адзін Алесь Рамановіч праз колькі часу наведаўся, ды і той, як зразумеў Антон, па-ранейшаму знаходзіцца ў далёкім ад рэальнасці свеце. Прынамсі, так падаецца Васкевічу, хто на ўласным гарбе, як кажуць, адчуў, як лёгка нешта дэкляраваць і як цяжка праводзіць яго ў жыццё.

"Праўды вельмі хачу" — гэта ўжо як крык адчаю. І адначасова крык упэўненасці, што менавіта з гэтага, а не іншага моманту нешта палепшыцца, стане на сваё месца. Да такой высновы Васкевіч прыйшоў, звярнуўшыся да Бога, наведаўшы храм. І падмацаваўся ў правільнасці сваіх высноў, калі ўбачыў, як колішнія камуністы, адчуўшы перамены ў грамадстве пасля жнівеньскіх падзей 1991 года, хутка памянялі свае колішнія погляды.

Наконт наведвання храма, то, па-мойму, у дадзеным выпадку А.Федарэнка зрабіў так, як многія пісьменнікі, якія хочуць пасучаснаму маральна ачысціць свайго героя. Але ж А.Федарэнка ўмее рабіць, як многія і многія рабіць не могуць. Таму хацелася б, каб ён гэтым кіраваўся і надалей, не даючы сабе палёгкі.

Аўтару ўдаецца саўладаць з багатым

КУЗЬМА ЧОРНЫ — ЦЭЛЫ СВЕТ

24 чэрвеня Кузьму Чорнаму магло б споўніцца 95 год. Хаця, разважыўшы, нават пры самых спрыяльных абставінах рэдка які чалавек дажывае да такога паважанага ўзросту. Яму ж, К.Чорнаму, як вядома, было адпушчана і куды меней. Не стала Мікалая Карлавіча 22 лістапада 1944 года. Пайшоў з жыцця, як кажуць, на самым узлёце. На творчым узлёце! Тым не менш многае паспеў ажыццявіць, здзейсніць. Бо гэта быў не проста талент, а талент, Богам дадзены. Таму К.Чорны не толькі пісаў, а і жыў задумамі, якіх магло б хапіць не аднаму мастаку слова. А ён на іншых не спадзяваўся, ён сам хацеў усё зрабіць. І нават тады, калі здароўе пагоршылася, не выпускаў пяро з аслаблых рук. Спяшаўся, разумеючы, што часу адпушчана яму няшмат. Быў упэўнены: "Чалавек жыве на свеце вельмі мала, чалавечае жыццё вельмі кароткае, і чалавек не паспявае зрабіць тое вялікае, што мог бы зрабіць".

Але на тое ён і чалавек, каб, нягледзячы ні на што, не выпускаць з рук крылы сваёй мары. На тое ён і чалавек, каб працаваць да змогі, каб рабіць, здавалася б, немагчымае. Такім ЧАЛАВЕКАМ і быў К.Чорны — адзін з найвыдатнейшых нашых сучаснікаў і адзін з самых цудоўных беларускіх пісьменнікаў. Пра яго напісана ўжо не адна кніга і не адна дысертацыя абаронена. Пра яго, несумненна, яшчэ з'явіцца шмат кніг і шмат дысертацый — кандыдацкіх і доктарскіх. Бо К.Чорны — гэта цэлы свет. Той агромністы свет, уваходзячы ў які, кожны з нас пачынае пановаму глядзець і на самога сябе, на свае ўчынкі. Але адначасна ўзнікае і настойлівае, моцнае жаданне разабрацца ў іншых людзях, зразумець свой народ на лёсавызначальных і адначасова віхурных паўстанках часу.

А менавіта гэтым жаданнем і напоўнены шматлікія творы вялікага Майстра. Іншая справа, што яны, здавалася б, даўно па-сапраўднаму прачытаныя, ацэненыя, сёння патрабуюць іншай ацэнкі, іншага прачытання. І нічога дзіўнага ў гэтым няма. К.Чорны, як і кожны творца, жыў у сваім часе. Цяпер жа — новы час. І калі мы нешта ў творчасці Мікалая Карлавіча бачым інакш, чым раней, у гэтым лагічная заканамернасць і апраўданасць. Бо на тое яна і класіка (а наўрад ці хто сумняваецца, што проза К.Чорнага і ёсць класіка — жывая, паўнакроўная!), каб не заставацца чымсьці аморфным, застылым, а заўсёды знаходзіцца ў руху. У руху да чытача, у руху да надзённых праблем рэчаіснасці.

матэрыялам і разам з тым своечасова паставіць кропку. А яна акурат і патрэбна тады, калі Васкевіч нарэшце атрымаў ліст з інстытута: "Страшна было ехаць, а яшчэ страшней аставацца.

Васкевіч думаў, што ён захварэў тут, заразіўся і ўжо не зможа зайсці ў аўдыторыю тым вясёлым бестурботным хлопцам, якім быў усяго год назад, што цяпер ён будзе цягаць за сабою, як чарапаха панцыр, сваю вясковасць, адчуванне нейкай вялікай несправядлівасці,ненармальнасці ўсяго, і цяпер — не дай Бог давядзецца — за сваю родную вясковую беларускую мову ён будзе стаяць насмерць, трымацца будзе за яе, як за апошняе, як за адзіны карэньчык, што жывіць яго, звязвае..."

Даруеш нават пэўную шматслоўнасць і празмерную пафаснасць. Даруеш, бо ўпэўніўся, наколькі аповесць напісана таленавіта. А што да асобных моўных каструбаватасцей, то пра іх забываешся. Ды і не сказаць, каб яны кідаліся ў вочы.

Вельмі ўзрадаваў новай аповесцю ў "Маладосці" У.Саламаха. Дарэчы, і яго нядаўняя кніга "Прывід у скураным крэсле" засведчыла, што ў творчасці пісьменніка наступіла тая пара, калі не проста хораша пішацца, а ўдаецца знайсці сваю тэму, сваіх герояў. А гэта асабліва тычыцца аповесці "Апазнаецца асоба мужчыны...". Як і А.Федарэнка, У.Саламаха з першых радкоў схільны быць дакладным, каб не адцягнуць чытацкую ўвагу ад лішняга. Праўда, да ўсяго ён можа і заінтрыгаваць: "Гэта здарылася на адной знакамітай мінскай ускраіне ў апошні дзень бабінага лета. Тут з самае раніцы нехта Н., бяздомнік і беспрацоўны, вудзіў у Свіслачы рыбу..."

Пра гэтага "бяздомніка і беспрацоўнага" і аповесць. У далейшым свайго героя У.Саламаха называе Чалавек. Тым самым падкрэслівае, наколькі гэты персанаж мае права насіць гэтае высокае званне і разам з тым стварае абагульнены вобраз таго, хто аднойчы спатыкнуўся. І не столькі па сваёй віне, колькі па віне грамадства, якое, жывучы, здавалася б, па самых справядлівых законах (прынамсі, на гэтым мацавалася афіцыйная ідэалогія), ніколі не прымала ў разлік канкрэтнага чалавека.

Аповесць У.Саламахі — адысея душы Чалавека. І адначасова пільна скіраваны позірк пісьменніка на самае дно грамадства. Тое дно, якое мы бачылі ў іншых краінах і не жадалі заўважыць у сябе. А яно існавала, гэтаксама, як ёсць і цяпер. І гора таму, хто аднойчы трапіць туды. Паспрабуй выбрацца, калі ніхто не праяўляе нават жадання падаць табе своечасова руку!

Аддамо належнае аўтару. Аповесць праўдзівая ў псіхалагічных адносінах, а прываблівае ўдалай кампаноўкай сюжэта. А апошняе, бадай, зрабіць У.Саламаху было нялёгка. Дзеяння ў яго традыцыйным разуменні ў творы па сутнасці няма. Пераважаюць рэтраспекцыі, перавагу бярэ "плынь свядомасці" персанажа. І ўсё ж аўтар аказваецца, як кажуць, на вышыні. Чытаць твор цікава, чытаць неабходна. Ужо хоць бы таму, што пранікаешся спагадай да Чалавека. І з агідай ставішся да прыстасаванцаў розных масцей, усіх гэтых "правільных", каму да чалавека, безумоўна, далёка, але хто, на жаль, адчувае сябе гаспадаром жыцця.

Усяго тры публікацыі месяца. Але і іх дастаткова, каб упэўніцца, што літаратура жыве. Літаратура шукае і, як бачым, адкрывае.

"Праўды вельмі хачу" — гэтым многае сказана, але — не мною заўважана — праўды лёгкай не бывае.

Алесь МАРЦІНОВІЧ

"Усё, што было, што праходзіць, — ненастаяшчае. Настаяшчае і светлае ідзе..."; "А чалавек — гэта ж свет, адна істота — неабхватны прастор, і разглядай яго, калі ўмееш..." Гэта з самых ранніх твораў К.Чорнага. У параўнанні з іншымі, напісанымі пазней, яны, безумоўна, у нечым пададуцца і слабейшымі. Ды ўсё адно іх нельга не прымаць пад увагу, інакш парвецца цэласнасць успрымання прозы яго, інакш, адкінуўшы адно, здавалася б, самае маленькае звяно, парушыцца цэласнасць усяго "ланцуга".

То, калі надарыцца вольная хвіліна, не палянуйцеся, вазьміце яшчэ раз у рукі адзін, другі том Збору твораў К.Чорнага. Ахвяруйце гадзіну-другую яго неўміручай прозе. А яна, як кажуць, — на ўсе мастакоўскія густы і ўзросты. "Сястра", "Вясна", "Бацькаўшчына", "Трэцяе пакаленне", "Люба Лук'янская", "Пошукі будучыні"...

Спіс можна доўжыць. Сапраўды: Кузьма Чорны — цэлы свет. Не будзем забываць пра яго існаванне!

А. М.

Віншуем!

Лідзіі АРАБЕЙ — 70

Вось ужо не адно дзесяцігоддзе Лідзія Арабей працуе плённа, мэтанакіравана ў самых розных жанрах, а пачала літаратурную працу яшчэ ў 1945 годзе. У 1956 г. выйшла манаграфія "Цётка (Алаіза Пашкевіч , у 1959-ым — крытыка-біяграфічны нарыс "Хвядос Шынклер". Цётцы Л.Арабей прысвяціла і дакументальна-мастацкія аповесці "На струнах буры" (1967) і "Стану песняй" (1977).

Проза Л.Арабей на сённяшні дзень адна з самых яркіх старонак нашай літаратуры. Узяць хоць бы такія кнігі, як "Мера часу" (1962), "Экзамен" (1963), "Сярод ночы" (1968), "Мне трэба ехаць" (1974), "Паласа дажджу" (1984), "Пошукі кахання" (1987) і іншыя. Глыбокім псіхалагізмам вылучаюцца раманы "Іскры ў папялішчы", "Сузор'е Вялікай Мядзведзіцы". Не адну кніжку прысвяціла Л.Арабей дзецям. Не абмінула яна і перакладчыцкай дзейнасці.

З днём нараджэння, шаноўная Лідзія Львоўна! Добрага Вам здароўя і новага творчага плёну!

Прапануем увазе чытача рэцэнзію на адзін з апошніх твораў Л.Арабей.

ЦІ ЁСЦЬ ВАЯРЫ Ў ЛІТАРАТУРЫ?

Героі новай аповесці Лідзіі Арабей "Мокры снег" — людзі пазнавальныя. І не толькі ў тым сэнсе, што за вобразамі галоўнага рэдактара літаратурнага часопіса Міхала Адамавіча Малашкі, іншых персанажаў стаяць рэальныя, добра вядомыя ў пісьменніцкім асяроддзі прататыпы. Напісаўшы аповесць, магчыма, пра год, скажам так, 1959, Лідзія Арабей стварыла сучасны і сённяшняму дню твор. Вось і атрымліваецца, што людзі, пісьменнікі, намаляваныя ў аповесці "Мокры снег", пазнавальныя сваімі слабасцямі, сваімі паводзінамі.

Не звяртаючы ўвагі на асноўны змест твора, аповесць можна па праву і па сутнасці лічыць памфлетам на жыццё пісьменніка, а хутчэй — памфлетам на макрасвет пісьменніцкай арганізацыі. З падтэксту адчувальна, што шчырае прызнанне пісьменніцкай бяззубасці, няздольнасці майстроў слова ўплываць на грамадскае жыццё, якое прагучала з вуснаў "пісьменніка з вобласці" Піліпа Цімошыка, здольныя пачуць многія. Але пачуць, адрэагаваць "шумнымі воплескамі" — і толькі.

У іншых абставінах выступленне Піліпа Цімошыка на пісьменніцкім пленуме ўспрымалася б як голая дыдактычная публіцыстыка, уведзеная ў твор дзеля надання яму сучаснага гучання. "А для каго вы пішаце свае творы, хто вас чытае? Дзе наша родная беларуская мова? Хто купляе вашы кніжкі? Яны ляжаць штабелямі ў магазінах, на складах, а вы тут спрачаецеся пра высокія матэрыі — вобразы, метафары, сацыялістычны рэалізм..." А тут як быццам і наканаваны ў стагоддзях (калі яшчэ выжывем як народ, як нацыя?!) зварот да пісьменніцкага сумлення. Хаця ці ж можа быць вузкапрафесійным (пісьменніцкім, мастакоўскім, сялянскім, настаўніцкім) сумленне? Хутчэй наадварот — наўрад ці можна прыватызаваць маральную планку на карысць той ці іншай сацыяльнай катэгорыі людзей. Нават зразумелая рознасць узроўняў свядомасці не можа падзяліць маральных катэгорый па характары іх прыналежнасці. Сумленне, чэснасць, праўдзівасць — яны ці ёсць, ці іх няма.

Малашка цікавы сваёй адноснасцю. Уладкаваўшыся няблага ў пасляваенным жыцці (пашчасціла на сябра, які своечасова згадаў пра яго там, наверсе, у ЦК), Міхась Адамавіч напісаў адносна праўдзівы твор пра сучасную вёску. І вось бура гневу (рэцэнзіі, зняцце з пасады, партыйнае і грамадскае абурэнне)... Апошняе, праўда, успрымаецца ўжо далёка як не адноснае. Малашка, хаця і застаўся ў яго апошні прытулак (дурныя мы людзі, што не можам зразумець: гэта ж найвышэйшай сілы ратаванне, калі сям'я — выратавальны круг) — жонка, дом, адчувае сябе гінучым караблём. Ды якраз апошні прытулак, апошні шанц ратавання не з'яўляецца галоўным.

Бо страчана, як лічыць Малашка, вельмі важнае. Пісьменнік выкінуты за борт карабля. Пісьменнік выкінуты ў натоўп. Цяпер жа ён, творца, набыўшы, здавалася б, галоўнае — свабоду, страціў найважнейшыя бастыёны. Тыя, каторыя шмат хто не можа адолець пры ўсім жаданні за ўсё сваё жыццё. Вось і Масква не хоча друкаваць раней ухвалены раман. Хаця ж і знаёмства ў Міхала Адамавіча было наладжана самае цеснае з самой рэдактаркай маскоўскага выдавецтва, з самой лёсавырашальніцай шляхоў беларускай прозы да ўсесаюзнага чытача. І сябар Антось зусім іначай пачынае ставіцца да Малашкі. Калі Міхала прызначалі рэдактарам, то казыраў, што паўплываў на выбар кандыдатуры. Цяпер жа...

"— Але ж ты казаў, што назначылі мяне рэдактарам, бо ты падаў кандыдатуру...

— Так, падаў... Але там прыслухоўваюцца толькі тады, калі мая думка супадае з іхняю... І то — робяць выгляд, што прыслухоўваюцца.

А калі не супадае..."

Напісаўшы пра "гнілую хатку", пра пасляваенны гаротны лёс вёскі, Малашка парушыў законы сацыялістычнага рэалізму. Пісьменнік забыўся, што метадалагічна першасная навука патрабуе, каб на цяжкасці мы ўсе пазіралі з іншага пункту гледжання ("А можна пісаць пра новы дом, каб тыя, што жывуць у гнілой хатцы, захацелі хутчэй пабудаваць такі самы..." — вучыць сябра Антось).

Скінуты ў акіянскую бездань з карабля, Малашка спрабуе выратавацца. "Крывёю" імкнецца выправіць тое, што здарылася. Пакутуе над старонкамі твора пра нашу сацыялістычную яву. Сам сабе ладзіць сацыяльна-палітычны заказ. І хаця прыдуманы, схематычны, далёкі ад жыцця твор не атрымліваецца, хаця кожная старонка гвалтуе душу, Малашка зноў і зноў вяртаецца да пісьмовага стала.

Л.Арабей, пісаўшы ці то з жыцця ці проста наўмысна ладзячы перад сабою канструкцыю паводзін галоўнага героя, пазбавіла Міхала Адамавіча як мастацкага персанажа ўсялякіх шанцаў на барацьбу. Аднойчы дазволіўшы сабе сказаць за пісьмовым сталом праўду, Малашка такі ж, як і ўсе. Ён не змагар, не барацьбіт. Ваяроў у літаратуры, як і ў грамадстве, заўсёды адзінкі. Тым больш — у грамадстве, акутым з усіх бакоў ланцугамі таталітарнай, камандна-адміністрацыйнай (справа не ў назве), словам, жорсткай сістэмы. Асоба з правам на свабоднае і шчырае волевыяўленне, на адно толькі выказванне — для тае сістэмы небяспека найвялікшая. Таму і карае сістэма ўжо на самых подступах нават да асэнсавання мастаком гэтага права.

Справа не ў Малашку. Усё, канешне ж, шмат складаней. Ваяроў, як па сённяшнім асэнсаванні мяркуемых патрэб мастацкага аналізу рэчаіснасці, не стае грамадству і сёння. Ці, можа, народ не патрабуе, не спадзяецца на ваяроў з сістэмай?.. Куды ж кіруе пісьменніцкі карабель? І ці ў народным морыакіяне рассякае воды мастацкі лайнер?

Публіцыстычна сцверджаная бязглуздасць сённяшняга часу існуе як бы сама па сабе. Смеласць, лічы, адзінкавых выступленняў майстроў слова (як правіла, усё ж такі набытым грамадскім і ўсенародным аўтарытэтам абароненых ад сістэмы і ўлады) — яшчэ не ўся літаратура. Добра, выдатна, што гэта існуе як з'ява. А сучаснасць чакае, калі свабодныя і сумленныя Малашкі парупяцца пра шчырую размову пра дзень сённяшні. Няхай сабе і на іх — малашкаў — прыватны погляд.

Алесь КАРЛЮКЕВІЧ

ФРАГМЕНТЫ

Уважлівы чытач мог прыкмеціць, што пад рубрыкай-назвай "Фрагменты" часам змяшчаюцца вытрымкі з матэрыялаў нетрадыцыйнага зместу — рэлігійнага, эзатэрычнага, з выкладам неардынарных, нават спрэчных тэорый. Чым тлумачыцца такі своеадметны падбор?

Жаданнем, па-першае, разнастаіць нашы досыць "унармаваныя" старонкі; па-другое — даць "інфармацыю для роздуму", штуршок да працы душы; па-трэцяе — звярнуць увагу чытачоў на існаванне цэлага пласта літаратуры, нам раней недаступнай. На жаль, гэтая літаратура пераважна рускамоўная, і даводзіцца яе перакладаць.

"Фарміраванне інтэлігенцыі звязана са збліжэннем людзей вышэйшых кастаў, якія яшчэ не ўсведамляюць і не разумеюць саміх сябе, але, тым не менш, дзейнічаюць у згодзе з прынцыпамі цьмяна адчуваемай уласнай касты. Характэрныя рысы інтэлігенцыі заўжды і паўсюль адны і тыя ж. Па-першае, гэта імкненне да бескарыслівай дзейнасці; затым досыць нецярпімае пачуццё неабходнасці асабістай свабоды для ўсіх і мяцежныя адносіны да ўсіх і да ўсяго, што стаіць на шляху да свабоды думкі, слова і індывідуальнасці. Ва ўмовах сучаснага жыцця, у акружэнні ўсіх недарэчнасцей існуючага ладу інтэлігенцыя, натуральна, становіцца рэвалюцыйнай. (...) Але неакрэсленасць пачуцця касты, невыразнае разуменне мэт і сродкаў, сяброў і ворагаў прыводзіць інтэлігенцыю да фундаментальных памылак. Яе захапляюць утапічныя ідэі, тэорыі ўсеагульнага дабра — і пасля аказваецца, што ёй самой даводзіцца служыць ніжэйшым кастам і кіравацца іх жаданнямі. Такім чынам, інтэлігенцыя страчвае сэнс свайго існавання, і абуджаныя ёю стыхійныя сілы абарочваюцца супраць яе.

Менавіта гэта і адбылося ў Расіі і мела самыя трагічныя паследствы не толькі для інтэлігенцыі, але і для народа, які інтэлігенцыя імкнулася "вызваліць".

Трагічныя вынікі "вызваленчага руху", які ўзначаліла інтэлігенцыя, (...) тлумачацца тым, што адразу ўслед за інтэлігенцыяй узнікаюць два новыя класы сучаснага грамадства, якія можна назваць "псеўдаінтэлігенцыяй" і "паўінтэлігенцыяй". (...)

Не валодаючы ні маральнымі, ні інтэлектуальнымі каштоўнасцямі, гэтыя два класы ўяўляюць вельмі вялікую сілу ў колькасных адносінах, і ўлада, выпадаючы з рук старых урадаў, натуральным чынам пераходзіць у іх рукі, г.зн. у рукі псеўдаінтэлігенцыі. Каб утрымаць уладу, яны гатовыя ахвяраваць усім і перш за ўсё тым самым "народам", у імя якога інтэлігенцыя вяла барацьбу.

Інтэлігенцыя не можа гэтага прадбачыць і нават не разумее таго, што адбылося, паколькі не разумее сябе, сваёй жыццёвай ролі і слабасці сваіх тэорый.

Увогуле тэорыі іграліі працягваюць іграць вялізную ролю ў жыцці сучаснага грамадства. Людзі верылі, а многія і цяпер вераць, што з дапамогай тэорый ім удасца змяніць жыццё чалавецтва. (...) Галоўны грэх інтэлігенцыі — яе вера ў тэорыі. "Псеўдаінтэлігенцыя", знешне пераймаючы інтэлігенцыю, таксама асноўвае свае дзеянні на тэорыях, але яна іх не ідэалізуе, а наадварот, уносіць у іх значную долю сафістыкі і ператварае ў сродак асабістага прыстасавання да жыцця.

Але шчыра ці няшчыра спадзеючыся на тэорыі, людзі (...) не разумеюць, што ў прымяненні да жыцця тэорыі даюць не тыя вынікі, якія ад іх чакаліся, а амаль заўсёды штосць супрацьлеглае. (...) Фактычна ніводную тэорыю, якая сустракае супрацьдзеянне, немагчыма прымяніць да жыцця ў яе чыстым выглядзе, і яе даводзіцца прыстасоўваць да існуючых умоў. У выніку, нават калі тэорыя мае ў сабе магчымасць рэалізацыі, нейкую ўнутраную сілу, гэтая сіла пойдзе на барацьбу з супраціўленнем, так што на саму тэорыю не застанецца ўжо нічога, акрамя пустой пацярухі слоў, імён і лозунгаў, што будуць прыкрываць факты, дыяметральна супрацьлеглыя тэорыі. І гэта не выпадковая няўдача, а следства агульнага непазбежнага закона.

1912—1934 г."

З кнігі: П.Д.Успенский, "Новая модель Вселенной". Издательство Чернышева, 1993.

ЛіМ
ЧАСАПІС

ІВАН ЧЫГРЫНАЎ — ГАНАРОВЫ ДОКТАР

Ганаровы доктар Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Гэтую навучальную ўстанову Іван Чыгрынаў, як вядома, скончыў у 1957 годзе. Спачатку ў навуку падаўся, ды перамагла літаратура. І настолькі плённа працаваў і працуе ў ёй, што выкладчыкі БДУ звярнулі на яго ўвагу. Нядаўна вучоны савет універсітэта прысвоіў народнаму пісьменніку Беларусі І. Чыгрынаву званне ганаровага доктара БДУ. Як сказана ў дыпломе — за выдатныя дасягненні ў літаратуры і асабістыя заслугі ў развіцці беларускай культуры.

СЕМІНАР ТВОРЧАЙ МОЛАДЗІ

На пачатку чэрвеня ў Лагойску адбыўся двухдзённы семінар маладых паэтаў Мінскай вобласці. Гэта ўжо другая такая сустрэча пачаткоўцаў, якую арганізавала Мінская абласная бібліятэка імя А. С. Пушкіна сумесна з мясцовымі ўладамі і Саюзам пісьменнікаў. На семінары прысутнічала больш за сорак маладых паэтаў — людзей розных узростаў і розных прафесій. Усіх іх, вядома, прывяла сюды вялікая закаханасць у беларускую паэзію, жаданне прачытаць свае вершы сябрам, пачуць ацэнку і заўвагі старэйшых таварышаў па пяры. І яны, маладыя паэты Міншчыны, атрымалі такую выдатную магчымасць: пісьменнікі Сяргей Законнікаў, Алесь Пісьмянкоў, Анатоль Зэкаў, Яўген Каршукоў і іншыя правялі не адну гадзіну са сваімі маладымі паплечнікамі ў літаратурнай справе.

Да ўсяго варта дадаць, што ўдзельнікі семінара наведалі купалаўскія мясціны на Лагойшчыне, сустрэліся з калектывамі мастацкай самадзейнасці, працаўнікамі раёна.

Мінская абласная бібліятэка імя А. С. Пушкіна і ўпраўленне культуры Мінскага аблвыканкама падрыхтавалі і выпусцілі зборнік лепшых вершаў маладых паэтаў вобласці — "Нас слова Купалы да творчасці кліча".

Я. ІВАНОЎ

"МЫ З ВАМІ, ГЕРОІ..."



Выстаўка "Душою і сэрцам мы з вамі, героі", прысвечаная 50-годдзю Вялікай Перамогі, працуе ў Літаратурным музеі Якуба Коласа. На ёй прадстаўлены малавядомыя лісты народнага песняра да М. Лынькова, П. Броўкі, С. Гарадзецкага, напісаныя на пачатку вайны, а таксама рэдкія фотадакументы.

Упершыню экспануюцца жывапісныя і графічныя работы беларускіх мастакоў Л. Рана, З. Паўлоўскага, Я. Раманоўскага, А. Зайцава і іншых. Можна пазнаёміцца таксама з партрэтам Я. Коласа, выкананым алоўкам паэтам С. Гарадзецкім. Другі партрэт песняра зроблены Т. Жырмунскай 3 лістапада 1942 года ў дзень нараджэння Кастуся Міхайлавіча.

На адкрыцці выстаўкі выступілі пісьменнікі П. Прыходзька, І. Кудраўцаў, М. Татур. Экскурсію праводзіць супрацоўнік музея Г. Зайцава.

Фота У. ГУЗОЎСКАГА

НОВУЮ СЕРЫЮ

распачало выдавецтва "Мастацкая літаратура". Называецца яна "Бібліятэка беларускай класікі" і, як бачна з назвы, ставіць за мэту знаёмства шырокага чытача з найбольш значнымі творамі, напісанымі літаратарамі ў розны час. Адной з першых кніг у згаданай бібліятэцы стаў аднатомнік народнага паэта Беларусі Аркадзя Куляшова "Паміж наступным і былым" (укладанне і прадмова В. Куляшовай). Чытач атрымаў магчымасць пазнаёміцца з такімі выдатнымі паэмамі А. Куляшова, як "Хамуціус", "Варшаўскі шлях", "Далёка да акіяна" і іншымі. Шырока прадстаўлена і лірыка. Прынамсі, змешчаны лепшыя вершы са зборнікаў "Сасна і бяроза" і "Хуткасць", якія ў свой час засведчылі сталасць таленту паэта і адначасова пастаянную маладосць яго паэзіі.

Паэзія

Людміла ПАЎЛІКАВА

ВЯНОК ЗАДЫЯКУ

1. УСТУП

Каб думалі аб вечным і святым,
У заранiцах, зорах, бліскавіцах
Глядзіць і ў душы нашыя глядзіцца
Жывое неба — невыказны мім.

У створаным усё ёсць прадусім,
Не наталіцца з той Першакрыніцы —
Сапраўдны міг вартуе таямніцы,
І вешчбіт той — хто валадарыць ім.

Замкні былое з прышласцю ў вянец,
І хай пачатку суджаны канец —

Паслухаем, што скажаш, мой санет,
Якія нам закладзены празоры
У немінучых позірках сузор'яў,
У зморшчынах раздумлівых планет.

2. АВЕН

У зморшчынах раздумлівых планет,
Прарэзаных страсцямі, як і цнотай,
Ляжыць глыбока прага адзіноты
І мудрасці касмічнай запавет.

Прымі, Авен, душы сваёй партрэт,
Ёй дадзены і скарбы, і кляйноты,
Ды іх не знойдзеш, зіркаючы ўпотай
На ўласны цень, што засціла свет.

Не спачывай на лаўрах, як і ў марах,
Вой без шчыта — становіцца ахвярай.

Агню абраннік, горды наш ягнец,
Хай звон мячоў стаіць на полі Марса,
Ты там адно —
для форсу ці для фарсу,
Суцішся — не спрачаецца мудрэц.

3. ЦЯЛЕЦ

Суцішся — не спрачаецца мудрэц,
Навошта словам ісціну няволіць?
"На гэтае і сілы нам даволі", —
Напэўна, так падумаеш, Цялец?

Упартых форм даследчык і стварэц,
Ты прагнеш зведаць смак
зямное солі,
Але чаруе розум твой і волю
Сляпучым бляскам Залаты цялец.

Усё святое — нам даецца дарам,
Каб людзі храм не блыталі з базарам.

Ласун жыцця, спакусе наўзамен —
Бо страсці там, дзе гнёзды ўюць хімеры
—
Даверся пад заступніцтвам Венеры
Дзяліць душу, і хлеб свой, і агмень.

4. БЛІЗНЯТЫ

Дзяліць душу, і хлеб свой, і агмень...
О, Гіменей, адкінем гэту коснасць!
Падзелу не прымае суцэласнасць —
Дзе стануць межы — ляжа там і цень.

Як вось зары злучае ноч і дзень
І ў плоць душа святло сваё прыносіць,
Так палюсы яднаючы і лёсы,
Любоў двум сэрцам дорыць
свой прамень.

Ды ўзяць той дар не кожны з нас умец.
Жыццё ў працягу, адчужае — смерць.

Таму й дарогі сплецены ў вянкі,
Каб сталіся знаходкай нашы страты.
Усе па Богу-Духу мы блізняты,
Што разышліся ў розныя бакі.

5. РАК

Што разышліся ў розныя бакі,
Маўчальнікі святыя, па пячорах?
А тут — бурліць, шуміць людское мора,
Балючыя матэрыі шматкі.

І звон маўчыць. У трудны час такі,
Адрозніўшы адданасць ад пакоры,
Пара з нары ўзнімацца на пагорак:
Наш крыж адно ёсць —
падарожны кій.

Не дазваляй душы сваёй змарнець.
Як часта гнаны — зор саміх ганец!

Пяшчотны Рак, ідзі ў жыццё хутчэй,
Няхай усё не так — абы не міма.
Пад панцырам — хаваецца ранімасць.
Прадбачлівасць — не веданне яшчэ.

6. ЛЕЎ

Прадбачлівасць — не веданне яшчэ.
Вось і мяркуй, што доля наваражыць.
Адвеку лёгка сеецца варожасць,
Ды ўсё благое — дзеецца лягчэй.

Куды ні кінеш — з ведамі ямчэй.
Ды, мудры Леў, задумваешся, можа,
Чаму часінай так неасцярожна
Збіраеш зыск зайздрослівых вачэй?

Бяжы ад тых, каго ты вабіш марна
Наіўнасцю ды гордасцю ліхвярнай.

Інакш — не асляпіся ў пахвальбе
Ні ўладаю, ні сілай, ні заможжам.
Як таленты, адказны ты памножыць
Усё, што Богам дадзена табе.

7. ДЗЕВА

Усё, што Богам дадзена табе
І людствам невымернае ніколі,
Прымі як дар у радасным спакоі,
Не знае цнота зморшчынак на лбе.

Зямная Дзева — ў ласцы і ў журбе
Замкнёная ў зняверлівасці кола —
Як зерне ўвасабляе хлебны колас,
Так ты аднойчы вырасцеш з сябе.

Ды не цягні з мінулага нагару.
Той, хто пазбыўся гэткага цяжару —

Спасціг адзінства смерці і жыцця;
Падзеленыя ўмоўнасцю двурушнай,
Яны — палёт адной
двухкрылай птушкі,
Шукай між крылаў вечнасці працяг.

8. ШАЛІ

Шукай між крылаў вечнасці працяг.
Ды знойдзеш ключ, няйначай,
як у вагаў,
Каб з нерушшу не блытаць раўнавагу
На тоненькай вяровачцы быцця.

З агнём ты балансуеш там, хаця —
Табе не больш патрэбна той адвагі,
Таго памкнення, велічы і прагі,
Што ў першым кроку выкажа дзіця.

Пільнуй, каб быў нязгасным каганец,
У цемры шлях — няздольнаму гарэць.

І ўсім святлей ад полымя твайго
Тут, дзе вага наступнасць вырашае,
Учынак, слова, думка — ўсё на шалях,
Ідзе сам-насам бітва: хто — каго?

9. СКАРПІЁН

Ідзе сам-насам бітва: хто — каго? —
У чыё ж імя на ўхібах ды каменнях
Смяротна заліваем раздражненнем
Любові паратункавы агонь?

Што толку ў шкадаваннях наўздагон?
Аглухлыя ад віскату сумненняў,
Не слухаем уласнае сумленне —
І з джалам сустракаемся яго.

Дзе шчасце — наш прапылены закутак,
Адтуль і злоба пырскае атрутай.

Жыццё навідавоку — доля зор,
Ды там, дзе свет наш робіцца
замкнёным,
Ядуць сваіх не толькі скарпіёны,
Жывому — сонца. Вечнаму — прастор.

10. СТРАЛЕЦ

Жывому — сонца. Вечнаму — прастор.
Сцэнарый-лёс паклікае на сцэну —
Ляцім стралой запаленай у цемру,
А там — іграй жыццё сваё, актор!

Забудзь на дэкарацыі, убор,
Відовішча гульні святла і ценю —
Сапраўднасць рушыць
прывідныя сцены,
Каб зладзіць душаў велічны сабор.

Прырослы бруд выпальвае пакута,
Трывай, Стралец,
як хочаш быць раскутым!

Пакінь гурму, як воўчую гайню,
На плошчы не звяртаюцца да Бога.
Каб навучыцца вышняму ў зямнога —
Памкнёныя скараюць вышыню.

11. КАЗЯРОГ

Памкнёныя скараюць вышыню.
Не пачынай нічога з кіслай мінай,
Бо там, дзе не памкненне, а павіннасць
—
Страх нараджае слізкую хлусню.

Зірні наўкол — нібыта ўпершыню,
Мы ўсе тут — на гадзіннікавай міне.
Хто бавіць час у мроі ды ўспаміне —
Прачнецца каля згаслага агню.

Мой светлы друг, пакінем забыццё,
Струхлелым хлудам — грэбуе касцёр.

Зайздросліваму трэба шмат чаго,
Ды багацей — не той, хто нешта мае,
А той, хто можа ўзяць, што пажадае,
Таму насмелься прагнуць усяго.

12. ВАДАЛЕЙ

Таму насмелься прагнуць усяго,
Што толькі гэтак зрушыш ад парога
Туды, дзе непатрэбна анічога,
Акром пазнання Бога аднаго.

Але на свеце меж і берагоў
Знайсці ў бяскрайнасць
трудную дарогу —
Чысцейшаму ад весняга разлогу
І ранку навароджаных снягоў.

Свабодай вызначай напрамак руху,
І там, дзе ўчуе сэрца, а не вуха,

Ты ўведаеш: і шчасцем, і бядой
Наносяцца аднолькавыя раны.
Не мітусіся, каб не зблытаць збаны
З жывой вадой і мёртваю вадой.

13. РЫБЫ

З жывой вадой і мёртваю вадой
Дзве Рыбы прапануюць нам знаёмасць,
З якіх адна імкнецца ў невядомасць,
Куды зусім не хочацца другой.

У кожным з нас хоць трошкі
ёсць ад той,
Што далеч захапляючы ў свядомасць,
Парваўшы пупавіну аксіёмаў,
На сушу выйшла з хваляю марской.

Ганец глыбінь да высяў, воін духу,
Цяпер прайдзі "па мору, як па суху" —

На покліч тайнаў, большых ад зямных,
Лаві прыцяг інакшых зор і светаў,
Пакінь разлік — наш Творца
быў Паэтам —
І хай палёт твой не захопіць дых.

14. ЗМЕЯНОСЕЦ

І хай палёт твой не захопіць дых,
Як там не знойдзеш слоў
і разуменняў, —
Яны патрэбны тут, дзе лёс і цемень
Мяжуюць нас на грэшных і святых.

Няма апораў у вышынях тых,
Калі зірнуць адтуль — мы летуценні
Саміх сябе... Ну, што ж, абы не цені,
Хай будзе светла ў далечах тваіх!

Ты сам — ёсць шлях,
а сэнс жыцця — Жыццё,
Даўнейшае за свет і небыццё.

Забудзь усё — і ўспомніш пад канец:
Каб новае магчымасці пачацца,
У кожным мігу ёсць адсутнасць часу.
Замкні былое з прышласцю ў вянец.

15. ЗМЕСТ

Замкні былое з прышласцю ў вянец,
Не спачывай на лаўрах, як і ў марах,
Усё святое — нам даецца дарам,
Ды ўзяць той дар не кожны з нас умец.

Не дазваляй душы сваёй змарнець,
Бяжы ад тых, каго ты вабіш марна,
Ды не цягні з мінулага нагару,
Пільнуй, каб быў нязгасным каганец.

Дзе шчасце — наш прапылены закутак,
Прырослы бруд выпальвае пакута.

Мой светлы друг, пакінем забыццё,
Свабодай вызначай напрамак руху,
Ганец глыбінь да высяў, воін духу,
Ты сам — ёсць шлях, а сэнс жыцця —
Жыццё.

Проза

ДЗВЕ НАВЕЛЫ

Уладзімір СЦЯПАН

ЧОРНЫ БІРС

Калі стары мужчына папраўляе плед, ці пачынае памешваць гарбату ў вялікім кобальтавым кубку — крэслагушкалка спалохана ўздыхае і рыпіць. Моцна запараная гарбата віруе, мельхіёравая пачарнелая лыжачка ў няўклюдных пальцах ценькае па сценках кубка, а потым кладзецца на сподак. Мужчына робіць глыток і заплюшчвае вочы. Пасля глытка гарбаты ён сядзіць нерухома: цьмяны, змрочны, засяро джаны.

Рыпіць адчыненая фортачка, за вакном падае снег. У пакоі цёмна, сутонліва. Пад фортачкай, на падваконні, стаіць невялікая алюмініевая місачка з пракіслым малаком.

Мужчына ўздрыгвае і шэры плед спаўзае, падае на стаптаны дыван. На твары гаспадара кватэры з'яўляецца ўсмешка, адначасова вінаватая і паблажлівая. Ён дапівае халодную несалодкую гарбату і апускае руку, асцярожна ставіць кубак на падлогу побач з крэслам.

Праграмы па тэлевізары скончыліся і на чорна-белым экране сыплецца электронны снег. Мужчына глядзіць на вакно, потым на экран і не знаходзіць ні жадання, ні моцы, каб падняцца, націснуць кнопку і спыніць надакучлівую мітусню, чорна-белую пацяруху.

Ён засяроджана чакае, пагойдваецца ў расхістаным крэсле, прыслухоўваецца да цішыні, якая запаўняе кватэру, да вуркатання вады ў радыятары, да галасоў на вуліцы. Але ўсе гэтыя гукі яго не радуюць. Ён ужо колькі дзён не намыльваў твар, не шоргаў лязом па скураным пасе, а таму густая шчэць патрэскваe пад пальцамі...

Звыклы расклад жыцця зруйнаваўся пасля таго, як ён усвядоміў, што чорны з белай пысай кот па мянушчы Бірс знік з дому. Спачатку мужчына не надаў гэтаму ўвагі. Сышоў і сышоў, вернецца — пабегае па вуліцы, нацешыцца воляй, згаладаецца і вернецца. Такое ўжо было, па некалькі разоў на год Бірс знікаў. Саскокваў праз фортачку на таполю, а з яе злазіў на зямлю. Дні праз тры-чатыры вяртаўся. Звычайна ўскудлачаны, брудны, але спакойны, задаволены жыццём. І тады ўсё ішло па завядзёнцы — мужчына жыў сваім жыццём, а кот сваім.

Цяпер тое жыццё згадваецца як сон: лёгкі і прыемны. Больш за ўсё Бірсу падабалася сядзець на шырокім падваконні і глядзець праз шкло на вуліцу. Амаль бязгучная спрытная жывёла ўспрымала кватэру на другім паверсе як сваю нару, а яго — гаспадара, як істоту, якая мусіць даваць ежу, мяняць у місачцы ваду, прыбіраць.

Раней чалавеку здавалася, што ён нічым не абавязаны кату, абсалютна нічым. Ён нават сварыўся на Бірса, адштурхоўваў, адкідваў нагой, калі той круціўся каля лядоўні, шкроб яе кіпцюрамі, княваў, прасіў пачастунку.

Увогуле мужчына лічыў ката абавязаным сабе жыццём, і, зрэдку, калі быў у гуморы, казаў: "Ты, Бірс, не жыў бы на гэтым свеце, не лавіў бы мух, не драў бы галубоў на балконе, каб не я!" Кот хаваўся пад стол ці крэсла і пазіраў жоўтымі вачамі, калаціў па падлозе хвастом. А гаспадар працягваў: "Злуешся? Не дам есці — адразу лагодным станеш, не верыш?.."

Мужчына шчыльней захутваецца ў плед, падсоўвае азяблыя рукі пад пахі і пазяхае. У пакой праз наросхрыст адчыненую фортачку залятаюць снежынкі і, дакрануўшыся падваконня, растаюць. З падваконня падаюць на фарбаваную сурыкам падлогу цяжкія кроплі, і каля радыятара збіраецца лужынка. Падзенне кропель бязгучнае і толькі па ўсплёсках святла можна здагадацца пра лужынку. Але яго не хвалюе, што ў кватэры холадна, што край дывана мокры, што на раме ляжыць і паступова растае снег. Ён глядзіць на вакно і ўсё яшчэ спадзяецца, што на таполі з'явіцца Бірс, што драпежна ўспыхнуць зялёныя вочы, што кот бязгучна скокне з дрэва на раму, а потым на падваконне і завуркоча: радасна і драпежна. Цямнейшы за цень, чарнейшы за начное неба, мокры, засыпаны снегам вялікі кот вернецца да яго, да немаладога, хворага, самотнага і няшчаснага. Толькі цяпер, калі кот знік, мужчына адчуў, усвядоміў, што ён самотны і няшчасны, і што адзіны, каму ён патрэбны, гэты чорны кот Бірс. Гэта адкрыццё не прынесла ні абурэння, ні крыўды, ні радасці. Мужчына проста згадаў пражытыя гады і не ўбачыў за спінаю яркага святла: сутонлівыя прыцемкі, аднастайныя, як ранішні ці вечаровы туман, панавалі ў мінулым...

Калі б раней, гадоў восем таму, хто-небудзь сказаў, што ён будзе так моцна перажываць з-за ката — мужчына засмяяўся б у адказ, скрывіў бы свой тонкі рот. Ён нават не перажываў, калі жонка, з якой яны пражылі семнаццаць гадоў, сабрала свае рэчы і сышла. Ён успрыняў гэта спакойна, нават з прыхаванай радасцю, са спадзяваннем на лепшае. Падумаў будзённа і проста, як пра святло, якое згасла раптоўна і па невядомай прычыне, ці як пра знікненне гарачай вады. "Вернецца... Паходзіць, паходзіць і вернецца..." Але жонка не прыйшла ні праз тыдзень, ні праз год. і ён прызвычаіўся жыць адзін, прызвычаіўся спадзявацца толькі на сябе самога, на ўласныя сілы. Зразумела, што час ад часу з'яўляліся ў па-халасцяцку чыстай кватэры жанчыны. Яны пакідалі пасля сябе адно пах парфумы і поту, якія хутка знікалі, змешваліся з пахам старых часопісаў на паліцах і рэчаў, акуратных, нібыта падрыхтаваных на продаж. Зрэдку жанчыны пакідалі, ці забывалі якую драбязу ў яго кватэры, але, як ні дзіўна, ніколі не вярталіся. І ён радаваўся таму, як проста і лёгка ўсё атрымліваецца, як вольна зрабілася ў пакоях, радаваўся цішыні і адзіноце, так, як радаваўся спачатку жаночаму голасу на кухні, бразгату посуду, шуму вады ў прыбіральні ці ванным пакоі...

След ад правай рукі і пляча на блакітных шпалерах нагадвае пасму туману, які нерухома вісіць і хавае пад сабой дробныя ультрамарынавыя кветачкі. Гэты след пачынаецца ад спачывальні, цягнецца праз калідор і абрываецца на вушаку прыбіральні, побач з выключальнікам. Гэты след — шлях, ранішні ці начны маршрут старога чалавека па сваёй кватэры.

Упершыню сэрца схапіла раптоўна, і ён добра памятаў вечар. Ён ішоў да тэлевізара, каб паглядзець вячэрнія навіны. Ад нечаканасці нават выпусціў акуляры і яны ўпалі пад ногі, сціснуўся, застыў на месцы і не здолеў, хоць вельмі хацеў, уздыхнуць на поўныя грудзі. Ён так і стаяў побач з тэлевізарам, прыціскаў далонь да грудзей і прыслухоўваўся да перарывістага тахкання. Сэрца балела вечар і ўсю ноч. На раніцу давялося ісці ў паліклініку. Легчы ў бальніцу мужчына адмовіўся, чым моцна здзівіў доктара. Зрабілі ўкол, выпісалі таблетак, доктар параіў быць асцярожным. Праз год ён перастаў адчуваць левую нагу. Па вуліцы хадзіў з кавенькай, а па кватэры так: абапіраўся рукой ці плячом на сцяну і няспешна сунуўся з пакоя ў пакой.

Упершыню, калі прыхапіла сэрца, Бірс быццам адчуў, што гаспадару кепска, і лёг да яго на ложак. Кот ціха вуркатаў і дазваляў гладзіць сваю мяккую поўсць, дакранацца да пярэдніх лапаў з прыхаванымі кіпцюрамі. Гэта было шэсць гадоў таму, на прыканцы студзёнага і мокрага лістапада, калі за вокнамі скавытаў вецер, а дождж і таполя шаргацелі, шкрабліся па шыбе і карнізе, хісталіся, як у п'янага ў вачах...

Мужчыне падалося, што ён чуе знаёмае каўканне. Ён хітае галавой, страсае, адганяе сон, шчыльней захутваецца ў плед і пачынае глядзець на шкло. Бязважка сыплюцца буйныя сняжынкі, рыпіць фортачка. Таполя чарнее за шклом. Зноў падалося — пакрыўджана ўздыхае.

Тыдні два таму ён ішоў у краму і на аўтобусным прыпынку яго ўвагу спынілі аб'явы, налепленыя на аўтобусны слуп. Не ўсе аб'явы, а толькі адна. Мужчына колькі разоў перачытаў яе, а калі вярнуўся дадому, узяў сшытак і напісаў дзесяць аб'явак.

"У мяне прапаў кот. Чорны, з белай плямай на галаве. Прашу вярнуць за ўзнагароду". Потым напісаў тэлефонны нумар і адрас. Выйшаў ноччу на вуліцу, хаваючы сорам, расклеіў аб'явы на тралейбусным і аўтобусным прыпынках, на дзвярах пад'ездаў, на сцяне хлебнай крамы...

На наступны дзень у дзверы пазванілі. У парозе стаялі дзяўчынкі. Адна трымала на руках вялікага, жаўтавокага чорнага ката. Гэта быў не Бірс, але мужчына з хваляваннем, ад увагі да сябе, стаў тлумачыць і расказваць, як выглядае яго кот. Дзяўчынкі слухалі, згодна хіталі ў адказ, міргалі чыстымі, як шкло, вачамі. Тая, што трымала чорнага ката, калі даслухала, выпусціла яго з рук. Кот засычэў і кінуўся ўверх па сходах. "А я думала, што гэта ваш. Ён ужо тыдзень жыве ў нашым пад'ездзе..." "Не, мой прыгожы і не такі кудлаты. Вочы ў майго Бірса зялёныя, а не жоўтыя". Мужчына падзякаваў, дзяўчынкі сышлі. А на развітанне меншая расказала-пахвалілася, што ў яе таксама знік кот, а калі, аж праз месяц, яна яго знайшла — кот быў худы, як лінейка, і на рукі не ішоў.

Яшчэ колькі разоў дзеці прыносілі катоў і кацянят, злоўленых у пад'ездах, сутарэннях і каля сметнікаў. Зрэдку званіў тэлефон, цікавіліся памерам узнагароды за чорнага з белай плямай ката, а аднойчы незнаёмая жанчына з прыемным голасам прапанавала купіць яе абрыкосавага пароднага перса...

Сем гадоў таму немаладая суседка з кватэры насупраць перастрэла мужчыну на лесвіцы і, як заўсёды, пасля неабавязковай размовы пра надвор'е, пачала скардзіцца на ўнукаў. Хлопцы прынеслі дахаты старую кошку, а яна ўзяла ды акацілася проста ў кухні, пад газавой плітой. І яна, суседка, не ведае, што рабіць з тымі кацянятамі. Мужчына скрывіў тонкі рот і даў простую параду — кацянят утапіць. Суседка колькі маўчала, а потым згодна захітала, прызналася, што і сама думала менавіта пра гэта, менавіта пра такое простае выйсце. Але ўся цяжкасць была ў тым, што суседка нават жывую рыбу не магла чысціць, а не тое што тапіць кацянят. Мужчына знізаў плячамі і зайшоў у суседскую кватэру. Жанчына вынесла кошку на балкон, зачыніла дзверы і стала пры іх з выглядам, што яна зрабіла самае цяжкае. У яе вачах быў спалох і лёгкі недавер. Зразумела, яна ўсё жыццё пражыла ў горадзе, працавала настаўніцай геаграфіі, і ніколі тапіць кацянят ёй не даводзілася.

Мужчына адчыніў прыбіральню, а потым у кухні апусціўся перад плітой на калені і выцягнуў скрыню, у якой ляжалі кацяняты. Іх было пяць, усе рознай масці, але з аднолькавымі блакітнымі вачамі. Кацяняты драпаліся, каўкалі. Ён браў па адным і насіў у прыбіральню. Пускаў ваду, а потым вяртаўся і чакаў, калі вада набяжыць у бачок. Суседка моршчылася, але вочы былі сухія, яна адно спалохана прыслухоўвалася, ці не з'явіліся ў калідоры ўнукі.

Калі мужчына трымаў у руцэ апошняе кацяня, чорнае, з белай плямай на галаве, і ўжо збіраўся рушыць у прыбіральню кінуць яго ва ўнітаз, жанчына ўздыхнула. "Што, можа гэтага пакінуць?" — крыва пасміхнуўся ён. Суседка адвярнулася і адмоўна хітнула галавой з пучком сівых валасоў на патыліцы...

Мужчына і сам не ведаў, чаму затрымаўся. Гэтая затрымка і ўратавала ад смерці пятае кацяня...

Ён вярнуўся ў сваю кватэру, пагрэў малака і пачаў карміць маленькую істоту, прыслухоўвацца да ледзь чутнага каўкання...

Мужчына і кот, па мянушчы Бірс, жылі разам сем гадоў. Зрэдку чалавек сварыўся, не дазваляў кату заскокваць на стол, не дазваляў тачыць кіпцюры аб шпалеры... Але калі гаспадар не бачыў, Бірс уставаў на заднія лапы і дзёр калідорныя сцены, пакідаў глыбокія шнары і драпіны. Блакітныя, у клетачку, шпалеры віселі лахманамі, як кара на бярозе, і ён нічога не мог зрабіць, акрамя як насварыцца ды выгнаць Бірса на зашклёны балкон. Увечары балкон адчыняўся, і кот заскокваў у кватэру, кідаўся да сваёй місачкі, а калі яна была пустая, то пакрыўджана каўкаў і цёрся аб ногі гаспадара...

Тры тыдні таму Бірс скінуў з тумбачкі вялікі кобальтавы кубак з гарбатай. Адбілася ручка. Мужчына пасапраўднаму раззлаваўся, а кот спалохаўся, пакрыўдзіўся і збег праз фортачку на вуліцу.

Мужчына амаль гадзіну корпаўся, але прыклеіў ручку так добра, што нават не было відаць расколіны. Цяпер той самы кубак стаіць побач з крэслам-гушкалкай, а вось Бірса няма. Не ляжыць на стаптаным дыване чорны кот, утульна падкурчыўшы пад сябе лапы.

Мужчына хіснуўся ў крэсле, яму падалося, што кот ускочыў да яго на калені. На тонкіх губах з'явілася паблажлівая і адначасова вінаватая ўсмешка.

Чарнейшы за начное неба кот спрытна ўскараскаецца на таполю. На пульхным снезе застанецца ланцужок слядоў. З дрэва чорны кот пераскочыць на фортачку. Зірне на алюмініевую місачку даўно пракіслага малака. Акуратна абыдзе лужыну на падлозе. Амаль бязгучна каўкне і ўскочыць на калені да гаспадара. Крэсла-гушкалка хіснецца: плед ссунецца на падлогу. У нерухомых вачах мужчыны адаб'ецца экран тэлевізара з аднастайным мігценнем электроннага снегу.

МАРА

Я не веру ў прывіды і здані, пра якія любяць расказваць і якімі палохаюць у маім гарадку малых дзяцей. Не веру, што за вуліцай Узбярэжнай, на лузе, час ад часу можна ўбачыць чорнага шалёнага сабаку, які разам з гаспадаром з'яўляецца на світанні. Але дакладна ведаю, што жанчыны баяцца па восені выводзіць на луг сваіх коз і авечак...

Адзінае параўнанне, якое падаецца трапным, калі згадваю Антона Кошаля, — гэта выдраны хворы зуб. Вялікі, жоўта-карычневы з глыбокімі расколінамі, жахлівы ў сваёй рэальнасці, зуб. Цяжка вытлумачыць, чаму не палец, не вока, не птушка ці дрэва... Можа, таму, што выдраны зуб больш не патрэбны, што боль суняўся, а пакуты скончыліся.

(Працяг на стар. 10-11)

РАЗ'ЕЗД НА РАЗВІТАННЕ

Альтэрнатыўны тэатр развітаўся з гледачамі да восені. Фестываль "Тэатральны раз'езд" з 12 па 21 чэрвеня сабраў і адданых прыхільнікаў, і спанатраных тэатралаў, і калегаў — тэатральных дзеячаў, і нават крытыка з братняй, але такой замежнай цяпер Эстоніі Барыса Туха. Менавіта Барыс перасцярог тэатр ад небяспекі зрабіцца... раз'язным. Ад небяспекі? Ну, хіба ў сэнсе таго, што калі шмат ездзіш па гастролях ды размаітых фэстах, дык няма калі абнаўляць свае пастаноўкі, бавіцца ў вытанчанасці, асабліва дбаць пра эстэтыку. На сустрэчах з крытыкамі альтэрнатыўнікі былі ўжо дамовіліся не ўжываць тэрміна "постмадэрнізм" для абазначэння іх культурніцкай дзейнасці, але як было не ўжываць гэты славуты і навязлы ў зубах цэтлік-характарыстыку?

За тыдзень "Тэатральнага раз'езду" альтэрнатыўнікі, паводле завядзёнкі, паказалі ўсе свае спектаклі, прадставілі прэм'еру "Моцарт і Сальеры" паводле Аляксандра Пушкіна (у ролях выступілі Ігар Забара і Яўген Жураўкін), замацавалі нядаўні прэм'ерны поспех "Тэатра Антошы Чэхантэ" паводле ранняга Чэхава (у ролях былі занятыя Святлана Нікіфарава, Артур Шуляк, Алег Корчыкаў ды Ігар Забара). Меліся былі назаўжды развітацца са спектаклем "Agnus Dei" паводле "Гондлы" Мікалая Гумілёва, але, відаць, знойдуцца іншыя варыянты рашэння: надта ўжо хораша адбыўся гэты апошні паказ, надта ўжо бракуе публіцы светлых, узнёслых, адкрыта рамантычных уражанняў. А вартасці работ Яўгена Жураўкіна (Гондла), Святланы Нікіфаравай (Лера-Лаік) ды Артура Федаровіча (Лаге) сведчаць пра адметныя акцёрскія магчымасці працы з падобным матэрыялам. Цяпер, як выказалася адна з крытыкаў, мусіць... прыйсці рэжысёр і паставіць спектакль...

"Тэатральны раз'езд" напраўду мусіў скончыцца раз'ездам. Трупа тэатра выпраўляецца на фестываль "Херсанескія гульні" ў Севастопаль, а ў жніўні, калі ўсё складзецца паспяхова, яе прыме Эдынбургскі фестываль мастацтваў (Вялікабрытанія).

Жана ЛАШКЕВІЧ

На здымку: Артур Федаровіч (Лаге), Яўген Жураўкін (Гондло) і Святлана Нікіфарава (Лера-Лаік) у спектаклі "Agnus Dei" паводле Мікалая Гумілёва. Фота Галіны МАСКАЛЁВАЙ

МАЛАДЗЁЖНЫ ЦЭНТР "ГАРМОНІЯ"

У Баранавічах добра ведаюць маладзёжны цэнтр "Гармонія". Гэта з яго ўдзелам арганізуюцца ў горадзе забаўляльныя конкурсы, цікавыя шоу-праграмы і розныя святы. Пры цэнтры працуе некалькі творчых калектываў. Рытм-група "Дэбют" — адзін з іх. У яе рэпертуары — агністы кан-кан і марудны блюз, любімае многімі танга і танцы Усходу.

На здымку: у "Дэбюце" танцуюць Ірына Сас, Наталля Чабатар і Ніна Шалік.

Фота Рамана КАБЯКА, БЕЛІНФАРМ

ВАЛЕРЫЙ МАЗЫНСКІ: "ЭКСПЕРЫМЕНТ ВЫМАГАЕ ДОСВЕДУ"

Каірскі фестываль эксперыментальных тэатраў, які Егіпет ладзіць ужо сёмы раз запар, і сёлета жадае бачыць сярод сваіх гасцей тэатр-лабараторыю нацыянальнай драматургіі "Вольная сцэна" са спектаклем "Галава" Ігара Сідарука. І сёлета — таму што летась дакументы трупы захраслі дзесьці на афармленні ў Маскве. Ужо вядома, што першага верасня на адкрыццё ў Каір беларусы не трапляюць (бо самалёт раз на тыдзень). Невядома зусім, ці трапляюць увогуле, бо не знойдзены грошы на білеты. Сітуацыя смешная і да болю родная. І тым не менш наш каірскі рупліўца доктар Анвар Ібрагім замаўляе для фестывальных спатканняў і знаёмстваў інтэрв'ю з ВАЛЕРЫЕМ МАЗЫНСКІМ, мастацкім кіраўніком бальшыні тэатральных эксперыментаў на Беларусі. І беларускі чытач мае магчымасць апярэдзіць любога фестывальнага шчасліўчыка...



— Валеры Яўгенавіч, ці мела я рацыю, сцвярджаючы, што ваш тэатр наўрад ці мае аналагі ў свеце?

— Пэўна. Эксперыментальная ўжо сама ідэя адкрыцця падобнага тэатральнага ўтварэння, перадусім прызначанага для працы з драматургіяй. І з тымі пачаткоўцамі, які адважыліся ёю захапіцца. З тымі, хто не дужа ўяўляе, як гэта ходзяць па сцэне ды прамаўляюць; з тымі, хто яшчэ не асвойтаўся з законамі тэатра. Мы працуем у самых розных кірунках. Калі ёсць адна, дзве, тры сцэны, або адметны маналог, або відавочна займальная фабула і г.д. — не адмаўляем.

Шукаем рэжысёра, чытаем, — для аўтара, як паказвае практыка, вельмі важнае само застольнае чытанне. Драматург-сучаснік, як ні дзіўна, не навучаны, не прывучаны прамаўляць кожную прыдуманую рэпліку, стасуючы яе з падмосткамі.

— Не раздражняе вас, што бальшыня аўтараў — людзі не тэатральныя?

— Але гэта, на жаль, натуральна. Для шмат каго тэатр — сяганне ў інтэлект, свайго роду праект інтэлектуальнай рэалізацыі, інтэлектуальнага імкнення, а не вынік інтэлектуальнага назапашвання. Дагэтуль ёсць падзел між тымі, хто ў нейкім пакаленні гарадскі жыхар, і тымі, каго ўчора-заўчора адпусціла вёска. "Вольная сцэна" ўжо вызначаецца тым, што вакол яе зацікаўлена таўкуцца маладыя людзі — пішучыя людзі. Можа стацца, што сам тэатр хутка запрэтэндуе на ролю адметнага культурніцкага асяродка. Трэці год запар па два разы на год мы ладзім лабараторыі — чытаем, разыгрываем, запрашаем да ўдзелу. Рэжысёры, знаёмыя з п'есаю чатыры-пяць дзён, мусяць прадставіць яе вырашэнне і тлумачэнне (эксплікацыю); дзве-тры вырашаныя сцэны даюць зразумець, што з сябе ўяўляе будучы сцэнічны твор, як абыходзіцца з творам драматургічным і да т.п. Ёсць ужо два спектаклі, што нарадзіліся пасля такіх чытанняў-разыгрываннаў. Асабіста для мяне, як для кіраўніка тэатра, гэта радасць невымоўная, калі акцёры і рэжысёры пагаджаюцца працягваць працу, спадзеючыся, што адбудзецца нешта на сцэне...

— А раптам не адбудзецца?

— Бывае — не адбываецца. Былі спектаклі, якія прайшлі ўсяго два-тры разы. Мы запрасілі аўтара, прааналізавалі, запісалі ўсё на відэастужку, і на гэтым — канец. Праўда, ёсць выпадак, калі спектакль падтрымалі гледачы, не зважыўшы на наш, прафесійны, пункт гледжання.

— Якая пэўная вартасць ад вашай практыкі беларускай рэжысуры?

— Я не захапіў права ставіць усё, што прыходзіць у тэатр. Мне важна, каб на кожную новую пастаноўку з'яўляўся новы рэжысёр. Гэта было б ідэальна. Як аказалася, якраз рэжысёр, эксперыментуючы, мусіць быць вельмі і вельмі дасведчаным прафесійнікам. Пачаткоўцу-драматургу, а часам і пачаткоўцу-акцёру мусібыць прадэманстравана налаўчонасць, абазнанасць,

ДЗВЕ НАВЕЛЫ

(Пачатак на стар. 9)

Згадваецца луг з купкамі алешніку, бясконцы луг, які патанае, хаваецца ў сувоях цяжкага туману, і постаць Антона Кошаля: ватоўка, падобная да залітага, раскіданага вогнішча, вастраносы твар, касцісты, шэры з брудными глыбокімі зморшчынамі, ускудлачаныя пасмы валасоў і доўгія цёмныя рукі. Мужчына спатыкаецца і кідае ў туман абгрызены альховы кол, а потым чуецца нутраны, як з калодзежа, голас: "Бяры! Бяры! Хапай!" Па купінах з рыканнем скача вялізны кашлаты сабака тарфянага колеру, з ашчэранай пашчы падае на траву вязкая сліна. Гэта Мара, злосная і неўтаймаваная, яна баіцца і слухаецца адно Антона. Мара вяртаецца да гаспадара. Антон хапае пагрызены кол і пачынае выдзіраць яго з пашчы Мары. Гаспадар і сабака доўга змагаюцца. Усё вырашае ланцуг, якім Антон выцягвае Мару. Сука скавыча, качаецца, залізвае лапу, а Антон брудна лаецца. Потым усё паўтараецца: узмах і альховы кол ляціць у туман. Мара кідаецца за ім, а ўслед чуецца крык: "Хапай! Бяры яго, бяры, Мара!"

Калі Антон Кошаль забаўляўся са сваёй выхаванкай, суседзі па вуліцы не выводзілі на луг коз. Яны стаялі ў дварах і пакорліва чакалі, калі ж нарэшце змоўкне брэх і сціхне лаянка, а гаспадар дома нумар сем па вуліцы Узбярэжнай сыдзе, каб навязаць у двары, як многія лічылі, шалёную Мару. Антон вяртаўся, на хаду выціраў няголены ўспатнелы твар, а Мара бегла поруч, праваруч ад яго. Пазвоньваў ланцуг. Мара была гатовая кінуцца на кожнага, толькі загадай, але гаспадар маўчаў, глядзеў сабе пад ногі. Ён увогуле быў негаваркі і адно, з кім любіў весці размовы, дык гэта з сабакам...

Антон Кошаль піў штодня, другі на яго месцы даўно б памёр, а вось Антон жыў. Надсвітку выходзіў на ганак, накідваў на плечы падраную ватоўку, адвязваў Мару і басанож цягнуўся на луг. Зрываў колькі яблыкаў і з хрустам пачынаў грызці, а Мара падскоквала, апярэджвала гаспадара, гойсала па бульбоўніку і хрыпата брахала.

Ні дзяцей, ні жонкі ў Антона не было. Ён жыў з маці. Яго бацька памёр пасля таго, як на станцыі выпіў разам з двума грузчыкамі тэхнічнага спірту. Ён нават не дайшоў дадому, сканаў па дарозе ў высокім сумёце. Апрогся, як казалі ў гарадку. Антону тады было сем гадоў і на пахаванні ён не плакаў, а дзіка смяяўся праз сціснутыя зубы, чым моцна здзівіў і напалохаў сваякоў і суседзяў, якія сабраліся на памінкі. Дзіцёнак супакоіўся і перастаў рагатаць толькі пасля таго, як яму ўлілі ў рот чарку віна...

Антонава маці замуж не выйшла.

Прайшло гадоў сем і жанчына страціла надзею, што яе жыццё можа змяніцца да лепшага. Запалоханая, з цёмным тварам, абыякавая амаль да ўсяго, жанчына існавала на гэтым свеце нікому не патрэбная, нават уласнаму сыну. Яе пакорлівае існаванне выводзіла Антона з сябе, прымушала вар'яцець. Ён сціскаў кулакі, гатовы кінуцца на маці, як на клятага ворага.

Нават мужчыны, якіх у гарадку паважалі, — і тыя не асмельваліся вучыць Антона Кошаля "жыць". Усе, і дарослыя, і дзеці, добра памяталі, што адбылося з Юзікам Мікіценкам, калі ён перастрэў на вуліцы цвярозага Антона і пажартаваў са спадзяваннем, што ў адказ пачуе таксама жарт. Потым Мікіценка пераконваў і сто разоў паўтараў, што ў яго і ў галаве не было, каб пакрыўдзіць хлопца, але гэта было потым. А ў той дзень Юзік кульгаў сабе да аптэкі ды мармытаў пад нос праклёны на гультайку жонку. Ён і думаць не думаў, што насустрач яму ідзе няшчасце: Яны сустрэліся каля бетоннага, выбеленага вапнай, карункавага паркана. Антон вяртаўся з аптэкі, дзе яму не прадалі таблетак. "А што гэта ты, Антон, цвярозы?" — адно, што паспеў спытаць кульгавы пяцідзесяцігадовы мужчына ў семнаццацігадовага хлопца. Антон заскрыгатаў зубамі, збіў з ног Мікіценку, кінуўся на яго, прыціснуў да зямлі і пачаў душыць. Юзік неяк выслізнуў з учэпістых рук Антона, але адпаўзці не паспеў. Антон схапіў яго за валасы і пачаў біць галавой аб зямлю. На вуліцы былі людзі, ушчаўся гвалт. Кошаль запіхваў Юзіку ў рот старую скураную пальчатку. Іх ледзь здолелі расцягнуць. Мікіценка хаваўся за спіны мужчын, выплёўваў выбітыя зубы і стагнаў, а Антон паабяцаў, што калі Юзік яшчэ раз адкрые рот, то яму

упэўненасць — школа. Быў выпадак, калі знаны мэтр Валеры Раеўскі адкрыў на нашай сцэне для сябе... сябе. Як педагог Акадэміі мастацтваў ён проста не чакаў ад сябе такога імпэтнага імправізавання, такой захопленай працы над тэкстам і паваротамі сюжэта. Бо, вядома, з драматургіяй яму можна было рабіць... шмат.

— А як гарманізуюцца славутыя дачыненні тых, хто ставіць, і тых, хто выконвае задачы ў эксперыменце?

— Падчас чытання п'есы валадарыць воля драматурга. На пляцоўцы пануе рэжысёр. Па першым часе я наіўна прасіў, каб ён, рэжысёр, не далёка адыходзіўся ад аўтара, не імкнуўся абавязкова пераніцаваць таго на свой капыл, не абвастраў дачыненняў, але пераканаўся, што гэткая памяркоўнасць — шкодзіць. Трэба змірыцца з тым (як з аксіёмай), што ніколі п'еса і спектакль паводле яе не будуць, мовім агрублена, адным і тым самым; праца над п'есаю і праца над спектаклем ніколі не дадуць аднолькавы вынік. Нават тады, калі п'есы піша рэжысёр, або спадар драматург сядзіць на кожнай рэпетыцыі (як у нас) і мае права і магчымасць злавацца, абурацца, прасіць, маліць, выбягаць з залы, вохкаць або сцішана перажываць. Урэшце, нашы спектаклі робяцца агульным досведам усіх, хто ўдзельнічае ў рэпетыцыях.

— Сусветны тэатр ужо не першы год (сярод усяго) выразна галінуецца на відовішча, што абыходзіцца зусім без тэксту, і на дзеянне, пабудаванае, грунтаванае толькі на тэксце (нібы вяртаючыся ў эпоху, калі са сцэны перадусім прамаўлялі ў строях). Дзе сярод гэтых галін гнездзяцца вашы эксперыменты?

— Мы цалкам залежныя ад таго, што нам прапануюць сёння і заўтра. Нас радуе ўсё жывое, нешараговае, неабыякавае. Кіраваць асобаю творцы, я перакананы, немагчыма. Мы якраз адстойваем асобу, якая піша. Калі асобы няма, дык і гаворкі няма. Але пакуль мы — тэатр больш тэкставы, бо падстава нашага эксперыменту — драматургія. Слова. Было, аднак, што п'есу "Пеўчыя" рэжысёр амаль цалкам пазбавіў аўтарскага тэксту (увогуле пакінуўшы ад драматургавых намаганняў паўтары друкаваных староначкі сюжэта), а паводле ідэі зрабіў тое, у чым аўтар сябе не пазнаў і засупраціўляўся. У даным выпадку рэжысёр выступіў як аўтар усіх кампанентаў відовішча.

— А калі выбітнага тэксту бракуе твору, ці схільныя вы даводзіць яго да

гледача, беручы ў работу толькі сюжэт, ідэю і г.д.?

— Але. Надарылася аднойчы, што прапанаваная літаратура ўяўляла сабою малацікавы шэраг, але ідэя напісанага і нават эстэтыка, што праглядалася ў будучай пастаноўцы, давалі падставу для работы. І мы не прамінулі папрацаваць.

— Перадусім, трэба разумець, ваш эксперымент — у сутыкненні драматурга з рэжысёрам?

— Безумоўна. Акцёры — залежныя, але іхняя доля такая.

— Мабыць, гэта завельмі дарагая цацка — спектаклі, якім часцяком прызначана дайсці толькі да вузенькага кола публікі, выпрацавацца эксперыментальна, а потым — знікнуць?

— Тэатр — увогуле дарагая цацка. Нам дапамагаюць гуляць з ёю, спадзеючыся на досвед. Па досвед прыходзіць глядач, які, дарэчы, проста вымаг з нас, эксперыментальнага тэатра, пятнаццаці спектакляў на месяц (іграем з прыемнасцю). Досвед — неацэнны. Эксперымент можа грунтавацца толькі на ім.

Гутарыла Жана ЛАШКЕВІЧ

На здымку: Мікола Рабычын (Дурань) і Андрэй Кавальчук (Шукальнік) у спектаклі "Галава" Ігара Сідарука.

Фота Уладзіміра ПАНАДЫ і Уладзіміра РАБЦАВА

У ШЧЫЛЬНЫМ ЗВЯЗКУ З САХАРАЎЦАМІ

19 ліпеня пачнецца візіт у Мінск і Віцебск вядомага культуролага, аднаго з арганізатараў Эдынбургскага фестывалю мастацтваў, прафесара Рычарда Дэмарка. Перадусім трэба вылучыць ягонае шчыльнае супрацоўніцтва з Беларускім інстытутам па радыеэкалогіі імя А.Сахарава. Літаральна кожную мастацкую прапанову спадар прафесар суадносіць і ажыццяўляе ў рэчышчы памкненняў і зацікаўленняў Сахараўскага інстытута, ягоных супольных праграм з Кінгстан-універсітэтам у Лондане, дзе выкладае сам Рычард Дэмарка. Мэту гэтага візіту можна вызначыць як канчатковую адпрацоўку ўсіх праектаў беларускай праграмы, якая мае быць прадстаўлена публіцы Эдынбургскага фэсту на працягу жніўня.

На здымку: Рычард Дэмарка з актрысамі Альтэрнатыўнага тэатра, чый спектакль мусіць браць удзел у фестывалі.

Фота Алены ЕЖАНКОВАЙ

СПЯВАЧКУ ВІНШАВАЛІ СЛУХАЧЫ

Нэлі Багуслаўская — адна з першых "зорак" беларускай эстрады. Быў час, і не такі, здаецца, даўні, калі яе спевы, пазначаныя сапраўднай прафесійнай культурай і музычным густам, ці не штодня гучалі ў радыёэфіры. Прыхільнікам спявачкі даводзілася, хаця й нячаста, трапляць на канцэрты з яе ўдзелам... Нядаўна заслужаная артыстка Беларусі Н. Багуслаўская адзначыла свой юбілей. Здавалася б, у гэты дзень пра яе маглі ўспомніць толькі блізкія, сябры — бо мода на эстрадзе мяняецца хутка, і колішнія гучныя імёны ў лепшым выпадку робяцца радком гісторыі. Аднак — сустрэча са спявачкай адбылася ў той дзень у "жывым" радыёэфіры. Вядучая гутаркі Т. Песнякевіч літаральна не паспявала задаваць пытанні сваёй суразмоўцы, бо студыю апанавалі... радыёслухачы... Яны няспынна тэлефанавалі, віталі любімую спявачку, дзякавалі ёй за шчырасць і самаадданасць у мастацтве, звярталіся з самымі рознымі пытаннямі і, канечне ж, віншавалі з днём нараджэння. Раз-пораз гучаў з эфіру яе пранікнёны абаяльны голас, захаваны ў запісах самых розных лірычных песень. А яшчэ Н. Багуслаўскую віншавалі ў калектыве Дзяржаўнага канцэртнага аркестра Беларусі, дзе яна з нядаўняга часу працуе педагогам-рэпетытарам, імкнучыся перадаць малодым салістам-спевакам тыя прафесійныя сакрэты, дзякуючы якім беларуская эстрада вызначалася на сваім золку шчырасцю, высакароднасцю і патрабавальным густам.

С. ВЕТКА

больш не жыць...

Антонава маці спадзявалася, што войска зможа змяніць сына і ён вернецца іншым чалавекам. Яна напазычала грошай і зрабіла добрую вечарыну, на якой пагуляла ці не ўся моладзь гарадка. Але яна не паспела вярнуць пазыкі, як яе сын вярнуўся дадому. У вайсковым білеце быў запіс і пячатка, якія сведчылі, што Антон хворы і праходзіць службу не можа...

Здаецца, тройчы забіралі Антона Кошаля на прымусовае лячэнне ад алкагалізму, але марна. Ён вяртаўся змрочны і злосны на ўвесь свет, а больш на маці. Знаходзіліся сябры-таварышы і ўсё пачыналася зноў. Антон зносіў з дому рэчы, прадаваў, купляў гарэлку і піў. Ён казаў, што піць яму падабаецца і што дзень, калі ён цвярозы, пражыты дарма. У гарэлцы ён знаходзіў тое, чаго не хапала ў жыцці. На падпітку ён рабіўся спакойным, упэўненым, знікала злосць і лютасць. Піць ён умеў, ніколі не валяўся, не засынаў на лаўцы ў парку ці ў пад'ездзе, заўсёды вяртаўся дадому.

У гарадку адзін час пачалі казаць, што як мужчына Антон ні на што не здатны, што ён хоць і дужы, як той бык, але... Праўда, потым высветлілася, што прыцемкамі на Узбярэжную цягаецца і сыходзіць пад раніцу дачка загадчыка лазні, чырванатварая Люба, па мянушцы "Памідор", якая выглядала так, быццам была зляпленая з тузіна падушак. Любка-Памідор была знакамітая не толькі праз сваю нязводную юрлівасць, але і тым, што магла, не пераводзячы дыхання, выпіць з рыльца вялікую пляшку віна. Гэта яна і пахвалілася сваім сяброўкам, што лепшага мужчыны за Антона Кошаля ў гарадку няма. Каму каму, а ёй паверылі. Магчыма, каб не яе доўгі, развязаны танным віном язык, Антон Кошаль жыў бы з ёй... Але чуткі дайшлі да яе бацькі, і загадчык лазні з раніцы кінуўся да дома нумар сем па Узбярэжнай. Антон Кошаль сустрэў госця на ганку, у дом, дзе была Любка, не пусціў. Размовы не атрымалася. На пытанне, па-азіяцку мурзатага загадчыка лазні, ці збіраецца Антон жаніцца на яго дачцэ, Кошаль вырачыў збялелыя ад шалу вочы і сказаў, што і ведаць не ведае яго прыдуркаватую дачку... На наступны дзень загадчык звольніў з працы Антонаву маці, якая працавала прыбіральшчыцай на мужчынскай палове. А якая размова адбылася ў бацькі з дачкой, ніхто не ведаў, але Любка-Памідор зрабіла чарговы аборт, пра які ўсе ведалі...

Колькі разоў Антон з'язджаў з гарадка на заробкі — фарбаваць фасады будынкаў. Праходзіла лета, ён вяртаўся і пажадна накідваўся на гарэлку...

Антон прывёў са станцыі сабаку, сучку. Яна сама падышла да яго і ўзяла з рукі кавалак кілбасы. Яна дазволіла зашморгнуць на шыі пас, прывязаць шворку. Антон назваў яе Марай. Чаму ён даў такую мянушку кашлатай, змрочнай сучцы, ніхто не ведаў, а ён не тлумачыў.

Калі нехта з суседак пытаў у яго: "А чым ты будзеш яе карміць?", Антон ашчэрваўся ўсмешкай тапельца і сычэў: "А хай матчыну галаву грызе!"

Яго маці на той час ужо нідзе не працавала, яна ляжала хворая ў хаце, на жалезным ложку, і ціха стагнала, спалохана і пакрыўджана. На табурэтцы месціліся бутэлечкі з лекамі, талерка з ежай, кубак з малаком. Жанчына глядзела на суседку, якая асмелілася спытацца, на свайго сына, які стаяў у парозе, на вялізнага сабаку побач з ім і не магла вымавіць слова. Яна баялася, што сын можа нацкаваць звера і той кінецца, перагрызе горла, высмакча кроў, будзе лізаць сваім цёмным, як старая тарка, языком знявечаны твар.

Праз месяц Антонава маці пачала ўставаць і выходзіць на агарод. Яна падкопвала бульбу і насіла ў склеп. Мара ляжала на ганку, паклаўшы галаву на дужыя лапы, і насцярожана сачыла за кожным рухам жанчыны з кошыкам у руках. Вушы нашатарваліся, калі жанчына праходзіла побач. Грымеў ланцуг, Мара грызла жалеза, качалася, выкусвала блох...

Жанчына ўзненавідзела сабаку, але да часу хавала свае пачуцці. Праўда, колькі разоў яна спрабавала пачаць з сынам размову пра тое, што сабака ім не трэба і ад яго трэба пазбавіцца, узяць і прадаць. Адказ быў заўсёдны: "Маўчы, не твая справа. Яна будзе жыць тут, а калі не падабаецца, ідзі сама куды хочаш". Жанчына ад такіх слоў ніякавела. А Антон выходзіў на ганак, сядаў на бетонную прыступку. Мара падыходзіла да гаспадара і клала сваю цяжкую галаву яму на калені, лізала рукі, зазірала ў вочы. Мужчына моршчыўся, як ад нясцерпнага болю, запускаў пальцы пад ашыйнік, адшчоўкваў карабін. "Што, падабаецца, падла? Ну-ну, супакойся, сціхні, а то прымкну".

Антонава маці скардзілася суседцы, што яна зрабілася для сына чужой, а вось шалёную сучку ён гатовы карміць з лыжачкі. А ёй, роднай маці, якая выгадавала і корміць-даглядае, нават вады не падасць...

Так казалі суседзі.

Магчыма, жанчына вырашыла знішчыць сабаку раптоўна, а можа, доўга збіралася, рыхтавалася, гэтага, акрамя яе, ніхто не ведаў. Аднойчы, калі сын працаваў на станцыі, дзе разгружаў вагоны, яна атруціла Мару. Не ведаю, ці адчула яна палёгку, змешаную са спустошанасцю, пасля таго, як Мара колькі хвілін скавытала, ірвалася з ланцуга, пускала сліну, ванітавала і круцілася, як шалёная, на адным месцы. Жанчына адшчоўкнула карабін, калі сучка, ашчэрыўшы пашчу, выпрасталася каля ганка. Хто ведае, з якімі пачуццямі яна цягнула сабаку пад яблыню, дзе выкапала яміну...

Антон вярнуўся апоўначы. Пра што ён гаварыў з маці і ці гаварыў увогуле, невядома.

Ноччу Антон пабудзіў суседзяў і абвясціў, што яго маці памерла. У яго голасе не было ні жалю, ні абурэння.

Суседка, якая прынасіла Кошалям казінае малако, расказвала, што яна спачатку нават узрадавалася і сказала мужу: "Нарэшце пакуты скончыліся і гаротніца ціха адышла, бо колькі ж можна трываць такое жыццё!.." Тады нікому не хацелася падумаць, як усё адбылося на справе.

Нараніцу нябожчыцу памылі і апранулі. Прывезлі труну з папяровымі карункамі. Хаваць вырашылі заўтра. Ноч труна мусіла прастаяць у доме на засланай прасціной лаве. Суседкі разышліся па дамах.

Нараніцу дзверы дома нумар сем былі наросхрыст. Жанчыны ўвайшлі ў дом. У блакітнай труне на месцы нябожчыцы ляжала кашлатая, цёмная, як торф, Мара.

Антон Кошаль вісеў у дрывотні. Ён засіліўся на ланцугу. Ашыйнік з бліскучымі клёпкамі валяўся побач.

І яшчэ казалі, што Антонаў твар выглядаў так, быццам яго грызлі сабакі.

Антонаву маці знайшлі пад яблыняй. Высветлілася, што жанчына памерла не сваёй смерцю, а была задушана падушкай.

Гады тры дом нумар сем па вуліцы Узбярэжнай стаяў з забітымі вокнамі, а потым яго купілі і перавезлі, каб перабраць на лецішча, нетутэйшыя людзі.

ВЯСЕЛЬНАЕ СВЯТА

Беларускі народ па праву можа ганарыцца сваёй багацейшай абраднасцю, вуснай паэзіяй. Яна добра захавалася ў памяці народа і нярэдка актыўна бытуе, задавальняе эстэтычныя густы і нашага сучасніка. Але формы яе бытавання зараз адрозніваюцца ад ранейшых. Аўтэнтычны фальклор жыве ў параўнаўча невялікай частцы яго носьбітаў. З кожным годам усё цяжэй адшукаць таленавітых спевакоў і спявачак, казачнікаў і казачніц. З адыходам некаторых з іх у нябыт беззваротна страчваюцца надзвычайныя паэтычныя каштоўнасці. Вельмі важна, каб у духоўнай культуры развівалася пераемнасць: лепшыя традыцыі жылі ў маладых пакаленнях, адраджаліся і ўзнаўляліся народныя абрады і паэтычныя творы, якія адыгралі велізарную ролю ў фарміраванні этнічных асаблівасцей беларусаў і зараз абуджаюць нацыянальную свядомасць. Нельга пераацаніць значэнне фальклору ў выкананні прафесійных, самадзейных і этнаграфічных калектываў. Асаблівую каштоўнасць маюць выступленні аматараў вуснай паэзіі з мэтаю цэласнага ўзнаўлення традыцыйных абрадавых цыклаў.

З захапленнем глядзелі нядаўна ў зале філалагічнага факультэта БДУ сотні прысутных пастаноўку традыцыйнага беларускага вяселля, якую ажыццявіў студэнцкі калектыў "Пасад" пад кіраўніцтвам дацэнта Беларускага дзяржаўнага універсітэта Казаковай Ірыны Валер'еўны. Зацікавіліся фальклорам студэнты юрыдычнага і хімічнага факультэтаў. Любоў да сваёй роднай духоўнай спадчыны выхавала ў іх сама закаханая ў беларускую народна-паэтычную творчасць кандыдат філалагічных навук І.Казакова. Яна дапамагла ім адчуць паэтычную прыгажосць народных песень, мілагучнасць іх напеваў, мудрасць вясельных дыялогаў сватоў, дасціпнасць гумару зычэнняў і тостаў.

Сцэнічнае ўвасабленне народных абрадаў, а таксама выкананне песень і іншых фальклорных твораў не можа параўнацца з аўтэнтычным іх бытаваннем. Але студэнты калектыву "Пасад" так шчыра імкнуліся да натуральнага ўзнаўлення абрадаў, песень, танцаў і іншых вясельных рытуальных дзеянняў, што знікла ўспрыманне штучнай артыстычнасці пастаноўкі.

На сцэне сватанне. Традыцыйна іншасказальна, нібы пра цялушку, пытаюцца сваты пра нявесту. У дасціпным гумарыстычным дыялогу выяўляюцца адносіны да шлюбу дзяўчыны і бацькоў, дасягаецца паразуменне паміж сватамі, якое замацоўваецца рукабіццем. Пачынаюцца заручыны, насычаныя шматлікімі песнямі, у якіх адлюстроўваюцца самі абрады, пачуцці маладых. Увогуле, беларускае вяселле нездарма выдатныя фалькларысты Е.Раманаў і Р.Шырма называлі своеасаблівай операй. Гэта відаць і з любоўна пастаўленага вясельнага абраду. Нявеста благаслаўляецца на пасад, збіраецца да вянца, маладых сустракаюць бацькі, гасцей запрашаюць да стала для пачастунку, каравай дзеляць і г.д. — на працягу ўсіх вясельных этапаў гучаць песні. Выпрабоўваецца кемлівасць жаніха — яму задаюцца загадкі. Маладых абдорваюць падарункамі — і тут жа зычаць ім шчасця і дабрабыту: "Дару вам палатно белае, чыстае, доўгае, каб жыццё ваша было добрае". "Лён шаўковы, тонкая кітайка, прынясі дзеўцы прыгажосць ды шчасце; не павянуць сінія цвяточкі, не паблекнуць прыгожыя вочкі". У жартоўнай форме раяць маладым прытрымлівацца правілаў маралі. Жаніху: "Дару цябе дугой, каб не бегаў за другой", "Дару табе званок звонкі, каб пільнаваў маладую жонку". Маладой: "Дару табе ў мяшку ваўка, каб добра пільнавала мужыка".

Цудоўна іграў ролю свата Дзмітры Шаўчук, жаніха — Алег Сыс, нявесту — Святлана Валністая, старшай шаферкі — Насця Глушчанка, старшага шафера — Юры Жарнасек, студэнты першага курса юрыдычнага факультэта. Яны і вядучыя — Андрэй Дзевяцей і Іна Калеснік — прамовілі нямала мудрых народных афарызмаў, як напрыклад: "Хто мову і веру мяняў, той бацькоў сваіх прадаваў"; "Радзіма-матка, чужына-мачаха"; "Шануйце людзей, дык і вас пашануюць"; "Прыглядай гасцей, каб хадзілі часцей".

Вясёлую атмасферу стваралі эмацыянальныя песні, дасканалыя па мастацкай форме і меладычнасці. Яны выконваліся з пэўнай доляй экспрэсіі, жыва і выразна, добра пастаўленымі галасамі. Ажыўлялі вяселле і народныя танцы пад гармонік.

Час ад часу ўспыхвалі апладысменты гледачоў, якія сваім пляскaннем падтрымлівалі і пэўныя песні, і адабралі іграу артыстаў".

Вельмі важна, што вясельны рэпертуар быў складзены І.Казаковай пераважна з запісаных ёю песень, абрадаў і звычаяў у Магілёўскай вобласці.

Няма сумнення ў вялікім прапагандысцкім і пазнавальным значэнні такіх спектакляў для выхавання любві да роднай паэзіі, мовы і духоўнай нацыянальнай культуры наогул. Часцей бы адбываліся такія "прэм еры", яны прыносяць больш карысці, чым сухая гаворка ў абарону нашай культуры і мовы. Для нас, прысутных, "Беларускае вяселле", пастаўленае І.Казаковай з добрым веданнем беларускіх народных абрадаў і абрадавай паэзіі, было цудоўным святам.

А.ФЯДОСІК

Віншуем!

Алесю КУЧАРУ — 85

Алесь Кучар належыць да старэйшых беларускіх крытыкаў і літаратуразнаўцаў. З рэцэнзіямі і крытычнымі артыкуламі выступае з 1928 года. Выйшлі кнігі "Вялікая перабудова" (1933), "Літаратурна-крытычныя артыкулы" (1953, 2-е выданне ў 1980 г.), "Аб мастацкай прозе" (1961), "Аблічча часу" (1971), выдаў брашуры "Творчасць М.Багдановіча" (1939), "Янка Купала" (1948).

Вядомы і як драматург. Аўтар п'ес "Заложнікі", "Гэта было ў Мінску", "Неспакойныя сэрцы". Напісаў сцэнарыі мастацкіх фільмаў "Чырвонае лісце" (разам з А.Куляшовым), "Гадзіннік спыніўся апоўначы" (з М.Фігуроўскім), "Лісты да жывых", "Усходні калідор" (з В.Вінаградавым), а таксама дакументальнага фільма "Мы жывём у Мінску". Зборнік выбраных п'ес і кінасцэнарыяў А.Кучара пад назвай "Над Дзвіной, Нямігай, Віліяй" выйшаў у 1962 годзе. Яшчэ ў 1943 годзе А.Кучар выдаў кнігу нарысаў "На партызанскай зямлі".

Віншуем Айзіка Евелевіча з днём нараджэння!

"ЗАМЯНІЦЕ МНЕ НАСТАЎНІКА",
або ГІСТОРЫЯ АДНОЙ КАР'ЕРЫ

(Пачатак на стар. 5)

"Мой абавязак, — казала мне А. Морава, — сачыць, як вядзецца ў школах навучальны працэс, ці адпавядае ён сучасным патрабаванням, а што нехта з некім пабіўся, ці гэта было ў школе, ці на вуліцы, хай разбіраецца суд. Наколькі я ведаю, ва ўсёй гэтай гісторыі і Паўтаржыцкі праявіў сябе не лепшым чынам". І яшчэ яна выказалася ў тым сэнсе, што, фактычна, сам Алег Мустафавіч справакаваў тую бойку, зняважыўшы маладую настаўніцу, муж і брат якой прыйшлі потым высвятляць з ім адносіны.

А цяпер пра тое, што ж адбылося на самай справе. Сапраўды, недзе ў першых чыслах лютага гэтага года ў Алега Мустафавіча адбылася непрыемная сутычка з маладой настаўніцай Т. Грыцковай, якая, па тлумачэнні А. Паўтаржыцкага, не хацела вызваляць кабінет, куды ён з вучнямі прыйшоў займацца, і таму ён вымушаны быў прачытаць ёй натацыю. Праўда, у прысутнасці вучняў. Па сведчанні ж Т. Грыцковай, Алег Мустафавіч паводзіў сябе з ёй надзвычай груба, скінуў са стала на падлогу нейкія яе рэчы, аблаяў, пасля чаго яна пабегла скардзіцца на Паўтаржыцкага дырэктару. На гэтым канфлікт быў, як быццам, вычарпаны. Але 11 лютага пасля ўрока да Алега Мустафавіча ў калідоры падышлі двое незнаёмых яму мужчын і сказалі, што хочуць з ім пагаварыць. А. Паўтаржыцкі адкрыў дзверы пустога на той час кабінета хіміі, і ўсе зайшлі туды. Вось як апісвае тое, што здарылася потым, сам Паўтаржыцкі: "Калі мы зайшлі ў кабінет, малодшы з мужчын адрэкамендаваўся, што ён муж Грыцковай і патрабаваў, каб я ў прысутнасці вучняў папрасіў у яе прабачэння за быццам бы нанесеную ёй знявагу. Калі я адказаў, што не буду гэтага рабіць, абодва пачалі мяне збіваць, душыць гальштукам за шыю, павалілі на падлогу, білі нагамі. У нейкі момант мне ўдалося вырвацца і выбегчы ў калідор, дзе я стаў клікаць на дапамогу, і хоць крыкі мае не маглі быць не пачуты, ніводзін настаўнік з класаў, дзе ішлі заняткі, не выйшаў, хоць, як я заўважыў, некаторыя назіралі за мной праз паўадчыненыя дзверы. Уцячы мне не ўдалося, бо мужчыны зноў схапілі мяне і, зацягнуўшы ў пакой, зноў пачалі збіваць. У гэты момант у кабінет зазірнула дырэктар школы і спытала, што тут робіцца, пасля чаго я выбег у калідор і пайшоў званіць у міліцыю і хуткую дапамогу, якія неўзабаве прыбылі на месца".

Паказанні С. Касяровіча, мужа настаўніцы Т. Грыцковай: "Неяк жонка прыйшла са школы і паскардзілася, што яе зняважыў настаўнік Паўтаржыцкі, якога я дагэтуль не ведаў. Я вырашыў пагаварыць з ім, каб ён папрасіў прабачэння ў жонкі ў прысутнасці вучняў. Калі мы з братам жонкі І. Грыцковым прыйшлі ў школу, высветлілася, што Паўтаржыцкі заняты на ўроку і мы гадзіну пачакалі ў жонкі, пакуль ён вызваліцца. Калі мы зайшлі разам з ім у кабінет і я выклаў яму свае патрабаванні, ён пачаў выштурхоўваць нас з пакоя. Я стаў супраціўляцца, завязалася бойка. У час канфлікту Паўтаржыцкі зрабіў спробу вырвацца з пакоя, але мы яго вярнулі назад. Бойка працягвалася, у час якой я атрымаў траўмы на назе і твары".

Паказанні Т. Грыцковай: "Муж і брат прыйшлі да мяне ў школу і сказалі, што хочуць пагутарыць з Паўтаржыцкім. Але ў яго ў гэты час быў урок, і я параіла ім пачакаць гадзіну, бо палічылі незтычным гутарыць з ім у прысутнасці дзяцей. Я ім параіла пачакаць гадзіну. Што было потым, не ведаю. Калі ўсё скончылася, я спытала ў хлопцаў, ці збівалі яны Паўтаржыцкага, і пачула ў адказ, што яны яго не чапалі".

Паказанні дырэктара школы Н. Ракевіч: "Я знаходзілася ў школе, калі каля чатырнаццаці гадзін да мяне ў кабінет забеглі трое вучняў, якія паведамілі, што двое незнаёмых мужчын у кабінеце хіміі аб нечым размаўляюць з Алегам Мустафавічам на павышаных танах. Я адразу пабегла туды і спытала, што тут адбываецца. А. Паўтаржыцкі адказаў, што яны проста гутараць. Я вярнулася да сябе, але праз нейкі час пачула страшэнны грукат, што даносіўся збоку кабінета хіміі. Яшчэ з адной настаўніцай мы пабеглі туды і ўбачылі, як з кабінета выбягае вельмі ўзбуджаны Паўтаржыцкі. На маё пытанне, што здарылася, ён са злосцю адказаў: "Вы самі пра ўсё ведаеце!"

Далей падзеі разгортваліся наступным чынам. Пасля зняцця міліцыяй паказанняў удзельнікаў і сведкаў драмы, што разыгралася ў сценах школы, "зняцця" пабояў А. Паўтаржыцкім і С. Касіловічам (апошні, разумеючы, чым яму пагражае яго "візіт" у школу, таксама заспяшаўся да судмедэксперта, які знайшоў у яго лёгкія цялесныя пашкоджанні — некалькі сінякоў на твары і нагах; даведка гэтая, між іншым, адметная адным цікавым запісам, зробленым са слоў "пацярпелага"; у графе "Абставіны справы" напісана: "11 лютага 1995 года быў збіты невядомым (падкрэслена мной. — **М. З.**) грамадзянінам), справа была перададзена ў Кастрычніцкі раённы суд, дзе трапіла да суддзі Віктара Уладзіміравіча Бяляніна. У яго яна праляжала без руху амаль два месяцы (суды ў нас перагружаны і не спраўляюцца з разглядам спраў у вызначаны тэрмін), а калі, нарэшце, надышла чарга, перад вачыма суддзі паўстаў, акрамя асноўных дакументаў, сабраных міліцыяй, яшчэ і калектыўны ліст, дасланы са школы, дзе працуе А. Паўтаржыцкі, падпісаны амаль усім педкалектывам. Ліст, дзе наш герой абмаляваны самымі чорнымі фарбамі і дзе выканана патрабаванне да ўстаноў, куды будзе звяртацца Алег Мустафавіч, не прымаць яго скаргі да ўвагі. Адным словам, аб'яўлялі яго па-за законам. Былі ў справе падпісаныя дырэктарам школы і старшынёй прафкама характарыстыкі А. Паўтаржыцкага і Т. Грыцкову. Першая — стопрацэнтная адмоўная, другая — хоць ты заўтра ўзнагароджвай Грыцкову медалём за доблесную працу. Прыблізна ў такіх выразах была састаўлена характарыстыка і яе мужа С. Касіловіча, падпісаная старшынёй нейкага кааператыву пад шыльдай "Раман", дзе памянёны Касіловіч працуе.

Як растлумачыў мне Віктар Уладзіміравіч, усе гэтыя характарыстыкі, як і калектыўны ліст, ні міліцыяй, ні судом запатрабаваны не былі і з'явіліся ў справе па ініцыятыве кіраўніцтва школы. Калі я потым скажу пра гэта Н. Ракевіч, яна ўсклікне: "Паўтаржыцкі можа паліваць нас брудам, а мы павінны маўчаць?!"

Гутарыў я і з Таццянай Грыцковай, маладой жанчынай, за сціплай знешнасцю і субтыльнасцю якой угадвалася натура досыць агрэсіўная і зацятая. Варта было мне пацікавіцца, чаму яна, настаўнік, педагог, не адгаварыла мужа і брата ісці ў школу зводзіць рахункі з незнаёмым чалавекам, мала таго, нават, як паказвае справа, спрыяць гэтаму, яна адразу ж завялася: "А я не дазваляю рэдакцыі ўмешвацца ў мае справы!", і толькі, сустрэўшы шматзначны позірк дырэктара, якая прысутнічала пры нашай размове, асеклася і пачала нешта гаварыць аб тым, што яна яшчэ маладая, законаў не ведае і г. д.

Дарэчы, Віктар Уладзіміравіч Бялянін таксама адразу давёў да майго ведама, што юрыст ён малады, суддзёй працуе першы год. Праўда, што тычыцца законаў, дык іх ён ведае, як кажуць, на зубок. Ніколі на ёту ад іх не адыходзіць. Не сказаў ён толькі, што г скрупулёзна захоўваючы літару закона, можна, пры жаданні, павярнуць яго і так, і гэтак, зрабіўшы правага вінаватым, і наадварот. Што і адбылося з дадзенай справай.

Так, сапраўды, траўмы, атрыманыя С. Касіловічам, паводле артыкула 106-га Крымінальна-працэсуальнага кодэкса, прадугледжваюць адміністрацыйны арышт вінаватага тэрмінам на 15 сутак, што суддзя і прымяніў. Праўда, вынес пастанову арыштаваць не на 15, а на 5 сутак, разумеючы, вядома, як гэта можа паўплываць на жыццё, лёс Паўтаржыцкага. Я не кажу ўжо пра тое, што таго Касіловіча ніхто ў школу "за траўмамі" не пасылаў, сілай туды не цягнуў. Хіба што жонка...

Ну, добра, кажу я суддзі, адно зло вы пакаралі, а другое? Як вынікае з даведкі судмедэкспертызы, Алегу Мустафавічу Паўтаржыцкаму былі нанесены куды больш сур'ёзныя траўмы, чым Касіловічу, не кажучы ўжо пра іншыя абставіны — хто ўсё-такі на каго напаў...

"Пабоі, нанесеныя Паўтаржыцкаму, прадугледжваюць пакаранне вінаватага па артыкуле 110-ым Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, а гэта мінімум год пазбаўлення волі", — гаворыць мне Віктар Уладзіміравіч. Я разводжу рукамі. Аказваецца, як тлумачыць В. Бялянін, ён не можа прымяніць да Касіловіча судовых санкцый, бо не мае на руках адпаведнай заявы пацярпелага, які, чамусьці, у суд не з'яўляецца.

Вось так. Але ўзнікала ў мяне моцнае падазрэнне, што, кажучы па-руску, лукавит Віктар Уладзіміравіч, што ў не ў нейкай там заяве пацярпелага справа. Дарэчы, такая заява, мо і не напісаная па належнай форме, у справе маецца. Вось яна: "Прашу Кастрычніцкі РАУС аказаць дапамогу ў росшуку асоб, якія 11 лютага 1995 года збілі мяне, парвалі вопратку і нанеслі цялесныя пашкоджанні ў памяшканні 110-й сярэдняй школы, у кабінеце хіміі". І подпіс: А. Паўтаржыцкі. Так што, паўтараю, справа не ў адсутнасці заявы, справа, хутчэй за ўсё, у тым, што аказаўся суддзя ў палоне той нядобрай славы, магчыма, у нечым і заслужанай, якая спадарожнічае Алегу Мустафавічу Паўтаржыцкаму. "Ведаеце, ён вельмі канфліктны чалавек, — на нейкі момант зрываецца Бялянін, — усё некуды піша, піша, скардзіцца..." "Цяжкі характар — гэта крымінал?" — пытаюся я. "Не, што вы, — бянтэжыцца суддзя, — мы, вядома, давядзём справу да канца..."

Ах, Феміда, Феміда!..

Ну, а што Алег Мустафавіч Паўтаржыцкі? Ён дамогся, што пракуратура апратэставала пастанову суда аб яго арышце. Так што — ходзіць на працу. Але ў школе ці то з ім ніхто з настаўнікаў вітацца не хоча (так кажа Паўтаржыцкі), ці то ён ні з кім не вітаецца (так кажа Ракевіч).

Адным словам, пакрыўджаны Алег Мустафавіч на ўвесь белы свет. Відаць, будзе пакрыўджаны і на мяне.

Міхась ЗАМСКІ

Не давайце святога сабакам і не кідайце пэрлаў сваіх перад свіннямі, каб не патапталі іх нагамі сваімі і, адвярнуўшыся, не разарвалі вас.

Мацвея св. Эвангелле 6 : 6.

Вітаўт ЧАРОПКА

ПАГОНЯ — БОГ, РАДЗІМА, НАРОД!

Каб зразумець шмат якія таямніцы нашай гісторыі, варта ведаць семантычна-сакральнае значэнне слова і сімвала. У старажытных людзей слова перш за ўсё выконвала функцыю медытацыйнай сувязі паміж чалавекам і багамі. Слова набывала глыбокае філасофскае значэнне. Рытуальныя дзеянні істотна паўплывалі на развіццё мовы, на сімвалічнае паняцце слова. А сімвал у старажытнасці набыў глыбокі сакральны сэнс і раскрываў светапогляд людзей на сусвет і жыццё. І ўменне чытаць і расшыфроўваць слова і сімвал дае магчымасць зазірнуць у святыню святых гісторыі — яе пачаткі. У беларусаў такімі сакральнымі словамі былі Крэва — Літва — Белая Русь — Пагоня!

Крэва — слова, якое дало назву продкам беларусаў крэвічам — крывічам. Літва — назва беларускай сярэдневяковай дзяржавы і беларускага сярэдневечнага этнасу. Белая Русь — сучасная назва нашай краіны. Пагоня — нацыянальны і гістарычны сімвал літвінаў-беларусаў, іх сакральны код у гісторыі. Менавіта сакральнае значэнне слова пагоня і ягонае геральдычнае ўвасабленне і аб'ядноўвае словы-паняцці Крэва — Літва — Белая Русь.

Ключом для разгадкі паслужыць нам невядомая шырокаму колу гісторыкаў і даследчыкаў грамата вялікага князя літоўскага Альгерда, выдадзеная ім у 1359 годзе. У грамаце паведамляецца, што "для немения або одлеглосци кревов" суды павінны праводзіць "хоружии". Грамата — дакументальнае пацвярджэнне існавання крэваў: святарскай язычаскай касты, пра якую пісаў у XIV ст. нямецкі храніст Пётр Дузбург.

Паводле гэтага храніста, крэвам належала жрэчаская і адміністрацыйная ўлада ў Прусіі, Літве, Лівоніі. Дузбург засведчыў тэакратычны від улады ў народаў Прыбалтыкі. З лацінскага летапісу "Царкоўнай гісторыі" даведваемся, што ўлада Крэва ў "справах святых і судзебных" была і ў "зямлі крэвічскіх русаў" (crevic-zensivim Russorum). Патранамічны суфікс -віч указвае, што крывічы былі паслядоўнікамі Крэва. Латышская назва крывічоў kreews дае падставу лічыць правільнай формай крэвічы. Няма ніякіх сумненняў, што крэвічы ўваходзілі ў сістэму славянска-балцкай язычаскай рэлігіі. Нягледзячы на наступ хрысціянства, інстытут крэваў захаваўся і на землях Полацкага і Віцебскага княстваў да XIV ст., бо і на гэтыя землі пашыраўся ўказ Альгерда. Але крэвічы/крывічы жылі на Смаленшчыне, Пскоўшчыне і ў вярхоўях Волгі, і на гэтых землях існаваў інстытут крэваў. Напрыклад, яшчэ ў XIX ст. у Кастрамской губерні сустракалася прозвішча *Крив-Кривейко*, якое нагадвае імя першасвятара Крэва-Крэвейта. У беларускай мове суфіксу *-ейта(-эйціс)* суадносны суфікс *-віч*, таму атрымліваем форму Крэва-Крэвіч. Гэтае двайное імя магло мець магічнае значэнне. У беларускіх замовах найбольш важнае слова паўтаралася (напр., зара-зараніца, вада-вадзіца, вуж-вужаніца), што ўмацоўвала ягоную магічную сілу. Але калі дапусціць форму імя Крэва-Крывіч, дык яно азначае бінарную апазіцыю Крэва — права і Крыва — лева і сімвалізуе ўсё, што звязана з гэтымі разуменнямі.

Семантычнае значэнне слова Крэва (паходзіць ад інда-еўрапейскага *s(kpej)* — круціць, гнуць) звязана з паняццем крэў-кроў, а таксама з дзеясловамі кревасці, кревіці, кревам, кревіць, кріяці і азначала падымаць, набірацца сіл, мацнець, ачуняць, выздараўліваць, ажыўляць, асвяжаць, падмацоўваць. Усе пералічаныя словы сімвалізавалі дзеянне, звязанае з паняццем жыццёвыя сілы, жыць — крыяць, акрыяць. Этымалагічна адзіны са словам крэва і кріч (кричыю — рабіць, стварацъ, здзяйсняць, дзеяч, творца, паэт (творца рэлігійных гімнаў). Гэтыя азначэнні і паказваюць стваральны сэнс функцыі святара Крэва — ажыўляць, даваць сілы; ён жа творца і паэт. І ва ўяўленні старажытных людзей, той, хто звяртаўся з просьбай да багоў аб дараванні ім жыццёвых сіл, сваімі просьбамі садзейнічаў божай міласці — ажыўляў свет. Наяўнасць тапонімаў Крэва і Крывіч на землях люцічаў можа сведчыць, што і гэтае славянскае племя называла сваіх святароў крэвамі. Дарэчы, Тэадор Нарбут пісаў, што і абадрыты мелі крэваў. Такім чынам, люцічы і абадрыты ўваходзілі ў адну славяна-балцкую язычаскую сістэму, якая аб'ядноўвала землі Заходняй і Усходняй Прыбалтыкі, старажытную Беларусь і тэрыторыю рассялення крывічоў — вярхоўе Заходняй Дзвіны, Дняпра і Волгі.

Галоўнай функцыяй Крэва было служэнне богу грому Перуну (балцкая форма Пяркунас) — славяна-балцкаму адпаведніку індыйскага Індры, грэчаскага Зеўса, рымскага Юпітэра, германскага Тора. Паводле ўяўленняў беларусаў Пярун і прынёс жыццё на зямлю. "Калісь яшчэ свет толькі зачынаўся, дык нічога нідзе не было. Усюды стаяла мёртвая вада, а пасярод вады тырчаў нібы камень, нібы што. Адзін раз Пярун як разыграўся і давай пыляць *стрэламі* ў гэты камень. Ад яго стрэлаў выскачыла тры яскаркі: белая, жоўтая і чырвоная. Упалі тыя яскаркі на ваду; з гэтага ўся вада скаламуцілася. І свет памуціўся, як хмары. Але па некаторым часе, як усё высветлілася, дык і адзначылася — дзе вада, дзе зямля. А яшчэ па некаторым часе завялося і ўсякае жыццё і ў вадзе, і на зямлі". У сакральна-містычным аспекце гэтае паданне можна разгледзець, як злучэнне мужчынскага пачатку (агонь Перуна) і жаночага пачатку (мёртвая вада), што і прывяло да "высвятлення" — нараджэння жыцця. Гэтае паданне супадае з гімнам арыйскаму богу-грамоўніку Індры. "Ён ударыў па Агі гары (дэман, які стрымліваў плынь вады. — **В. Ч.**), ён выпусціў ваду, ён аддзяліў рэчкі ад гор". Безумоўна, беларускае паданне сваімі вытокамі паходзіць з арыйскіх міфаў пра Індру, адно з імёнаў якога было *Parjanya*.

Беларусы шанавалі агонь і ваду як галоўныя прыродныя стыхіі, злучэнне якіх і давала жыццё. Агонь (які "ўсе паважаюць") у беларусаў — цар-агонь, агенец мой каханы, жывы агонь, вечны агонь, святаносны пачатак, лякарственнік. Агнём ачышчаліся ад немачы, сурокаў, праганялі злосных духаў начы. Агонь сімвалізаваў племя, род, народ, дом. Чырвоны колер агню быў для беларусаў святым. Перад стодам Перуна гарэў вечны агонь Зніч, які сімвалізаваў вечнасць гэтага бога і народа, што пакланяўся яму. Паводле вераванняў беларусаў: "Першы агонь к нам прыляцеў з Перуном". Дым агню нёс душы памерлых у краіну дзядоў — вырай (і.-е. *ūr* — "вада"). Самога Перуна беларусы называлі "царь Огонь".

Такое ж важнае значэнне беларусы надавалі вадзе: вадзіца — царыца, красная дзявіца, божа ўгодніца, усяму свету памочніца, жывая вада, святая вада. Вада нараджала жыццё, замоўленай вадой змывалі сурокі, яе пілі ад хвароб.

Пасылаў на зямлю ваду Пярун. Гэта ён сваімі вогненнымі стрэламі-маланкамі разбіваў злыя раці Чарнабога, вызваляў з хмар *напой жыцця* — ваду, і яна лілася на зямлю, ажыўляла яе. Першы дождж, паводле ўяўленняў беларусаў, прынёс Пярун, які перамог цмока, пасля чаго два дні ішоў дождж. Як бачым, ва ўяўленні беларусаў жыццё было магчыма толькі пры наяўнасці бінарнай апазіцыі агонь-вада і злучэнні іх мужчынскага і жаночага пачаткаў. Жывы агонь — гэта якраз агонь, які дабываўся на Купалу трэннем сухога дрэва аб мокрае. Самое свята Купалы — гэта злучэнне вогненнага сонца з вадой, у сакральным значэнні эратычны акт, які прыносіць плоднасць зямлі. Паводле народнага ўяўлення, Пярун кіпяціць у гразавым полымі дажджавую ваду і купае ёю неба і зямлю. Сам корань *куп* мае значэнне белага колеру, напрыклад, купава — белая кветка, купавы — белы. На Купалу Пярун павяртаў сонечнае кола на зіму і тушыў ягоныя спякотныя промні ў дажджы або вадзе. Сімвалічна гэтае дзеянне імітавалася скатваннем з гары ў ваду запаленага кола. Зноў спалучэнне белага колеру вады і свету і чырвонага колеру агню і сонца. Нават у назве свята прысутнічае гэтае каляровае спалучэнне: Купала — *куп* — белы і Ярыла (гэтак Купалле называлі ў Цвярской, Яраслаўскай, Разанскай губернях) — *яр* — якое мае значэнне чырвонага колеру, *яркі*.

Спалучэнне бела-чырвоных колераў у адзежы і ткацтве — сімвал жыццёвых сіл вады і агню. Белыя ручнікі з вышытым чырвоным арнаментам прыносілі ў ахвяру Перуну, вязалі іх на Перунова дрэва дуб. На вядомым менскім капішчы Севасцеяў дубу Волату, перад якім гарэў агонь Жыжка, людзі ахвяравалі ручнікі. Сімволіка ручніка (спалучэнне бела-чырвонага колераў) мае шырокі дыяпазон. Ад нараджэння да смерці ўсе важнейшыя падзеі ў жыцці чалавека суправаджаліся сімволікай ручніка, асабліва на вяселлі. Ручнік адыгрываў першасную ролю ў рытуале прыёму жаніха ў род нявесты "звядзенне ў купу". Жаніх і нявеста браліся за ручнік, пасля чаго і астатнія родзічы, і атрымлівалася "купа" — з'яднанне маладых з усім родам.

Гэтае спалучэнне колераў выкарыстоўвалася і ў народным адзенні, прынамсі, некаторыя даследчыкі і тлумачылі назву Белая Русь тым, што беларусы насілі белае адзенне з вышытым чырвоным арнаментам. Такім чынам спалучэнне бела-чырвоных колераў сягае ў пачаткі нашай гісторыі. Сам народ ужо выбраў гэтую колеравую гаму, як сімвал жыцця. І Крэвы — гэтыя бацькі нашых продкаў — апраналіся ў белае, што сімвалізавала святасць і жыццё. І гэта зразумела, бо крэвы прасілі ў Перуна напоя жыцця — вады. Бела-чырвонае спалучэнне колераў стала і ў хрысціянстве сімвалам жыцця, святасці, а бела-чырвона-белае — Хрыстовых пакут за чалавецтва і вечнасць душы. Гэтае пераасэнсаванне народнай традыцыі выразна бачна ў беларускіх абразах. На абразе Пётры Яўсеевіча "Нараджэнне Маці Боскай" (1649 г.) св.Ганна і жанчыны-павітухі маюць на галовах беларускія наміткі — белыя з чырвонымі стужкамі пасярэдзіне. Падушка на ложку святой белая з чырвоным арнаментам — таксама адлюстраванне народнай сімволікі. І белы ложак з чырвонай коўдрай складае кампазіцыю бела-чырвона-белай сімволікі нараджэння жыцця, святасці і Боскай выбранасці гэтых колераў. А на абразах "Маці Боская Замілаванне" (1656 г.), "Маці Боскай Адзігітрыя Неўвядальны цвет" (XVII ст.) маленькі Хрыстос намаляваны ў беларускім народным строі — белай кашулі падпаясанай чырвоным пасам. Натуральна, што бела-чырвона-белае спалучэнне колераў выкарыстоўвала праваслаўнае святарства ў сваім адзенні. Напрыклад, на абразе "Мікола з жыццём" (XVII ст. Мінскі кафедральны сабор 1642 г.) на хітоне св.Міколы намаляваны бела-чырвона-белыя стужкі. Значыць, гэтыя колеры астральныя для беларусаў і менавіта іх узялі беларускія адраджэнцы за сімвал беларускага народа, бо яно выражала ўсю сутнасць нацыянальна-вызваленчага руху (дэвіз паўстанцаў Каліноўскага "Бог і Радзіма").

З словам вада суадносіцца корань ліць, з дапамогай якога кадзіруюцца азначэнні рытуальных дзеяў. Рытуальныя ахвяры крыві жывёл, а то і крыві саміх святароў, віна — узліянне, ліція — маленне, літанне — галашэнне, літасць — жаль, міласэрнасць, чуласць, спагада, міласць, літба — ахвяраванне віна або вады і крыві богам, літацiя — ахвярапрынашэнне, ліція — свяшчэннадзейнасць, якіе адбываліся на вуліцы. Просьба язычаскіх святароў аб боскай міласці называлася малітва. Семантычна-сакральнае значэнне гэтага слова можна расшыфроўваць так. Першы склад *ма* — азначае дзеянне, другі *літ* — літасць (цікава, што гара ў Луздзенскім павеце Віцебскай губерні, на якой паводле падання знаходзілася язычаскае свяцілішча, называлася Літаўка), а трэці склад *ва* — вада. Такім чынам, малітва азначала прасіць літасцівую ваду. І вось Пярун пачуў малітвы крэваў і вызваліў з чорных хмар літасцівую ваду — *літву*. У славянскіх мовах захавалася назва дажджу літва (параўнаем з назвамі рэчак на славянскіх землях Літава).

Значэнне дажджу, як жывой вады або малака нябесных кароў, было пашырана і ў другіх народаў. Фіны параўноўвалі дождж з мёдам. Рускія называлі дождж карміцелем. Грэкі маліліся Зеўсу: "Пралі, дарагі Зеўс, пралі дождж на ўзараныя палеткі афінян" і лічылі дождж крывёю багоў і багінь. Уяўленне пра дождж, як пра жываносную крыніцу, "хлябі нябесныя" асабліва выразна падкрэслена ў зваротах жрацоў кондаў да бога дажджу Підзу Пену: маўляў, калі ён не пашле вады, зямля застанецца неўзаранай, зерне загіне, людзі і жывёла памруць. Славяне верылі, што дождж (асабліва вясновы) даруе тым, хто ім умываецца пры ўдарах грымотаў, сілы, здароўе, чадароддзе. Дажджавая вада на Ільін дзень пазбаўляе ад сурокаў і злой напасці. Выпадзенне дажджу на пачатку справы абяцала ўдачу. Адсюль і тое асаблівае становішча, якое заняў у пантэоне язычнікаў бог дажджу і грому. Старажытныя арыйцы, да якіх належалі і славяне, усхвалялі грамавога бога Індру: ён вогненнымі стрэламі перамагае ворагаў, б'е хмары цмокаў, і дождж льецца на зямлю ("апладатварае зямлю сваім семем"), і зноў свеціць сонца, жыццё працягваецца. Памяць пра Індру жыла ў продках беларусаў, нагадаем тапонім Індура і рэчку Індра, якая ўпадае ў Заходнюю Дзвіну на этнічнай мяжы беларусаў і латышоў.І час абуджэння прыроды вясна ў славян называўся літо. Паводле чэшскіх спеваў, літо (вясна) нараджалася з вады.

Корань *літ* (літасцівая вада) даў шэраг паняццяў, якія сімвалізавалі жыццё. Літвіны (літвіна) — бацвінне агародніны, буракоў, а пасля і бульбы. Тое самае значэнне мела і слова літвень. (Адсюль зразумела, чаму літвінаў называлі бацвіннікамі). Літвіны — пругкая галінка, літвор — трава для магічных рытуалаў, літвір — лекі, літоўка — каса для касьбы траў і хлеба, літоўка — рытуальная ежа з жытняй мукі, ліціца — назва азбукі і літар. Пашыранымі сярод славян былі імёны з вызначэннем літасцівы: Літас, Літавор, Літмір, Літабор, Літамысл, Літаруд, Літахлеб, Літавац Літвіна . Чаргаванне л/в даюць цэлы шэраг азначэнняў жыцця: *віт* — жыццё, віч — наследак, вітаці, вітаваці — жыць, вітальніца — шпіталь (літасць), вітуха — павітуха (нараджэнне), віталіца — дождж (літва), вітушка — вясельны каравай (вяселле). (Менавіта ў нізоўі рэчкі Вітушкі ў Ромаве, што была ў прускай зямлі Надровіі, і знаходзілася спачатку рэзідэнцыя Крэва-Крэвіча. Другое значэнне слова вітушка — завостраны кій з устаўленымі пёрамі на тупым канцы, які выкарыстоўваўся ў дзіцячых гульнях (гэтая вітушка падобная на крывулю Крэва-Крэвіча). Світанак — рассвет (нараджэнне, а ў беларускіх спевах знаходзім "свет світае" — нараджэнне свету), світка — верхняе белае адзенне беларусаў, вітва — вербалозы (вярба, якая п'е жывую ваду, адсюль і вера, што яна адганяе нечысць і дае здароўе), Віцьба — рэчка ў Віцебскай вобласці (жывая вада), вітвіна — бацвінне агародніны і бульбы (тое самае, што і літвіна), вітаць — шанаваць, праяўляць шчырасць, жадаць здароўя, віць — жыць, віціна — караблі, што плавалі па рэках Нёмане, Вілії, Шчары і Прыпяці, вільца — скрыўленая галінка (крывуля — знак улады крэваў). (Можна высунуць гіпотэзу, што вільцы — люцічы гэта не ваўкі, а крэва — люцічы). Вітаўя — жыллё, вітка — луг, віці — дубцы вярбы, вітвы (сімвал паспалітага рушэння). Ад віці і значэнне віч, як сімвал высакароднасці, шляхецтва, прыналежнасці да вайсковай касты. У Масковіі вічамі цары называлі самых заслужаных баяр. У Літве вічы атрымлівала шляхта. Віч — дубец, віца (сімвал даброцця), віч — біч (адзін з сімвалаў Перуна), віцень — дубец, якім паганяюць жывёлу, *віч* (той самы сімвал: па сваім значэнні і суфіксальнай пабудове слова аднолькавае з імем бога Жыцень, якога беларусы лічылі духам жыта: "Жыцень хлеба даў"), віць — урадавы дакумент (улада), вітка — умоўны знак, мяжа, віток — вірок, юрок (лат, *vir* — чалавек, бел. юр — сексуальнасць). Трэцім азначэннем жыццёвых сіл для беларусаў служылі словы з коранем гон. Гон — назва шлюбнага перыяду ў жывёл (сімвал эратызму і размнажэння); гоні — хлебная паласа (хлеб); гоны — парасткі, зямля абшчыны або сяла (радзіма), кола (300 м); пагон — статак (багацце); пагонь — хуткі рост (развіццё); пагоня — адросткі, бацвінне (тое самае, што літвіна і вітвіна); пагоня — заліўны луг (тое самае, што і вітка (лепшае); пагоня — нізіна, невялікае балота, месца сцёку вод пры веснавым раставанні снегу і атмасферных ападках, густыя зараснікі вербалозаў (паводле беларускай міфалогіі, жонка Перуна хаваецца ў вербалозах ад Чарнабога і нараджае там Дажбога — сонечнага бога); пагоня — праследаванне ворага (вызваленне гоней, зямлі), імкненне да чагосьці, жаданне (мара, будучыня); пагонія — падаючая зорка, пагоніцыя — зарніца, маланка Перуна, зорнае святло, час перад зарой (світанак); пагоніч — чалавек, які гоніць статак (пастух, пастыр); пагоніч — аратай; пагоніч — віцязь, які ўдзельнічае пры выгнанні ворага з роднай зямлі. Да гэтага шэрагу дададзім слова ганцы — маладыя пабегі, галінкі, вестуны; гонажаці — вызваляць, ратаваць; гонкі — высокі, рослы; гонь — агонь (у беларускай замове: "вадзяное ў ваду, а агняное на 'гонь); гон — вызначэнне рытуальна эратычных дзеяў на Купалле (напрыклад, у купальскім спеве празрыста намякаецца на гон жывёлы:

Сёння Купала, заўтра Ян,
Будзе, хлопчыкі (дзяўчаты), ліха вам.
Ой, будзе ліха ліхое:
***Пагоніце* сучак у поле.**
Ой, будуць сучкі гіляваць,
Будуць хлопчыкі (дзяўчаты) пераймаць."

Такім чынам, значэнне слова Пагоня сімвалізуе родную зямлю, жыццё, багацце, род, народ, неба, маланку, зару, світанак, лепшае, святло, свабоду, мужчынскі і жаночы пачаткі — усё, што суадносіцца да паняцця жыццё, а значэнне паняцця Пагоня — жыццё. Гэта пацвярджаецца і сінанімічным шэрагам: Жыцень — Быцень — Віцень (віца (дубец) і значэнне віценя і віцы, як паганялкі; параўнаем: старажытнаанглійскае Witan — гнаць, праследаваць) — Пагоня. Менавіта тым медыяльна-сакральным сімвалам, якое ў свядомасці нашых продкаў злучала бінарныя апазіцыі неба — зямля, верх — ніз, агонь — вада, і было слова пагоня. Напрыклад, знічка (пагонія) — сімвал неба, а сімвал зямлі пагоня — заліўны луг, балота, гоні. Знічка, як іскра Зніча — сімвал агню, а сімвал вады вітвіна, дубцы якой віці (ганцы) пасылаліся для абвяшчэння паспалітага рушэння — пагоні. Можна супаставіць і сімвал мужчынскага пачатку — агонь і сімвал жаночага пачатку — вада, аб'яднаных паняц-

(Працяг на стар. 14-15)

СЛАВУТЫМ ЗЕМЛЯКАМ ПРЫСВЯЧАЕЦЦА...

Літва! Бацькоўскі край, ты як здароўе тое:
Не цэнім маючы, а страцім залатое —
Шкада, як і красы твае, мой родны краю.
Адам МІЦКЕВІЧ

Вялікае княства Літоўскае, Рэч Паспалітая, "Северо-Западный край", БССР — Беларусь...

Русіны, ліцвіны, палякі і зноў жа ліцвіны, і тут жа рускія, і пры гэтым тутэйшыя, савецкі народ — беларусы...

Што ж ёсць наша радзіма, і хто ёсць мы? Ад адказу на гэтае пытанне залежыць будучыня нашай Бацькаўшчыны як суверэннай дзяржавы і беларусаў як самабытнага этнасу. Самаасэнсаванне нацыі небяспечна задоўжылася. Менавіта цяпер як ніколі востра адчуваецца патрэба ў шырокай, якая ахапіла б усе слаі насельніцтва, кампаніі па прапагандзе нацыянальнай ідэі, каб на папулярным, "прымітыўна-простым" узроўні давесці да свядомасці кожнага грамадзяніна сутнасць адвечнай драмы Маці-Беларусі і абудзіць у яго душы гонар за яе слаўную мінуўшчыну, за яе багатыя культурныя традыцыі.

Для вырашэння гэтай няпростай задачы неабходна пераасэнсаванне дзяржаўных і грамадскіх адносін да нашай гісторыі, неабходна рашуча абвергнуць тэзіс аб нібыта 200-гадовым летаргічным сне беларускага народа. Культурнае жыццё на абшарах Беларусі не адставала ад культурнага жыцця Еўропы, а тое, што выяўляцца яно мусіла на чужой мове, з яўляецца адной з найбольшых нацыянальных трагедый.

Яркай ілюстрацыяй гэтага — паэтычная спадчына выдатнага польскамоўнага паэта Беларусі XIX ст. Адама Міцкевіча, 200-годдзе з дня нараджэння якога неўзабаве будзе адзначаць увесь свет. Адным з першых прэцэдэнтаў і свайго роду падрыхтоўкай да святкавання юбілею стала міжнародная канферэнцыя, прысвечаная нашым славутым землякам Адаму Міцкевічу і К. Міцкевічу (Якубу Коласу). Яна адбылася на філалагічным факультэце Белдзяржуніверсітэта з ініцыятывы кафедры славістыкі БДУ. У яе арганізацыі прынялі ўдзел Міністэрства культуры і друку Рэспублікі Беларусь, Беларускі фонд Адама Міцкевіча. Пры выключнай значнасці абодвух паэтаў для культуры Беларусі на сённяшні дзень творчасць Коласа грунтоўна даследавана, а вось паэзія А. Міцкевіча, па сутнасці, яшчэ застаецца па-за ўвагай айчыннай навукі.

— Адама Міцкевіча нельга лічыць толькі палякам. Гэта постаць сусветнай значнасці, а радзіма яго — Беларусь, — адкрываючы канферэнцыю, дакладна акрэсліў яе асноўную праблему намеснік міністра культуры і друку У. Гілеп.

Як бы прадчуваючы пярэчанні адносна беларускасці А. Міцкевіча, член-карэспандэнт АН Беларусі А. Лойка ў сваім дакладзе зазначыў, што на пачатку XIX стагоддзя беларускасць не існавала як самастойная з'ява, а часткова выяўлялася як ліцвінскасць — гэта значыць, як рух за рэстаўрацыю уніі і Рэчы Паспалітай. Нездарма пазней яшчэ і Дунін-Марцінкевіч называў сябе ліцвінам, а Міншчыну — Літвою і толькі Віцебшчыну — Беларуссю.

На супярэчлівасць нацыянальнага вызначэння А. Міцкевіча ўказаў старшы навуковы супрацоўнік Інстытута імя Янкі Купалы АН Беларусі У. Мархель. Ён заўважыў, што Міцкевіч пісаў пра ліцвінаў, маючы на ўвазе сваіх суайчыннікаў, нашчадкаў Вялікага княства Літоўскага, і ў гэтым сэнсе быў таксама ліцвінам, аднак ён жа з'яўляўся прыхільнікам Ідэі адраджэння незалежнай Рэчы Паспалітай і як свядомы грамадзянін зняволенай дзяржавы называў сябе палякам.

Пераасэнсоўваючы постаць А. Міцкевіча як прадстаўніка тагачаснай культуры Беларусі, неабходна ўлічваць, што яго паэзія ад пачатку была і назаўсёды застанецца класікай польскай літаратуры. Пры гэтым яе ўплыў на культурнае жыццё ўсіх славянскіх народаў даволі адчувальны — аб асэнсаванні гэтага аспекта праблемы гаварыў у сваім дакладзе загадчык кафедры славістыкі БДУ К. Хромчанка.

Апрача названых, у праграме пленарнага пасяджэння былі даклады прафесара Варшаўскага універсітэта, ганаровага прафесара БДУ А. Баршчэўскага, прафесараў БДУ В. Рагойшы і В. Шалькевіча. Пасля вялася работа па секцыях, на якіх выступілі вучоныя з Мінска і іншых гарадоў Беларусі.

Для пашырэння распачатай працы, для надання ёй сістэмнасці неабходна дзяржаўная падтрымка. Важна, каб Міцкевічаўскія канферэнцыі сталі штогадовымі. Гэта адзін з дзейсных шляхоў актывізацыі намаганняў беларускіх вучоных у кірунку далейшага асэнсавання айчыннай гісторыі і культуры. Ад плённасці гэтай працы ў рэшце рэшт залежыць, наколькі глыбока будзе сягаць гістарычная памяць народа, як актыўна будзе развівацца працэс нацыянальнага самаўсведамлення нашых сучаснікаў, супляменнікаў, суайчыннікаў.

Павел НАВОЙЧЫК

ПАГОНЯ — БОГ, РАДЗІМА, НАРОД!

(Пачатак на стар. 13)

цем пагоня. Гэтым жа паняццем аб'ядноўваюцца саслоўе сялян — пагоніч і саслоўе віцязяў — пагоніч і бінарная апазіцыя мір — вайна. Як бачым, пагоня апраўдала першапачатковае значэнне слова гоні — адлегласць паміж двума пунктамі. І як у жыцці гоні злучалі дзве кропкі, гэтак і ў сакральным свеце дзве процілегласці аб'ядноўвала магічная пагоня з яе жыццёвымі сімваламі. Тэрмін Пагоня і вытворчыя словы ад корня гон звязаны з Перуном. У ведыйскіх гімнах перамогі Індры азначаліся словам *guhenti (паражае) і g'one (нараджае), якія былі заменены дзеясловам *біці (біч/віч), але ужываўся і дзеяслоў гнаць або жаць у дачыненні да Перуна (у беларускай традыцыі гэта міф аб пагоні названага бога з цмокам або чортам). А паколькі з Перуном атаясамліваліся сімвалы жыцця, руху, імклівасці, эратызму, дык гон і даў нам шэраг слоў, якія азначаюць жыццёвае развіццё.

Лагічна, што паклоннікі Перуна, якія ўклалі столькі сакральных значэнняў у слова пагоня, павінны былі ў гербе Пагоня занатаваць і свой светапогляд дваічных процілегласцяў і сімвалічны вобраз свайго галоўнага бога. У навуковай літаратуры ўсталявалася меркаванне, што віцязь на белым кані — гэта выява бога Ярылы. Але, я думаю, блізкай да ісціны ёсць выснова Якава Ленсу, які лічыў прататыпам віцязя Зеўса (грэчаскага адпаведніка Перуна). Ленсу мае рацыю, калі сцвярджае, што "Ярылаў крыж" — не што іншае, як трансфармаванае шасцісціцавае кола — салярны сімвал, які суадносіўся да Зеўса і Юпітэра, і мог, канешне, суадносіцца і да Перуна. Паколькі, як лічылася яшчэ ў XV ст. "Перунъ есть многъ", дык адной з яго іпастасяў, магчыма, быў Ярыла (Пярун-Ярун-Ярыла). Спалучэнне ў гербе чырвонага і белага колераў указвае нам на бінарную апазіцыю агню і вады — сімвалаў Перуна. Адпаведную паралель мы знойдзем у хетскай міфалогіі, дзе бог Піруа адлюстроўваўся вярхом на кані і атаясамляўся з вайсковым бажаством Іштар у выглядзе воіна. Рымскаму адпаведніку Перуна Юпітэру быў прысвечаны белы рытуальны конь. Тое самае назіраем у дачыненні да люцічскага Святавіта. Калі ўлічыць, што Пярун у беларускіх казках называецца богам, дык натуральна суаднесці яго і да бога ў беларускіх замовах: "Выяжджаў к нам Господь Бог на белом коне и ў белом платьтю..." Белы конь і белае адзенне — гэта атрыбуты вершніка Пагоні, з чаго вынікае, што ў народным уяўленні ён "Господь Бог". Але функцыі ("загораживать нашу скотину зялезными тынамя, замыкае золотыми ключами") "Господя Бога" перайшлі да Ярылы, а ў хрысціянскай традыцыі св.Юрыю. Сувязь Пярун — Ярыла мы сустракаем у абрадзе сустрэчы вясны. Паколькі пачаткам вясновых зямельных прац быў першы гром, дык гэты час і лічыўся прыходам вясны. А вясна нараджалася з вады або дажджу (літвы, адсюль і літо — вясна), які пасылаў Пярун. Да яго і звярталіся з просьбай:

Памажы нам, Боже,
У добрый час пачаці
Вясну выклікаці!

І вось Грамоўнік выязджае на златагрывым кані, які срэбнымі падковамі выбівае з воблачных скал іскры — маланкі. Пярун стварае райскі, светлы храм — веснавое неба з двума акенцамі:

В одно воконце исходит сонце
В другое воконце заходит сонце.

Вясна таксама ўвасаблялася ў вобразе вершніка на белым або залатым кані.

Едзиць весна, едзиць
На залатом кони.
. . . . . .
Вязець, вязець красна
Ясные дзянечки,
Частыя дожджочки.

Беларусы ўяўлялі вясной Ярылу (яр — вясна) і ў абрадзе ягоны вобраз выконвала "вясноўка", адзетая ў белае дзяўчына.

Ды і конь на гербе Пагоня ў сакральным значэнні звязаны з агнём — сімвалам Перуна. Срэбныя рэчы, прынамсі, меч, вупраж, шчыт суадносяцца з Грамоўнікам. На тое, што віцязь Пагоні сімвалізаваў і Перуна, указвае манета, выяву якой прыводзіў Тэадор Нарбут. На адным баку яе выбіты Пярун, які сядзіць на драпежнай птушцы (пэўна, арле) з маланкамі ў руцэ, а на другім баку — выява віцязя на кані. Гэта самая старажытная выява Пагоні сягае ў дахрысціянскія часы. Манеты з Перуновай пагоняй называліся Перуновыя залатыя (пра іх нагадвае ў сваім запавеце ў 1493 г. шляхціц Боладзіч). Выява вершніка з паднятай рукой ёсць на валуне ў Браслаўскім раёне, выбіта гэтая выява яшчэ ў дахрысціянскія часы.

Белы конь таксама сімвал сонца і салярных багоў. З канём звязаны рытуал прыёму ў род (сям'ю), пастрыжэнне хлопчыка і пасаджанне яго на каня. Конь — сімвал блізнечнага культу (на вільчаках выразаліся дзве конскія галавы).

Можна шмат пісаць пра сакральную сімволіку Пагоні, але звернем увагу на колеравыя спалучэнні чырвонага поля і белага віцязя. Белы колер, як сімвал жаночага пачатку, можа ўказваць, што белы віцязь сімвалізуе такое вызначэнне, як Маці, а чырвоны (мужчынскі пачатак) — Айчыну, адсюль бінарная апазіцыя Маці-Айчыны. Напрыклад, Павал Сапега, вялікі гетман Літоўскі пісаў: "Праз удзячнасць мілай Маці Айчыне не шкадаваў для яе фартун, здароўя і крыві маёй". Гэтае спалучэнне жаночага і мужчынскага пачаткаў мы назіраем у абрадзе сустрэчы Ярылы, калі пад яго імем выступае дзяўчына. Апазіцыя чырвона-белага колераў Пагоні дае нам бінарную апазіцыю муж-жанчына (муж-чына). Адным з галоўных абавязкаў мужчыны, паводле ўяўленняў беларусаў, была абарона Маці-Айчыны. "У праследаванні ворагаў, якое па-народнаму завецца пагоняю, павінны ўдзельнічаць не толькі рыцары, але і кожны мужчына, які можа насіць зброю, якога б ні быў паходжання і стану". Як бачым, паняцце Пагоня служыць медыальным словам, якое сімвалічна злучала народ з Маці-Айчынай, "нашай літоўскай зямлёю", як сказана ў грамаце Ягайлы ў 1387 годзе. Глыбокае сімвалічнае значэнне мае і срэбны меч у руках віцязя Пагоні. Меч — гэта сімвал прыналежнасці чалавека да роду, народа, сям'і (сваяцтва па мячы — сваяцтва па бацьку). Меч — гэта сімвал вернасці, праўдзівасці (на мячы кляліся); сімвал кары за клятвааступніцтва і здраду, духоўнага абнаўлення свету (Хрыстос казаў: "Не мір прыйшоў я прынесці, але меч"), Боскага слова ("меч вуснаў маіх"), гераізму і мужнасці (героі Кулікоўскай бітвы Андрэй Полацкі і Дзмітрый Бранскі "с острого меча вспоены в Литовской земле"), абароны ад чорных сіл, нечысці, д'яблавых служак, у беларускіх замовах срэбным мячом Хрыстос бароніць людзей ад чорнай сілы). Як вынікае, белы віцязь увасабляе сабой усе светлыя сілы, якія абараняюць жыццё. Ён павернуты на захад, туды, дзе заходзіць сонца і адкуль з'яўляецца ноч, і сімвалізуе барацьбу святла і цемры за жыццё. Белы колер віцязя ў гэтым выпадку азначае світанак, а чырвонае поле — новы дзень, зару або пагоніцыю (нагадаем, што ў ведыйскім гімне Індра запальвае ранішнюю зару).

Вельмі важнае значэнне мае сімвалічна-рытуальнае змяшчэнне мяча ў правай, а шчыта ў левай руцэ. Гэтым самым у гербе адлюстроўавецца бінарная апазіцыя права—лева. Пра сімвал мяча ў правай руцэ віцязя Пагоні мы казалі, але нагадаем такую істотную сувязь Зара— Пагоніцыя і другую яе назву Дзянніца. Сімвалічны намёк на тое, што барацьба віцязя з чорнымі сіламі за Пагоніцыю—Дзянніцу — правая справа, а права, як сімвал неба (адсюль і правіць, а таксама такое паняцце як улада ад Бога, г.зн. улада павінна быць правая — змагацца з цемрай, чорнай навалаччу за Дзянніцу — новы дзень, сонца, жыццё). У рытуальных абрадах у правай руцэ трымалі дубец асвячонай вярбы або вербалозы, а гэта віці, якімі абвяшчалася Пагоня. Таксама свечкі грамніцы, як сімвал "Жывога агню" і абаронны сродак ад нечысці. Зноў выхад на Перуна і ягоную Пагоню. Віці і свечка выступаюць працягам сімвалічнага шэрагу мяча. Віці звязваюць сімволіку Пагоні з правобразам сусветнага дрэва — вербалозай. А пра значэнне сімвала свечкі казаць залішне — гэта і святло, і ачышцэнне, і сувязь з Богам і небам, і астральная абарона, і ахвяраванне, і жывы агонь і г.д. У левай руцэ віцязь трымае шчыт (тарчу) — сімвал моцы, еднасці, абароны, вернасці, заступніцтва, гераізму ("са шчытом або без шчыта"), павагі да герояў (забітых на полі сечы неслі на шчытах), сімвал прыналежнасці да роду/народу (гербы на шчытах), трохкутны шчыт вяршынай уніз сімвалізуе дождж (літву). Якой пашанай карыстаўся у славянаў шчыт, сведчыць той факт, што люцічы, ідучы супраць ворагаў, неслі наперадзе шчыт Яра-віта. У народнай традыцыі левую пазіцыю шчыта займаюць жытнёвыя каласы (сімвал Жыценя—Віценя—Пагоні), луста хлеба і абраз. Сімвалы гэтых паняццяў суадносіліся з сімвалам шчыта.

Яшчэ адна паралель пераходу народнай сімволікі ў хрысціянскую — гэта адпаведнасць Ярылы вобразу св.Меркурыя Смаленскага — хрысціянскага заступніка беларусаў. Паводле ўяўленняў беларусаў, Ярыла меў яшчэ адзін атрыбут — чалавечую галаву ў правай руцэ. Такі ж атрыбут меў і Меркурый. Генетычная сувязь паміж двума вобразамі відавочная. Беларусы верылі, што ў ліхія часы Меркурый падымаецца з труны, бярэ зброю і абараняе іх ад бяды, таму віцязя Пагоні ўяўлялі і за вобраз св.Меркурыя. Але што істотна, дык і Вітаўт (чацвёрты сын Кестута, уладар Пагоні і Калюмнаў), паводле ўяўленняў беларусаў, у хвіліны нялёгкіх выпрабаванняў падымаецца з магілы, каб дапамагчы ім.

Такім чынам, герб Пагоня сімвалізаваў у беларусаў жыццё. Невыпадкова, што Пагоня мае такое сінанімічнае развіццё: Віці — Віцень — Быцень — Жыцень. Гэта добра разумелі ў мінулым, таму летапісцы і прыпісалі прыняцце Пагоні за дзяржаўны герб Вялікага княства Літоўскага вялікаму князю Віценю. Можна смела сцвярджаць, што па сваім сімвалічным значэнні, унікальным спалучэнні язычніцкай, хрысціянскай, міфа-паэтычнай, народнай і гістарычнай традыцыях, сваім старажытным паходжанні герб Пагоня не мае роўных сярод іншых гербоў. Як нацыянальны гістарычны сімвал беларусаў ён не мае альтэрнатывы. Гэта святыня беларускага народа!

Расшыфроўка сакральнага значэння Пагоні, як герба, гэтак і сістэмы светапогляду старажытных беларусаў можа раскрыць і табуістычны сэнс наймення крэвічы/крывічы. Крэвы праз малітву медыяльна злучыліся з богам, які перадаў ім уладу над людзьмі. Сімвалічна крэвы выступалі пераемнікамі Перуна на зямлі, а крэвічы/крывічы — іх паслядоўнікамі. Можна зрабіць выснову, што гэтае найменне мела больш глыбокі сэнс — Перуновы дзеці. "Крэва" ў найменні выконвала табуістычную ролю — падмяняла сапраўднае імя Перуна імем ягонага жраца. Нічога дзіўнага ў такім тлумачэнні імя крывічы няма. Першабытныя людзі ўяўлялі першага чалавека, як богападобнага продка. Напрыклад, індзейцы Місісіпі лічылі, што першы чалавек стаў богам грому. Ірландцы сваім першапродкам лічылі бога вады Нуада.Нашу гіпотэзу пацвярджае ўжо цытаванае паданне. Пасля таго, як пасля Перуновага ўдару ў "нібы камень, нібы што" (гэтае "нібы што" можна прыняць за дэмана Агі гарая), "высветлілася" жыццё, завёўся чалавек. Паданне маўчыць, хто нарадзіў яго, адкуль ён узяўся. Гэты "нехта" пад імем Бай (вядома, што венеты/енеты, да якіх залічваецца і народ акрывіі (а Літва, паводле нямецкіх хронік, "калісьці звалася Венедыяй") пакланяліся Ignis (агню) et Bajas; слова бая мае азначэнне чары, абаянне, рытуальная малітва, такім чынам атрымліваецца чароўны агонь або агонь і ягоны чараўнік Бай) завёў "свае чалавечыя парадкі", займеў ад жонак дзяцей. Перад смерцю ён падзяліў сваю маёмасць сярод сыноў, аднаму з іх Белаполю дасталіся два сабакі Стаўры і Гаўры. Бай наказаў сыну пусціць сабак у абодва бакі, і колькі зямлі яны абягуць удзень, дык уся гэтая зямля будзе належаць яму. Белаполь выпусціў дзве птушкі, за якімі і пабеглі сабакі, "дык да гэтага часу не вярнуліся, а па іх слядах дзве рэчкі працягнуліся, у адзін бок прайшла Дзвіна, а ў другі бок — Дняпро. На гэтых абшарах і жывуць нашчадкі Белаполя — беларусы. У другім варыянце падання гаспадар сабак Стаўры і Гаўры названы Бой, значыць "першапродак" называўся Бай/Бой. Гэтыя паданні нам нічога не растлумачылі б, каб не зафіксаванае этнографамі свята "Стаўраўскіх дзядоў", на якіх беларусы звярталіся да міфічных сабак: "Стаўры, Гаўры гам! Прыхадзіце к нам". Значыць, паданні перадаюць архаічны міф пра паходжанне крэвічоў/крывічоў. Канешне, гэты "нехта" першапродак крывічоў хаваецца за табуістычнае імя. Дзякуй В.Дуніну-Марцінкевічу, які захаваў у вершаваным перакладзе падання імя князя Грамабоя. Паданне звязана з "Староўскімі дзядамі" і генетычна працягвае паданні аб паходжанні беларусаў-крывічоў. І князь Грамабой, які ўладарыць над крывічамі, успрымаецца нашчадкам Боя. Гэтае паданне нібыта раскрывае сапраўднае імя Бая/Боя — Грамабой, г.зн. Пярун.

Пэўна, невыпадковае спалучэнне колеравых спалучэнняў, бо ў адным з варыянтаў Бой панаваў у горадзе Краснаполлі, а сына Бая звалі Белаполем. Чырвона-белая апазіцыя — сімвал стварэння Перуном жыцця: агонь і вада. Невыпадковым трэба прызнаць і з'яўленне ў паданні князя літоўскага Віта. Само імя выводзіць на сінанімічны шэраг Віца — Віцень — Пагоня. А Пагоня, як мы бачым, кодавы знак светаўяўлення паклоннікаў Перуна. Але паданне намякае, што Віт — гэта князь Вітаўт. Сакральнае значэнне гэтага імя можна растлумачыць так: жыццё народа (у індаеўрапейскай традыцыі tevta/tavta — народ; беларускае tutejszy (першапачаткова магло гучаць тоўт), святло народа, абаронца народа, што суадносіцца да ролі Перуна. Само сабой узнікае здагадка, што Вітаўт неяк

звязаны з Перуном. Вітаўт быў чацвёртым сынам Кестута, а Перуну прысвечаны чацвёрты дзень тыдня. Значыць, праз сімвалічнае значэнне лічбы чатыры паданне зноў выводзіць нас да Перуна. І тым самым падкрэслівае блізкасць уладара крывічоў да ўладара літвінаў. Абодва носяць табуістычныя імёны Перуна. Паданні дапаўняюць адно другое і ўказваюць нам міфічнага першапродка крывічоў Перуна. Таму і шанавалі гэтага бога нашы продкі, надаўшы яму эпітэт Ясны нароўні з сонцам і зорамі. І не трэба здзіўляцца, што толькі на Беларусі каля Віцебска ў 1684 г. быў знойдзены вялікі залаты стод Перуна. І менавіта беларусы захавалі галоўны міф пра індаеўрапейскага бога Грому. "Дадзеныя жывой да гэтага часу беларускай традыцыі" дазволілі сучасным даследчыкам В. Іванову і У. Топараву рэканструіраваць міф пра бога Грому. Зразумела, што гэтая жывая традыцыя сведчанне глыбокай пашаны беларусаў да Перуна, пачатак якой сягае ў часы індаеўрапейскай супольнасці.

Пэўна, у глыбокай старажытнасці крэвічы/крывічы былі своеасаблівай жрэчаскай кастай, а іх спадчына — гімны, малітвы, магічныя рытуалы, міфы — гэта багацейшы беларускі фальклор, які не мае сабе роўных па багацці сярод еўрапейскіх народаў. З гэтай нагоды заўважым, што тоесныя да *віч* словы *вет, віт, від* азначалі чарадзейства, празарлівасць, вешчы. Дык можна расшыфраваць найменне крэвіч/крывіч як крэвы вешчыя. Невыпадкова, што крыўскі князь Усяслаў, паводле "Слова аб палку Ігаравым", меў вешчую душу, а беларусы ўяўляліся іх суседзямі як чараўнікі.

А цяпер можна расшыфраваць і сакральны сэнс наймення літвіны. На бытавым узроўні літвіны, або вітвіна, або гоны азначала парасткі, якія з'яўляліся пасля дажджу — літвы. Паколькі літва была напоем жыцця, дараванага людзям Перуном (азначэннем, якое звязвала дождж (літву) з Перуном, было слова пярыць), дык найменне літвіны ў больш глыбокім сакральным сэнсе разумелася, як Перуновыя дзеці. Як вынікае, літвіны і крывічы — сінонімы аднаго і таго ж сакральнага азначэння. Таму зразумела, чаму нашчадкаў крывічоў, якія жылі ў Мяшчэрскім краі, называлі Літвой. Другі прыклад, віленскі Крывыград або Крывіч-град адносіўся да літоўскай палавіцы. Віленскую Крэўскую браму ў хрысціянскія часы пачалі называць Вострай, а сінонімам гэтага эпітэта быў у славян эпітэт літы. Зноў жа ў летапісах крывічы выступаюць як літва.

Варта разгледзець сакральны сэнс наймення дрыгавічы — славянская племені, якое жыло на землях старажытнай Беларусі. Патранамічны суфікс *віч* указвае нам, што гэтае найменне не магло ўтварыцца ад слова дрыгва (балота). Магчыма, імя Драг, Драгавіт (пашыранае сярод люцічаў) і было патранамічным для дрыгавічоў. Але ранейшыя крыніцы пад 614 год называюць дрыгавічоў другавітамі.Гэтак называе іх у X ст. і Канстанцін Чырвонародны. Значыць, назва другавічы паходзіць ад імя Друг/Другі. Семантыка наймення Крэва звязана з паняццем гнуць, якое пераходзіць у паняцце гарэць. "Цікава, што значэнне "гарэць" можа даваць значэнне "радзіць, народ", а гэта апошняе пераходзіць у значэнне "другі" (Маковский М. М. "Удивительный мир слов и значений". Москва, 1989, с.143). Напрыклад, старажытнаангельскае *drigian* — "сохнуць (каля агню)", *dryge* "сухі", але славянскае другі; індаеўрапейскае *ater* — "агонь", але нямецкае *ander* — "другі". Такім чынам, другавічы — гэта другія-вічы, драгія-вічы, браты тых, хто меў у сваёй назве азначэнне віч/віт. Другавічы былі паклоннікамі Перуна. "Жыцце св. Дзмітрыя Салунскага" распавядае, што яны звярталіся да гэтага бога.

Нельга абмінуць і "першапродкаў" беларусаў -- волатаў. Шматлікія курганы — капцы беларусы называлі валатоўкамі і лічылі, што там пахаваны волаты, ранейшыя жыхары Беларусі. На валатоўках спраўлялі Радаўніцу (дзень продкаў). Волаты ўяўляліся асілкамі. "Гэта цяпер людзі здрабнелі да сталі нядужыя, а даўней былі такія велізарныя, бы дуб", —кажа беларускае паданне. Сувязь волатаў з Перуном пацвярджаецца шэрагам фактаў. Гэтак, дуб на менскім капішчы называўся Волат. У беларускіх казках асілкі-волаты надзелены змяеборчаскімі функцыямі, г. зн. працягваюць традыцыю Перуна. Заканамерна выснова В.Іванова і У.Топарава. Што роля волатаў вельмі "падобна з функцыяй Перуна ў галоўным міфе". "У многіх паданнях аб асілках захоўваецца матыў разбівання каменя і каменнай зброі, характэрны і для Перуна... У палескай казцы палёт у небе булавы асілка апісваецца праз сувязь з громам". "Каваль-багатыр" з палескай казкі адчувае генетычную сувязь з громам ці дажджом: "Ляжыць і любуецца, як Перун чарцей палюе... Добра яму спаць, як спяваюць буры і грымоты". Герой беларускага эпасу Ілля (імя хрысціянскага святога, які "апекаваўся" дажджом і грымотамі) пасля смерці збіраецца "грамавой тучай заведуваць". Польскі храніст Станіслаў Сарніцкі (XVI ст.) адзначыў папулярнасць на Беларусі паданняў аб "героях, якіх называюць волатамі або полубагамі". (Цікава і значэнне слова волаці — клікаць на дапамогу, патрабаваць, прасіць).

(Працяг будзе.)

Наш каляндар

"ТАЯМНІЦА" ЗАБЭЙДЫ-СУМІЦКАГА

Споўнілася 95 гадоў з дня нараджэння беларускага спевака Міхася Забэйды-Суміцкага. Пяць гадоў таму "ЛіМ" досыць грунтоўна, у некалькіх нумарах, адзначыў яго 90-гадовы юбілей. А галоўнае — расказаў пра жыццё і асобу нашага выдатнага земляка, чые сталыя гады прайшлі на чужыне. Прынамсі, у нумары тыднёвіка за 15.06.90 г. была распачата публікацыя аўтабіяграфічных нататак М. Забэйды-Суміцкага, друкаваўся яшчэ й артыкул С. Берасцень "Шчаслівы і трагічны лёс", у якім змяшчаліся невядомыя нават для асабістых знаёмцаў спевака архіўныя матэрыялы. Тыя матэрыялы С. Берасцень знайшла ў фондах Цэнтральнага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва Беларусі. Вось — цытата з артыкула: "Раптам я натрапіла на старонкі, якія адрасуюць толькі асабліва блізкім сябрам — падобныя да дзённікавых зваротаў пісьмы да любімай жанчыны. На жаль, мне пакуль не давялося высветліць, хто яна, ці жыве цяпер. Паводле запісаў зразумела, што значна маладзейшая ад Забэйды; хварэла на лёгкія; мела музычную адукацыю; жыла ў Расіі..."

Далей змяшчаюцца перакладзеныя з рускай пісьмы Забэйды, якія ён пісаў сваёй таямнічай сяброўцы Лялі ў 1954—60 гадах. Артыкул "Шчаслівы і трагічны лёс" завяршаўся своеасаблівым зваротам да людзей дасведчаных: "Я спадзяюся з часам знайсці адказ на пытанне, хто ж яна, невядомая Ляля, да якой М.Забэйда звяртаўся пяшчотна ў сваіх простых і цудоўных пісьмах. Мо нават у хуткім часе гэта высветліцца? Бо святкаванне нашай грамадскасцю юбілею спевака — аб'ектыўная нагода для абмену інфармацыяй, збору дакументальных матэрыялаў і жывых сведчанняў".

Мінула пяць гадоў — і "таямніца" набыла канкрэтнае імя дзякуючы карпатлівай працы над архівам спевака, праведзенай вядучым навуковым супрацоўнікам Дзяржаўнага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва Г. Жукавай. Матэрыял са здымкамі, прапанаваны ёю для публікацыі, на жаль, давялося крыху скараціць — за кошт выняткаў з тых лістоў М. Забэйды, што ўпершыню друкаваліся ў "ЛіМе" пяць гадоў таму.

У БІЯГРАФІІ кожнага чалавека ёсць старонкі, якія складаюць адметнасць яго жыцця. У М. Забэйды-Суміцкага — гэта адданасць песні, якую ён пранёс праз усё сваё доўгае і складанае жыццё. Многа напісана пра гэтага чалавека, многае яшчэ трэба даследаваць, каб да канца зразумець усю трагічнасць яго лёсу. Я хачу расказаць толькі пра адну старонку.

Разбіраючы архіў спевака, я зацікавілася лістамі Алены Валянцінаўны Багуцкай, якіх у фондзе аказалася даволі многа. Хто гэта? І якое месца ў жыцці М.Забэйды займала гэтая жанчына?

Пазнаёміліся яны ў жніўні-верасні 1945 г. у Празе ў доме Барыса Лявіцкага, украінца, хіміка-парфюмера. У яго доме спынілася сям'я Багуцкіх, вяртаючыся з Германіі, куды была вывезена немцамі на пачатку вайны з Вінніцы. Алена, якой на той час споўнілася 25 гадоў, хварэла на сухоты. У Празе выгнаннікі спыніліся, каб крыху паправіць яе здароўе. Тут, у доме Лявіцкіх, і адбылося знаёмства Міхася Забэйды з Аленай Багуцкай. Іх сяброўства пазней перарасло ў каханне. Але гэта было трагічнае каханне, якое скончылася адзінотай двух цудоўных людзей. Праз тры гады, у 1948 г., Алена з маці вяртаюцца на радзіму ў Вінніцу. Пачынаецца перапіска, якая доўжылася да канца жыцця М. Забэйды.

У архіве спевака захавалася некалькі лістоў-чарнавікоў да А.Багуцкай. Гэта найкаштоўнейшы матэрыял для даследчыкаў жыцця і творчасці М.Забэйды. Адказваючы на пытанні сяброўкі, ён піша пра свае сціплыя ўмовы жыцця, пра сваю творчасць, паўсядзённыя клопаты. Прывяду некалькі вытрымак у перакладзе з рускай.

"...Даруй мне, дарагая Ляля, што я так даўно не пісаў табе. У мяне было багата клопатаў у сувязі з наладжваннем канцэрта. Ён ужо адбыўся 5 лістапада і прайшоў з вялікім поспехам. Але яшчэ за некалькі дзён перад канцэртам я не быў упэўнены, што змагу спяваць, бо маё і без таго нездавальняючае здароўе яшчэ пагоршылася праз звычайны грып. Але вялікі вопыт і вялікая папярэдняя падрыхтоўка дапамаглі пераадолець усе цяжкасці. Спяваў на васьмі мовах і на кожнай мове мусіў, як патрабавала публіка, што-небудзь паўтарыць. Многія сказалі, што я яшчэ ніколі так хораша не спяваў. А я думаю, што ўражанне ад ранейшых выступленняў ужо сцёрлася, таму гэтак і гаворыць. Але і ў газетах крытыка была вельмі добрая, між іншым напісалі, што мая праграма была ўзорам вакальнага вечара, якіх у Празе бракуе. Што тычыцца мяне, дык я радаваўся таму, што даваў радасць іншым...

Я ўвесь адыходжу ў сваю працу: выкладанне спеваў і, калі магчыма, выступленні ў канцэртах. І з радасцю магу адзначыць, што знаходзяцца людзі, якія ўсё больш разумеюць і цэняць маю працу, а я ёй прысвяціў усё жыццё. Дагэтуль, як артыст, я быў выкарыстаны ледзьве на 10 працэнтаў сваіх магчымасцяў, а перад вайной попыт на мае выступленні перавышаў мае фізічныя магчымасці". 16.XII.1954 (ф. 293, в. 1, с. 132, л. 1-3).

Так і пражыў у адзіноце гэты таленавіты і сціплы прафесійны спявак усё жыццё на чужыне, у маленькім пакойчыку, у якім заўсёды былі чысціня і парадак, і атрымліваў за свой талент мізэрную пенсію. Здароўе было кепскае. У маладосці хварэў на сухоты, а вайна дадала хваробу сэрца. У 1944 годзе за сувязь з патрыётамі хворага артыста проста з бальнічнага ложка забралі гестапаўцы. Ад смерці ўратаваў шчаслівы выпадак. Але след ад нервовага напружання застаўся на ўсё жыццё. А яшчэ застаўся страх, страх перад вайной, якая калечыла лёс, забівала таленты, разлучала з дарагімі людзьмі...

І не толькі вайна, а і няспынная сталінская машына, якая, як жорнамі, перамолвала чалавечыя лёсы і жыцці, перашкодзілі вярнуцца спеваку на радзіму. Засталася адзіная нітачка сувязі з блізкімі і знаёмымі — лісты. Іх шмат ад розных асоб. І ён знаходзіў час, каб усім даць адказ.

З Аленай Валянцінаўнай перапіска доўжылася да апошняга года жыцця М. Забэйды-Суміцкага. Жывучы ўжо ў Вінніцы, сям'я Багуцкіх з цікавасцю сачыла за творчасцю Забэйды, ён заўсёды прысылаў ім свае пласцінкі (плітакі) з новымі песнямі, яны не прапускалі ніводнага канцэрта, якія гучалі па радыё з яго ўдзелам. Алена Валянцінаўна заўсёды раілася з Міхасём, як з самым блізкім чалавекам. А як хацелася ім сустрэцца, пабачыцца, пагутарыць! Але межы, жорсткія ўмовы ўезду і выезду, цяжкасці з афармленнем дакументаў і многае іншае не дазволілі сустрэцца. Так і жылі гэтыя двое цудоўных людзей кожны са сваёй адзінотай.



М.Забэйда-Суміцкі. 1958 г.

А.Багуцкая. 1955 г.

Ганна ЖУКАВА,
вядучы навуковы супрацоўнік БДАМЛіМ

Аб'ява

БЕЛАРУСКАЯ АКАДЭМІЯ МУЗЫКІ
АБ'ЯЎЛЯЕ ПРЫЁМ
НА 1995 ГОД

У АСПІРАНТУРУ
з адрывам і без адрыву ад вытворчасці па спецыяльнасці:
МУЗЫЧНАЕ МАСТАЦТВА
МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ МУЗЫКІ
ЭСТЭТЫКА

У аспірантуру прымаюцца грамадзяне Рэспублікі Беларусь, не старэйшыя за 35 гадоў, якія маюць закончаную вышэйшую адукацыю, педагагічныя, творчыя і навукова-даследчыя здольнасці.

Паступаючыя здаюць конкурсныя ўступныя экзамены па спецыяльнасці, філасофіі і адной з замежных моў у аб'ёме дзеючай праграмы для ВНУ.

Заява аб прыёме падаецца на імя рэктара з указаннем выбранай спецыяльнасці. Да яе трэба дадаць:
- асабісты лісток па ўліку кадраў з фатаграфіяй 4 х 6;
- аўтабіяграфію;
- натарыяльна завераную копію дыплома аб заканчэнні ВНУ (з выпіскай з заліковай ведамасці);
- выпіску з працоўнай кніжкі;
- медыцынскую даведку аб стане здароўя;
- рэферат па выбранай спецыяльнасці;
- спіс апублікаваных навуковых прац.

Усе паступаючыя праходзяць абавязковае субяседаванне з будучым навуковым кіраўніком.

Дакументы прымаюцца з 1 па 15 верасня, пачатак уступных экзаменаў з 20 верасня. Даведкі па адрасе: *г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 30, к.122, тэл. 26-11-76.*

Саюз беларускіх пісьменнікаў выказвае глыбокае спачуванне пісьменніку Эдуарду ВАЛАСЕВІЧУ з прычыны напаткаўшага яго гора — смерці сястры Яніны Станіславаўны.

Саюз беларускіх пісьменнікаў выказвае глыбокае спачуванне пісьменніку Пятру Прыходзьку з прычыны напаткаўшага яго гора — смерці дачкі Людмілы Пятроўны.

Саюз беларускіх пісьменнікаў выказвае глыбокае спачуванне пісьменніку Анатолю САБАЛЕЎСКАМУ з прычыны напаткаўшага яго гора — смерці жонкі Венеры Архіпаўны,

Пакінем часова падарожніцкія падрабязнасці, — як, маўляў, цяжка бывае адарвацца ад тутэйшых мітрэнгаў і апынуцца... Дзе б?

Я апынулася ў майскім горадзе Каіры (пра які ўласны сын тры дні таму тлумачыў: "Мама, гэта ў Афрыцы!"), між нечуваным блакітам і няспыннымі аўтамабільнымі плынямі, я дыхаю спраўным загазаваным паветрам і ад яснасці прачынаюцца жаданні душы маёй — прагнецца пірамідаў, егіпецкага музея, Ніла, званка дахаты, невядома чаго перадусім... "Жана, — мовілі мне з мяккім арабскім маўленнем, але цвёрда, — усё будзе. Толькі — арганізавана. Жадай па справе". Праз колькі дзён (калі каірскі журналісцкі сімпозіум — менавіта на яго нас запрасілі — канчаткова дастаў з усіх дух) трое калег, што зажадалі сабе справы, уваходзілі ў... знаёмую рэдакцыйную сумятню. Журналісты Беларусі, Украіны і Расіі ядналіся ў калегіяльным жаданні, ідучы праз заваленыя паперамі й камп'ютэрамі сталы на сустрэчу з галоўным завадатарам і сведкам ці не ўсіх арабскіх літаратурных здзяйсненняў ды спадзяванняў, — галоўным рэдактарам "лімаўскага" паплечніка ў вялікай літаратуры вялікага свету — газеты "Абхар аль Эдэб" ("Літаратурныя навіны") спадаром ГАМАЛЕМ АЛЬ ГІТАНІ.

Каб не задаваць дзяжурных пытанняў пра наклады, распаўсюджванне ды попыт, узбройваюся ведамі і адразу дзялюся імі з вамі: літаратурную газету выдае магутны канцэрн, які падзяляе назоў са сваёй самай вялікай і ўплывовай газетай "Абхар Эліём" (наклад 1 млн. 200 тыс.), вылучаецца асаблівай журналісцкай школаю (сучаснасцю стылю і мыслення) і не грэбуе прыгожымі мастацтвамі (мае шэраг выданняў па тэатры і кіно). На "Ахбар аль Эдэб" не павышаюць цану (нават тады, калі павышаюць на ўсё), спрыяюць таму, каб яе прэстыж мацавалі некалькі конкурсаў (паэзіі і апавядання), зміраюцца з тым, што прыбыткаў газета не дае, а сёе-тое часам і вымагае са сваіх выдаўцоў. "Ахбар аль Эдэб" мае заўважны ўплыў на інтэлігенцыю арабскага свету: усе нашы перакладчыкі, прынамсі, а сярод іх быў прафесар матэматыкі і доктар-анколаг, яе чытаюць пастаянна. Пры гэтым падкрэсліваюць, што газета — не самая распаўсюджаная, але ў Еўропе яе добра ведаюць, асабліва ва універсітэцкіх і навуковых цэнтрах.

Спадар Гамаль Аль Гітані — вядомы пісьменнік, аднак толькі два ягоныя раманы з'явіліся ў перакладах на мовы народаў — насельнікаў былога Саюза. Можна было б параўнаць ягоную вядомасць і папулярнасць са знаным Нагібам Макфузам, між тым тое, пра што пісаў Макфуз, шчыльна звязана з пэўным, абмежаваным колам і асяродкам. Аль Гітані дае панараму егіпецкага жыцця, схіляецца да фантазій, антыутопій... Адзін з ягоных улюбёных пісьменнікаў — Дастаеўскі, і вельмі дзіўным спадар рэдактар палічыў тое, што падчас былога СССР Дастаеўскі не карыстаўся ні вядомасцю, ні прызнаннем, ні належным вывучэннем...

"НАРОДНЫ ХАРАКТАР ЗАСТАЎСЯ НЯСКРАТНЫМ..."

— Дарэчы, яго паступова адкрывае і арабскі свет, — працягваў спадар рэдактар. — І я асабіста змагаюся з меркаваннем пра тое, што з літаратурамі народаў свету варта знаёміцца толькі праз Лондан або Парыж. Я намагаюся разбурыць уяўленні пра іх, як пра адзіна вартыя цэнтры перакладчыцкага майстэрства, бо персы; туркі, кітайцы, японцы бліжэй да Егіпта, урэшце... Мы ніколі не перакладаем з мовы-пасрэдніка. Толькі з арыгінала. Самыя вядомыя арабскія пісьменнікі супрацоўнічаюць з намі. Раней лічылі найперспектыўнай газету "Аль Ахрам", я і сам марыў пісаць туды. Цяпер — адмаўляюся ад яе літаратурных старонак. Мяне не задавальняе іхні ўзровень.

— Мы даведаліся, што ваш рэдактарскі партфель паўнюткі, але пачулі думку, што ў Егіпце малавата літаратурных выданняў...

— Егіпет — дзівосная і дзіўная краіна. Штодня яна нараджае таленты, літаратурныя — таксама, але штодня робіць усё, каб гэтыя таленты зводзіліся. Мардуе іх або марнуе. Эканоміка і цяжар жыцця няшмат каму дадуць падняцца. Культура не мае вялікай ролі ў палітыцы ўрада. Я — пісьменнік, мне ёсць чым заняцца за рабочым сталом, а гэта, дайце веры, не лягчэй, як кіраваць газетаю. Між тым газету сваю мы арыентуем у будучыню, даючы магчымасць дэбютаў, задаючы добры літаратурны тон. Гэта не менш важна за мае кнігі. Часам я асабіста прашу грошы ў багатых людзей, каб падтрымаць ды заахвоціць талент пачаткоўца. З усмешкаю згадваю, як чалавек, надта далёкі ад культуры, — ён нічога не чытае і не хавае гэтага, — выдатка-ваў нам на прэміі і сказаў пры гэтым, што яму вельмі шкада маладзёнаў, якія галадаюць. Але параўнайце: дзяржаўная прэмія Нагібу Макфузу склала 5 тысячаў фунтаў, мы даём па 60 тысяч. Здаецца, дзяржаўнае чынавенства робіць высновы...

— У Егіпце, на сустрэчах самага рознага ўзроўню, падкрэсліваюць: мы, маўляў, краіна 60 працэнтаў непісьменных людзей. Літаратура? Нам важней за ўсё — тэлебачанне...

— Я мяркую, перш-наперш, што гэтых непісьменных адсоткаў — за 80. Бо часам той, хто трымае ў кішэні дыплом універсітэта, наўрад ці можа лічыць сябе адукаваным чалавекам. Усім, думаю, знаёмы гэткі парадокс. Але няможна браць пад увагу толькі сродкі масавай інфармацыі. Бывае, па непісьменнай вёсцы ходзіць чалавек, — з тых, хто не ўмее распісацца, — ды культураю сваёю ён вышэй за універсітэцкага прафесара. Такім чалавекам быў і мой бацька...

— Вы маеце на ўвазе тое, што мацней за любую адукацыю — маральнасць?

— Вобраз егіпецкай культуры ў пэўным сэнсе — абарона ад маральнага заняпаду. Тое, што існуе моцная рэлігія (хоць я вельмі крытычна стаўлюся часам да таго, што яе суправаджае), прымушае мяне вучыць свайго сына, напрыклад, што падман — гэта грэх. Праўда, ён ідзе ў грамадства, дзе ўсе хлусяць, але я ў адказе за ягонае сумленне.

— Вы вядомы сваімі сацыялістычнымі схільнасцямі. Як яны стасуюцца з вашым сённяшнім жыццём? У адным з вашых раманаў дзейнічае адметны шэйх, які на свой капыл увасобіў сацыяльную справядлівасць: патаемнымі высілкамі ён пазбавіў жыхароў свайго квартала мужчынскай моцы, і гэта паўздзейнічала на парадак жыцця куды больш моцна, чым размеркаванні, пакаранні і г.д.

— Я хацеў выклікаць шок у чытачоў. Хто можа рэгуляваць, кантраляваць, унармоўваць, хто мае права на гэта? Чалавечае жыццё не можа кіравацца чыёйсьці адною воляю, нават калі воля гэтая — чалавека святога. У Егіпце, заўважце, ніколі не было сацыялізму. Як і ў СССР. Але чаму трэба абвяшчаць няслушнаю самую сацыялістычную ідэю? Я яшчэ веру ў сацыяльную справядлівасць. Мне крыўдна, што так званая перабудова і разбурэнне, раскіданне Саюза прынеслі невымерную шкоду. Тое, што рабіў Гарбачоў, колісь спрабаваў у Егіпце Садат. Але ён не здужаў. чалавечай маральнасці. У вас справа зайшла далёка, — і гэта жахліва.

— І тым не менш праблемы ў нас — адны на ўсіх, нягледзячы на тое, што Егіпет, здаецца, краіна памяркоўная?

— Усе сусветныя праблемы ўласцівыя нам. Але ў нашым грамадстве, напрыклад, не можа ўкараніцца ды расквітнець гвалт, — надта глыбокія цывілізацыйныя карані. Мы, здаецца, заўжды шукалі свайго — шляху ў свеце, падпарадкуючыся характару, ментальнасці. Напрыклад, праца з зямлёй вымагае ад егіпецкага селяніна чагосьці не агульнапрынятага, адметнага падыходу, і гэта вызначае агульнаграмадскае мысленне. Мы — краіна ўсіх рэлігій, нават Майсей жыў у доме фараона. Вы, вядома, зараз жа перапытаеце ў мяне пра тэрарызм і фундаменталізм . Я мяркую, што гэтыя ідэі ўвезены сюды з краін, развітых куды горш за нас. Ідэі былі прыняты грамадзянамі менавіта ў момант найноўшых і найгоршых цяжкасцей. Феномен фундаменталізма трэба разумець на фоне нашых сучасных праблем. Калі вызначаць прычыны, дык я называю іх мужна, не саромеючыся: сацыяльная несправядлівасць, карупцыя, беспрацоўе. Мяркую, што ў Егіпце такая карупцыя, якой нідзе ў свеце не існуе, — нават у краінах, якія ўпершыню вызначылі, што ж гэта за з'явішча такое. А што да несправядлівасці, дык хіба можна, напрыклад, вучыць чалавека ва універсітэце, дбаць пра ягоную адукацыю, а потым — выкідаць



на вуліцу? Пры гэтым уласцівасць грамадства такая, што ён не можа жаніцца (маёмасці няма), не можа мець ні легальных ні схаваных сексуальных дачыненняў (закон і менталітэт не дазваляюць). Азлабленне побытам даводзіць да роспачы: чым не грунт для гвалтоўных ідэй? Чаго хацець ад чалавека, занядбанага дзяржаваю? А рэлігія кажа пра ахвярнасць, пра няверных, — толькі вось тлумачыць Каран бярэцца купка людзей, прысвойваючы сабе асаблівае права на слушнасць усіх тлумачэнняў. Зрэшты, вінаваты заўжды знойдзецца. І пра каланізатараў згадаюць, і турыстаў у амаральнасці абвінавацяць...

— Дарэчы, здаецца, што стаўленне сярод інтэлігенцыі да каланізацыі Егіпта цяпер моцна змянілася?

— Мы добра памятаем, што другая чыгуначная лінія ў свеце з'явілася ў Егіпце. Дзякуючы англічанам. Мы памятаем, як рабавалі краіну стагоддзямі, але нават рабаўнікі мусілі ўрэшце размаўляць нашай моваю (цяпер у фільмах яны толькі па-арабску і гавораць). Ёсць адзіная егіпецкая культура, няможна расцягваць яе па кавалках (маўляў, гэта — ад фараонаў, гэта — ад мамлюкаў, а гэта — каланізатары стараліся). Я гэта даводжу не толькі ў раманах, але мушу пісаць і артыкулы, і доследы. Егіпецкі народ на працягу пяці тысяч гадоў жыве ў адным пэўным месцы — ля Ніла. Ён не міграваў, не перасяляўся; любая набрыдзь, як ні старалася, мусіла прыняць егіпецкую культуру і лад існавання. Пад уціскам людзей і стагоддзяў Егіпет памяняў сваю мову і нават веру, але народны характар застаўся няскратным...

Я магла б скончыць на тым, што на рэдактарскім стале зазваніў тэлефон, ды ён, гвалтаўнік, званіў увесь час. Аль Гітані між тым запрасіў нас на абед, — нас, трох цікаўных суседзяў па былым Саюзе, але шчыльная сімпозіумная праграма прапаноўвала нам абеды з іншымі людзьмі. Ды бачаць, бачаць Ісус з Алахам разам, як шкадую я той няспраўджаны абед, — працяг той гутаркі і знаёмства, якое нібы асуджана на непрацягласць...

Жана ЛАШКЕВІЧ

P. S. *Падрабязны матэрыял пра наведанне "лімаўскім" карэспандэнтам Егіпта чытайце ў бліжэйшых нумарах.*

Фота аўтара

ЛіМ ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Саюз беларускіх пісьменнікаў і Міністэрства культуры і друку Рэспублікі Беларусь

ВЫХОДЗІЦЬ З 1932 ГОДА

Газету рэдагавалі

Х.Дунец	(1932–35)
І.Гурскі	(1935–41)
А.Куляшоў	(1945–46)
М.Горцаў	(1947–49)
П.Кавалёў	(1949–50)
В.Вітка	(1951–57)
М.Ткачоў	(1957–59)
Я.Шарахоўскі	(1959–61)
Н.Пашкевіч	(1961–69)
Л.Прокша	(1969–72)
Х.Жычка	(1972–76)
А.Асіпенка	(1976–80)
А.Жук	(1980–86)
А.Вярцінскі	(1986–90)

Галоўны рэдактар Мікола ГІЛЬ

РЭДАКЦЫЙНАЯ РАДА:
Святлана БЕРАСЦЕНЬ
Міхась ЗАМСКІ
Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ
Жана ЛАШКЕВІЧ
Алесь МАРЦІНОВІЧ
Барыс ПЯТРОВІЧ, *першы намеснік галоўнага рэдактара*
Юрась СВІРКА
Віктар ШНІП, *намеснік галоўнага рэдактара*

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220600, ГСП, Мінск, вул. Захарава, 19

ТЭЛЕФОНЫ:
прыёмная рэдакцыі -- *332-461*
намеснікі галоўнага рэдактара -- *332-525, 331-985*
аддзелы:
публіцыстыкі -- *332-525*
пісьмаў і грамадскай думкі -- *331-985*
літаратурнага жыцця -- *332-462*
крытыкі і бібліяграфіі -- *332-204*
паэзіі і прозы -- *332-204*
музыкі -- *332-153*
тэатра, кіно і тэлебачання -- *332-153*
выяўленчага мастацтва і аховы помнікаў -- *332-462*
навін -- *332-462*
мастацкага афармлення -- *332-204*
фотакарэспандэнт -- *332-462*
бухгалтэрыя -- *268-640*

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ".
Рукапісаў рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе.
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з думкамі і меркаваннямі аўтараў публікацый.

Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра «ЛіМа»
Апаратныя сродкі і тэхнічная падтрымка — фірма «Дайнова»

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах
Друкарня "Беларускі Дом друку". (г.Мінск, пр. Ф.Скарыны, 77)
Індэкс 63856. Наклад 6858.
Нумар падпісаны 29. 6.1995 г.
ЗАКАЗ 2404
Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12